Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

19 СТУДЗЕНЯ 2007 г. ПЯТНІЦА
№ 12 (25877)
Кошт 400 рублёў
ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 Г.

Наша газета ўключана ў «Залаты фонд прэсы» СНД

Афіцыйна

Прэзідэнт зацвердзіў рашэнне на ахову Дзяржаўнай граніцы Беларусі ў 2007 годзе

Кіраўнік дзяржавы Аляксандр Лукашэнка 18 студзеня зацвердзіў рашэнне на ахову Дзяржаўнай граніцы Рэспублікі Беларусь у 2007 годзе.

Цяпер Беларусь ахоўвае 2 тыс. 331,6 км граніцы Саюзнай дзяржавы. Не ахоўваецца толькі ўчастак беларуска-расійскай граніцы (каля 1 тыс. 283 км). Дзейнічае 57 пунктаў пропуску, у тым ліку 42 — міжнародныя. У 2006 годзе гэту граніцу перасеклі 24,2 млн чалавек і больш як 8,2 млн транспартных сродкаў. І з кожным годам патокі ўзрастаюць.

Як заявіў Прэзідэнт, Беларусь і ў далейшым не плануе арганізоўваць ахову ўчастка граніцы з Расійскай Федэрацыяй. «Нягледзячы на тую пазіцыю, якую заняло сёння расійскае кіраўніцтва, мы ніякіх мерапрыемстваў па пагранічных войсках на беларуска-расійскай граніцы не ўводзім. Мы ахоўваць яе не будзем», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

Разам з тым, сёння на беларуска-расійскай граніцы з боку Расіі дзейнічае 16 пунктаў мытнага афармлення. Паводле слоў старшыні Дзяржаўнага камітэта пагранвойскаў Аляксандра Паўлоўскага, «фактычна гэта 16 мытняў, якія працуюць у асноўным у рэжыме кантролю тавараў з трэціх краін». «Калі шчыра, Расіі застаўся адзін крок да стварэння мытнай граніцы», — паведаміў ён. Як праінфармаваў Аляксандр Паўлоўскі, Расійская Федэрацыя паблізу граніцы з Беларуссю размясціла каля 150 аператыўных работнікаў, якія дзейнічаюць у інтарэсах расійскіх пагранвойскаў.

Такім чынам, расійскі бок ужо зрабіў першы крок у напрамку аднаўлення граніцы з Беларуссю. У той жа час Расія пакуль яшчэ не ўвяла пагранічную зону на граніцы з Беларуссю, як зрабіла гэта на граніцы з Украінай, Латвіяй і Эстоніяй.

Беларускія пагранічнікі за мінулыя гады правялі значную работу ў інтарэсах Расіі. Паводле даных старшыні Дзяржкампагранвойскаў, за апошнія тры гады граніцу нашай краіны перасеклі больш як 27 тыс. грамадзян чэчэнскай нацыянальнасці. З іх ліку затрыманы двое — гэта тэрарысты, якія знаходзіліся ў расійскім вышуку. Іх перадалі Расійскай Федэрацыі.

Пры гэтым Беларусь фінансуе дзве трэці затрат на ахову граніцы Саюзнай дзяржавы. Фінансаванне аховы граніцы ідзе ў рамках адпаведнай саюзнай праграмы. Уклад Беларусі складае прыкладна дзве трэці ад усёй праграмы. Акрамя таго, наша краіна выдзяляе сродкі з уласнага бюджэту.

Беларусь прадоўжыць рэалізацыю пагранічнай палітыкі ў рамках Саюзнай дзяржавы з прыцягненнем міжнародных фінансавых праграм для мэтанакіраванага забеспячэння ўпарадкавання дзяржаўнай граніцы.

Цяпер падрыхтавана новая пяцігадовая праграма Саюзнай дзяржавы, у рамках якой будуць вырашаны пытанні завяршэння стварэння падраздзяленняў граніцы на прыбалтыйскім участку, пытанні абнаўлення польскага ўчастка граніцы — некаторым заставам ужо больш як 50 гадоў.

Беларусь стварыла надзейную ахову знешняй граніцы Саюзнай дзяржавы з Еўрасаюзам, а гэта каля 1 тыс. 250 км. Тут, у адрозненне ад Расійскай Федэрацыі, беларускі бок мае поўнасцю дэмаркіраваную граніцу, на асноўных напрамках створана інфраструктура і шырокая сетка пунктаў пропуску.

Беларусь самастойна на працягу апошніх трох гадоў фактычна аднавіла граніцу з Польшчай (былую савецкую граніцу) працягласцю каля 400 км.

Акрамя таго, у рамках барацьбы з нелегальнай міграцыяй Беларусь да гэтага часу за свае сродкі ўтрымлівае ўсе інжынерна-тэхнічныя збудаванні, якія знаходзяцца на нашай граніцы яшчэ з савецкіх часоў.

На прыбалтыйскім участку граніцы створана сістэма аховы граніцы на найбольш адказных участках.

Як далажыў старшыня Дзяржаўнага камітэта пагранвойскаў, у краіне плануецца завяршыць стварэнне і ўкараненне аўтаматызаванай сістэмы аховы дзяржаўнай граніцы, пагранічнага кантролю, аператыўна-вышуковай дзейнасці. У гэтым годзе будзе ўкаранёны аператыўна-мабільны спосаб аховы граніцы на прыбалтыйскім і ўкраінскім участках. Будзе распрацавана таксама канцэпцыя развіцця пагранічных войскаў на 2008—2018 гады.

Намаганні ведамства будуць накіраваны на выкананне патрабаванняў Прэзідэнта па забеспячэнню аховы дзяржграніцы ва ўмовах рэальна існуючых рызык, небяспек і пагроз. Дзяржкамітэт пагранвойскаў мае намер узаемадзейнічаць з усімі грамадзянскімі органамі ўлады па правядзенню комплексных узгодненых дзеянняў, якія даюць магчымасць забяспечыць нацыянальную бяспеку.

Кар. БЕЛТА.



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Вадохрышча ў крынічнай купелі ў вёсцы Палыкавічы Магілёўскага раёна.

Святло Непрыступнае

Сёння Праваслаўная царква адзначае Святое Богаяўленне, Хрышчэнне Гасподняе. Гэта адно з вялікіх нерухомых дванаццацесятых святаў, якое ўсталявана ў памяць хрышчэння Госпада Ісуса Хрыста ў рацэ Іардан ва ўзросце трыццаці гадоў.

Асаблівасцю свята Хрышчэння з'яўляюцца два вялікія водасвячэнні. Першае з іх адбываецца напярэдадні свята, 18 студзеня, у храме, а другое — 19 студзеня, у дзень самога свята, пасля Літургіі і хрэснага ходу, пад адкрытым небам на рэках, крыніцах і ў студнях. Хрышчэнская святая вада называецца агіясмай (грэч. — асвячоная), гэта — вялікая царкоўная святыня. З даўніх часоў гэтая вада прызначаецца, у прыватнасці, для тых, хто з розных прычын пазбаўлены святога Прычасця.

Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.

НАЙЛЕПШЫ АЎТАМАБІЛЬ — НОВЫ

Летась у Беларусі было прададзена новых легкавых аўтамабіляў у 2 разы больш, чым у 2005 годзе.

Для параўнання. Калі ў 2005 годзе беларусы набылі 4900 новых аўто, то летась — 10 020 такіх машын. Як адзначыў PR-менеджар кампаніі «Атлант-М Фарцойгхандэль» Арцём Ганцоў, рэзкаму ўсплёску продажу новых легкавікоў садзейнічалі два асноўныя фактары: уніфікацыя мытных пошлін для фізічных і юрыдычных асоб, а таксама дынамічнае развіццё аўтакрэдытавання. Па-ранейшаму лідарства ў рэйтынгу «прадаваемасці» сярод новых аўто ўтрымліваюць поўнапрывадныя машыны. Першае месца заняла японская кампанія Toyota: летась беларусы набылі 210 аўтамабіляў мадэлі «Land Cruiser» і 176 — «RAV-4». Нечаканую папулярнасць набыла расійская «Chevy Niva». У мінулым годзе былі прададзены 353 новыя аўто гэтай мадэлі.

Мікола ДЗЯБЁЛА.

РОЗГАЛАС

АПОШНЯЯ ІНФАРМАЦЫЯ СУТАК

У БЕЛАРУСІ ПАВЯЛІЧАНЫ ТАРЫФЫ НА ПАСЛУГІ ЖКГ

У Беларусі з 1 студзеня павялічаны тарыфы на паслугі ЖКГ для насельніцтва, паведаміў журналістам намеснік прэм'ер-міністра Віктар Бура.

Паводле інфармацыі міністра жыллёва-камунальнай гаспадаркі Уладзіміра Белахвостава, у адпаведнасці з прынятым урадам рашэннем, тарыфы на газ і электрычнасць узрастуць на 20 працэнтаў, цеплавую энергію — на 12 працэнтаў. У выніку ў разліку на двухпакаёвую кватэру плацяжы павялічацца на $5. Як адзначыў Уладзімір Белахвостаў, «прынята рашэнне аб тым, што мэтазгодна $5 аддаць на павышэнне тарыфаў на газ, электрычную энергію і цеплавую энергію, паколькі менавіта гэтыя рэсурсы падаражэлі на ўваходзе ў рэспубліку». Такім чынам, будуць кампенсавацца затраты энергазабеспячальных арганізацый. Міжжылкамгас будзе шукаць іншыя крыніцы для мінімізацыі наступстваў ад павышэння цэн на энергарэсурсы. Паводле слоў Віктара Буры, у гэтым годзе павышэння тарыфаў на паслугі ЖКГ для насельніцтва больш быць не павінна, калі не ўзнікне якіх-небудзь «форс-мажорных абставінаў».

Вольга СРЭДНЕВА, БЕЛТА

ШКВАЛЬНЫ ВЕЦЕР ДА 25—30 М/СЕК

Сёння ўдзень праз Балтыйскае мора і прыбалтыйскія краіны на ўсход хутка рухаецца моцны Атлантычны цыклон, які прынёс у нашу краіну штармавое надвор'е.

Як паведаміла карэспандэнту «Звязды» галоўны сіноптык Рэспубліканскага гідраметцэнтра Мінпрыроды Вольга Фядотава, ужо з раніцы 19 студзеня вецер узмацніўся да штармавога — 15—22 м/сек, разам з тым па большай частцы тэрыторыі краіны хуткасць яго будзе дасягаць нават 25—30 м/сек. Ападкі ў гэты дзень будуць у выглядзе дажджу, які пачне мяняцца мокрым снегам. Тэмпература паветра складзе 3—8 градусаў цяпла, аднак па поўначы краіны тэмпературны фон знізіцца да 0—плюс 2 градусаў. У выхадныя захаваецца няўстойлівае надвор'е. У нядзелю атмасферны фронт з боку Заходняй Еўропы прынясе да нас мокры снег, які ў другой палове дня пачне пераходзіць у дождж. Зноў узмацніцца парывісты вецер з захаду, уначы з суботы на нядзелю на ўсходзе Беларусі падмарозіць да мінус 3 градусаў. Згодна з папярэднімі прагнозамі, у пачатку наступнага тыдня ў тылавой частцы цыклона на тэрыторыю Беларусі пачне зацягвацца больш халоднае паветра з боку Скандынаўскага паўвострава. Месцамі пройдзе кароткачасовы сапраўды зімовы снег. Тэмпература паветра да аўторка знізіцца ўначы да 1—6 градусаў марозу, удзень будзе каля 0.

Увага! Сіноптыкі папярэджваюць, што парывы ветру да 25—30 м/сек могуць нарабіць бяды. Будзьце ўважлівыя і асцярожныя. Спецыялісты зноў нагадваюць бацькам у такое надвор'е лепш пакідаць сваіх дзетак дома і не выпускаць гуляць на двор самастойна.

Сяргей КУРКАЧ.

У БЕЛАРУСІ НАЛІЧВАЕЦЦА ЗВЫШ ТЫСЯЧЫ ПРАЦУЮЧЫХ ПЕНСІЯНЕРАЎ ВА ЎЗРОСЦЕ БОЛЬШ ЗА 80 ГАДОЎ

Паводле звестак Міністэрства працы і сацыяльнай абароны, у Беларусі працягваюць працаваць 523,5 тыс. пенсіянераў, што складае 21,5 працэнта ад іх агульнай колькасці. Прычым даводзіцца канстатаваць: у параўнанні з мінулым годам гэты паказчык павялічыўся на 1,5 працэнтнага пункта.

У прыватнасці, як паведаміла начальнік галоўнага ўпраўлення пенсійнага забеспячэння і сацыяльнага страхавання міністэрства Валянціна Каралёва, зараз працягвае працаваць 37,4 тыс. пенсіянераў-мужчын і 60,7 тыс. пенсіянерак-жанчын ва ўзросце да 55 гадоў (зразумела, што тут маюцца на ўвазе пенсіянеры-«датэрміноўшчыкі»), 35,8 тыс. зноў-такі «датэрміноўшчыкаў»-мужчын і 151,7 тыс. жанчын ва ўзросце 55—59 гадоў, 54,4 тыс. мужчын і 55,4 тыс. жанчын ва ўзросце 60—64 гады, 43,6 тыс. мужчын і 43 тыс. жанчын ва ўзросце 65—69 гадоў, 20,7 тыс. мужчын і 17,5 тыс. жанчын ва ўзросце 70—79 гадоў. Паводле даных міністэрства, у Беларусі працуюць 440 мужчын і 609 жанчын, якія ўжо маюць узрост больш за 80 гадоў.

Сяргей ГРЫБ.

ПЕРАЙШЛІ ГРАНІЦУ... ВЫПАДКОВА?

Такое можа быць, бо беларуска-ўкраінская граніца, як вядома, не мае дакладнага абазначэння па ўсяму перыметру.

Але ці прыме да ўвагі рассеянасць брэсцкіх паляўнічых суд Шацкага раёна Украіны, невядома. Бо шасцёра жыхароў Брэста і Брэсцкага раёна былі затрыманы з паляўнічымі стрэльбамі на тэрыторыі Шацкага прыроднага парку пагранічным нарадам суседняй дзяржавы прыкладна ў 400 метрах ад граніцы. Зброю ў мужчын адабралі і даставілі іх у ізалятар. Далей — справа суда.

Яна СВЕТАВА, Сымон СВІСТУНОВІЧ.

«ЛІТАРАТУРНЫ КОНКУРС «ЗВЯЗДЫ» НЕВЫПАДКОВА НАЗЫВАЮЦЬ НАРОДНЫМ»

Фота Марыі ЖЫЛІНСКАЙ

Учора ў рэдакцыі газеты «Звязда» прайшоў «круглы стол» з удзелам пераможцаў конкурсу апавяданняў 2006 года.

«Конкурс апавяданняў — гэта пульс жыцця, дакрананне да таго, што адбываецца ў рэчаіснасці, — адзначыў вядучы конкурсу апавяданняў, вядомы беларускі пісьменнік Віктар Казько. — Чытаючы пошту, заўсёды знаходзіш штосьці незвычайнае, адметнае... Апавяданне Таісы Сямёнавай неадрыўнае ад прыкарнявой сістэмы народнага жыцця. Васіль Ткачоў сёння — умогуле адзін з лепшых аўтараў. Пачатковец Андрэй Сідарэйка — гэта ўзнёсласць, рамантызм, летуценнасць... Невыпадкова літаратурны конкурс «Звязды» называюць народным. Увогуле адзначу, што ніводная газета не праводзіць конкурс апавяданняў...»

Таццяна ПАДАЛЯК.

(Заканчэнне ў наступным нумары.)

***НА ЗДЫМКУ:** пераможцы конкурсу апавяданняў 2006 года Андрэй СІДАРЭЙКА, Васіль ТКАЧОЎ, Таіса СЯМЁНАВА і вядучы конкурсу, пісьменнік Віктар КАЗЬКО.*

Ва ўрадзе

Прыняты Правілы будаўніцтва і эксплуатацыі аўтастаянак, парковак і карыстання імі

Урад Беларусі пастанавіў № 9 ад 5 студзеня 2007 года зацвердзіў Правілы арганізацыі (будаўніцтва), эксплуатацыі аўтамабільных стаянак, аўтапарковак і карыстання імі. Дакумент уступіў у сілу з 1 студзеня 2007 года.

Новыя правілы распрацаваны ў адпаведнасці з указам Прэзідэнта ад 3 кастрычніка 2006 года № 589 «Аб упарадкаванні работы аўтамабільных стаянак і аўтамабільных парковак», а таксама Правіламі дарожнага руху, зацверджанымі ўказам Прэзідэнта ад 28 лістапада 2005 года № 551.

Дакументам вызначаны парадак прадастаўлення месцаў на аўтамабільных стаянках уладальнікам транспартных сродкаў. Устаноўлены патрабаванні да захоўвання машын на стаянках, допуск уладальнікаў аўтатранспарту на аўтапаркоўкі. Вызначаны правы і абавязкі як юрыдычных асоб і індывідуальных прадпрымальнікаў, якія з'яўляюцца ўласнікамі стаянак і парковак, так і ўладальнікаў транспартных сродкаў.

Юрыдычныя асобы, якія маюць у карыстанні або па дагавору арэнды зямельныя ўчасткі, прадастаўленыя для будаўніцтва і эксплуатацыі рынкаў, гандлёвых цэнтраў, маюць права арганізоўваць на іх закрытай тэрыторыі аўтамабільныя стаянкі для захоўвання транспартных сродкаў тэрмінам да аднаго месяца ў адпаведнасці з рашэннямі мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў. Колькасць месцаў на аўтастаянцы павінна адпавядаць названай у праектнай дакументацыі.

Плата за паслугі аўтастаянкі ўстанаўліваецца ў парадку, што вызначаецца Міністэрствам эканомікі, і ў адпаведнасці з дагаворам паміж яе ўладальнікам і ўладальнікам транспартнага сродку дыферэнцыравана, у залежнасці ад працягласці захоўвання машыны: да адной гадзіны і больш за адну гадзіну. Дыферэнцыяцыя платы за захоўванне транспартнага сродку на тэрмін больш за адну гадзіну (у залежнасці ад працягласці захоўвання транспартнага сродку) устанаўліваецца ўладальнікам стаянкі самастойна.

Кар. БЕЛТА.

У Беларусі ў 2007 годзе павінна быць выпушчана для ўнутранага рынку 2 тыс. легкавых аўтамабіляў

Такая задача вызначана ў пастанове Савета Міністраў № 28 ад 12 студзеня 2007 года «Аб некаторых пытаннях вытворчасці і пастаўкі на ўнутраны рынак імпартазамяшчальных спажывецкіх тавараў».

Вытворчасць легкавых аўтамабіляў ускладзена на Міністэрства прамысловасці. У 2006 годзе ў Мінску на плошчах ЗАТ «Юнісан» пачала дзейнічаць зборачная вытворчасць легкавых аўтамабіляў іранскай кампаніі Iran Khodro.

Акрамя таго, Мінпраму ў 2007 годзе неабходна асвоіць і прадставіць на ўнутраны спажывецкі рынак шэраг іншых тавараў. У іх ліку — бытавыя зварачныя апараты, велатрэнажоры, вагі, дрэваапрацоўчае абсталяванне, дзіцячыя каляскі, маторныя лодкі, DVD-прайгравальнікі, кандыцыянеры, іншыя электрабытавыя тавары, усяго — больш як 60 таварных пазіцый.

БЕЛТА.

ПАДВЕДЗЕНЫ КАНЧАТКОВЫЯ ВЫНІКІ МЯСЦОВЫХ ВЫБАРАЎ

Учора прайшло пасяджэнне Цэнтральнай камісіі па выбарах і правядзенню рэспубліканскіх рэферэндумаў, на якім былі падведзены вынікі выбараў у мясцовыя Саветы. Такім чынам, канчатковая яўка выбаршчыкаў па краіне склала 79,2 працэнта.

Як і ў адпаведнасці з папярэднімі данымі, найбольшую актыўнасць праявілі выбаршчыкі Віцебскай вобласці — 90,4 працэнта. Паводле слоў старшыні Віцебскай абласной выбарчай камісіі, такія лічбы гавораць аб высокай актыўнасці ўсіх удзельнікаў выбарчай кампаніі. І ў першую чаргу дэпутатаў, якія былі пазнавальнымі і аўтарытэтнымі для насельніцтва. У прыватнасці, па безальтэрнатыўных акругах кандыдаты на Віцебшчыне набіралі ад 68 да 80 працэнтаў галасоў выбаршчыкаў, што пражываюць у акрузе. Другое месца па колькасці прагаласаваўшых займае Магілёўская вобласць — 84,5 працэнта. Далей ідуць Гомельская вобласць (83,1 працэнта), Мінская (81,7 працэнта), Брэсцкая (80,5 працэнта), Гродзенская (80,3 працэнта). Апошняе месца па яўцы выбаршчыкаў заняў Мінск — роўна 60 працэнтаў.

Аднак галоўная выніковая лічба мясцовых выбараў — 1581: менавіта столькі мясцовых Саветаў (а гэта стопрацэнтны паказчык) былі выбраны ў правамоцным саставе. Заслугоўвае ўпамінання і яшчэ адна лічба — 22 639. Гэта колькасць выбраных дэпутатаў, і да стопрацэнтнага выніку тут не хапіла выбраць яшчэ 22 (па 19 акругах пратэставае галасаванне было большым). Галоўнай прычынай высокай колькасці выбраных дэпутатаў, як адзначыла старшыня Цэнтрвыбаркама Лідзія Ярмошына, з'яўляецца не столькі высокая колькасць прагаласаваўшых выбаршчыкаў, колькі змены ў выбарчае заканадаўства, што былі прыняты напярэдадні выбараў. Нагадаем, што ўпершыню пры наяўнасці 50-працэнтнай яўкі перамагаў той кандыдат, які прасцішая іх колькасць — 299 — прадстаўляюць Камуністычную партыю Беларусі, яшчэ 24 — Аграрную партыю. Прадстаўніцтва астатніх партый — ад аднаго да трох чалавек. Па сутнасці, паведаміла старшыня Цэнтрвыбаркама, у новых мясцовых Саветах прадстаўлены ўсе слаі насельніцтва, што дазволіць дэпутатам адэкватна ўлічваць і абараняць інтарэсы выбаршчыкаў.

та набраў большую колькасць галасоў. Каментуючы магчымасць пераносу гэтай практыкі і на іншыя выбары, Л. Ярмошына адзначыла, што ў адносінах да прэзідэнцкіх выбараў гэта будзе праблематычна, бо неабходна змяненне Канстытуцыі. З парламенцкімі выбарамі працей: тут дастаткова змянення Выбарчага кодэкса. Тым не менш старшыня Цэнтрвыбаркама адзначыла, што «пакуль гэта пытанне не стаіць», больш таго, падчас разгляду змяненняў у выбарчае заканадаўства аб мясцовых выбарах дэпутаты ставіліся да магчымасці падобных змяненняў і ў адносінах да парламенцкіх выбараў «не вельмі пазітыўна».

Што датычыцца якаснага саставу мясцовых Саветаў, то 45,7 працэнта выбраных дэпутатаў — жанчыны, 51,2 працэнта — выбраны на новы тэрмін. 6,3 працэнта новага дэпутацкага корпусу мясцовых Саветаў — моладзь да 30 гадоў. Сярод моладзі — 1465 членаў БРСМ, прычым толькі яшчэ 10 прадстаўнікоў гэтай арганізацыі не перамаглі на выбарах. Прыемным лічыць старшыня Цэнтрвыбаркама і выбранне дэпутатамі мясцовых Саветаў 11 грамадзян Расіі, якія стала пражываюць на тэрыторыі Беларусі і маюць права ўдзельнічаць у выбарах. Паводле слоў Л. Ярмошынай, гэта сведчыць аб «брацкіх сувязях» паміж нашымі народамі, хоць Беларусь, па аналогіі з Расіяй, і павінна была б адмяніць адпаведную норму нашага выбарчага заканадаўства. Акрамя гэтага, у састаў дэпутатаў увайшлі работнікі прамысловасці, гандлю, транспарту, будаўніцтва (13,9 працэнта), сельскай гаспадаркі (28,3), адукацыі (16,5 працэнта), аховы здароўя і сацыяльнай абароны (8,7 працэнта), ваеннаслужачыя і работнікі праваахоўных органаў (3,2 працэнта), служачыя дзяржаўных органаў (13,7 працэнта), іншых сфер дзейнасці (16,3 працэнта). Прадстаўнікамі палітычных партый з'яўляюцца 1,5 працэнта ад агульнай колькасці дэпутатаў, або 335 чалавек. Найбольшая ж іх колькасць — 299 — прадстаўляюць Камуністычную партыю Беларусі, яшчэ 24 — Аграрную партыю. Прадстаўніцтва астатніх партый — ад аднаго да трох чалавек. Па сутнасці, паведаміла старшыня Цэнтрвыбаркама, у новых мясцовых Саветах прадстаўлены ўсе слаі насельніцтва, што дазволіць дэпутатам адэкватна ўлічваць і абараняць інтарэсы выбаршчыкаў.

У цэлым, паведаміла Л. Ярмошына, выбарчая кампанія прайшла паспяхова, а яе вынікі адпавядаюць волевыяўленню народа. Пры гэтым яна адзначыла, што падчас гэтых выбараў склалася «ўнікальная сітуацыя»: упершыню з 2000 года некалькі дзён пасля выбараў не паступалі скаргі. Пачалі яны паступаць толькі праз тры дні і ў «нязначнай колькасці». Паводле слоў старшыні Цэнтрвыбаркама, «ужо беглае азнаямленне з імі гаворыць аб тым, што яны не ўтрымліваюць інфармацыю аб парушэннях законаў». У асноўным там — скаргі на нязнойдзенае паразуменне, выдуманыя сітуацыі і г. д.

Таксама Л. Ярмошына паведаміла, што за ходам мясцовых выбараў назірала каля 19 тысяч мясцовых назіральнікаў (замежных не запрашалі ўвогуле). Хоць гэта менш у параўнанні з мінулымі выбарамі (тады было 33 тысячы), аднак «нядрэнна». Тым больш што Беларусь, паводле яе слоў, займае першае месца сярод краін па колькасці арганізацый, якія могуць накіроўваць на выбары назіральнікаў. Актаў аб парушэнні выбарчага заканадаўства ад іх не паступала. У сувязі з гэтым Л. Ярмошына выказала здзіўленне адносна заявы старшыні Еўрапейскага саюза аб тым, што ў Беларусі не створана ўмоў для свабоднага волевыяўлення грамадзян. Старшыня Цэнтрвыбаркама лічыць, што гэта не вытрымлівае крытыкі, бо ў Цэнтральную камісію не паступала фактаў аб арыштах, нядопуску на выбарчыя ўчасткі і г. д. Паводле яе слоў, падобныя факты ЕС мог атрымаць толькі ад «неправераных суб'ектыўных крыніц», якія, як правіла, прадстаўляюць «пакрыўджаны бок». Л. Ярмошына лічыць, што такая арганізацыя, як ЕС павінна выносіць свае рашэнні на іншых падставах.

Сяргей КАРАЛЕВІЧ.

Ведай нашых!

150 тысяч долараў за самае прыгожае дэфіле

Беларуска Вікторыя МАХОТА заняла другое месца на конкурсе «Форд Супермадэль свету-2007»

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Фінальнае шоу аднаго з самых прэстыжных мадэльных конкурсаў прайшло ў Нью-Ёрку ўвечары 17 студзеня. За тытул «Супермадэль свету» змагаліся канкурсанткі з больш як 40 краін, у тым ліку і 15-гадовая прадстаўніца Беларусі Вікторыя Махота.

У выніку першае месца і кантракт з агенцтвам «Форд Модэлс» на суму ў 250 тысяч долараў журы прысудзіла ўдзельніцы з Нідэрландаў, кантракт на меншую суму — 150 тысяч долараў — дастаўся беларусцы. Прадстаўніцы Даніі за трэцяе месца агенцтва прапанавала гадавое супрацоўніцтва ў выглядзе кантракта на 100 тысяч долараў. Дарэчы, паводле слоў дырэктара «Студыі моды Сяргея Нагорнага» Вольгі Паповай, якая рыхтавала, суправаджала і падтрымлівала нашу канкурсантку, журы адзначыла дэфіле Вікторыі Махота як самае прыгожае і прафесійнае.

Нагадаем, 15-гадовая мінчанка, якая раней ніколі не займалася мадэльным бізнэсам, перамагла ў нацыянальным адборы, дзе ў фінале сустрэліся 30 прыгажунь з усіх рэгіёнаў Беларусі. Пасля гэтага Вікторыя прайшла экспрэс-курс навучання ў подыум-школе «Студыя моды Сяргея Нагорнага», дзе педагогі выкладалі дзяўчыне акцёрскае майстэрства, этыкет, майстэрства макіяжу, дэфіле і г.д.

Летась прадстаўніца Беларусі — мінчанка Кацярына Даманькова — заняла на конкурсе «Форд Супермадэль свету» першае месца, абышоўшы саперніц з 38 краін свету. Сёлета Вікторыя Махота, апраўдаўшы ўласнае імя, амаль што паўтарыла гэта дасягненне. І хто пасля гэтага сумняваецца, што беларускія дзяўчаты — самыя, самыя?..

Вікторыя ЦЕЛЯШУК.

РУП «БЕЛОРУССКИЕ ЛОТЕРЕИ»

СООБЩАЕТ,

что реализация билетов Республиканской мгновенной денежной лотереи «Спорт» 4-го и 5-го выпусков прекращена. Последний день выплаты выигрышей — 1 июля 2007 года.

КУП «МИНСКИЙ ОБЛАСТНОЙ ЦЕНТР УЧЕТА НЕДВИЖИМОСТИ»

ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН

по продаже незавершенного строительством здания мебельного цеха (об. пл. — 1440,0 кв.м) с котельной (об. пл. — 144,0 кв.м), расположенные в г. Узда, ул. Восточная. Начальная цена составляет — 203 475 600 белорусских рублей. Подробное извещение опубликовано в газете «Звязда» от 13.10.2006 г. Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения. Аукцион состоится 22 февраля 2007 г. в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, ком. 321. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по 21 февраля 2007 г. до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, ком. 322.

Телефон (8017) 224-61-34.
Наш сайт в Интернете : www.rlt.by

УП «МИНСКИЙ ГОРОДСКОЙ ЦЕНТР НЕДВИЖИМОСТИ»

ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН

по предоставлению юридическим лицам и индивидуальным предпринимателям во временное пользование торговых площадей в торговом центре «Купаловский»

№№ лота	Номера торговых мест	Площадь торгового места, кв.м	Начальная цена кв. м, евро	Срок аренды, месяцев	Размер задатка, базовых величин
1.	106	4,0	37,5	12	10

Для участия в аукционе участник перечисляет задаток и плату за участие в аукционе в размере 4 базовых величин на р/с 3012024570010 в филиале ОАО «Белпромстройбанк» по Минской области, код 153001331, УНП 190398583 УП «Минский городской центр недвижимости». Перечень необходимых документов и порядок подачи определен условиями проведения аукциона. Договор аренды с победителем заключается в течение 3 рабочих дней с даты проведения аукциона. Аукцион состоится 31 января 2007 г. в 14.30 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Документы на участие в аукционе принимаются по 30 января 2007 г. до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

Контактные телефоны: 227-40-22, 227-48-36. Наш сайт в Интернете www.mgcn.by

ISSN 1990-763X

9 771990 763015

КУРСЫ ВАЛЮТ

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 19.01.2007 г. (для б/н разлікаў)		Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў	
1 долар ЗША	2 140,00	Цэнтрабанк РФ	
1 еўра	2 770,77	USD	26,5343
1 латвійскі лат	3 971,42	10 UAH	52,4642
1 літоўскі літ	802,54	1000 BYR	12,3804
1 чэшская крона	99,53	EUR	34,3991
1 польскі злоты	714,57	Курс у гандлёвых кампаніях (на 18.01.2007)	
1 расійскі рубель	80,65	USD	2210 / 2320
1 украінская грыўня	422,97		

Агенцтва Уладзіміра Граўцова

Падпішыцеся на часопіс «Главный бухгалтер. ГБ» на 2007 год у рэдакцыі па самай выгаднай цане. Тэлефон рэдакцыі: 209-69-01.

Факт...

«ІЛЬГОТЫ» ПАД ПАГРОЗАЙ?

Федэрацыя прафсаюзаў Беларусі выступіла з прапановай перанесці разгляд у парламенце праекта Закона «Аб прафесійным пенсійным страхаванні» — аб гэтым паведаміла **прэс-сакратар ФПБ Ірына КАГАНЕЦ.**

У прыватнасці, на думку прафсаюзаў, адтэрміноўка разгляду неабходна для пошуку новых падыходаў да пункта 3 артыкула 17 законапраекта. Гэты пункт прадугледжвае адмену да дасягнення агульнаўсталяванага пенсійнага ўзросту выплаты пенсіі асобам, якія атрымалі права на іх датэрмінова, пры ўмове працягу работы ў шкодных умовах.

Апроч таго, адзначыла Ірына Каганец, патрабаванне перагляду законапраекта мае іншыя тлумачэнні. Закон вызначае, што пенсійнае забеспячэнне работнікаў з асаблівымі ўмовамі працы з даты ўзнікнення права на датэрміновую пенсію і да агульнаўсталяванага пенсійнага ўзросту павінна рабіцца за кошт мэтавых дадатковых адлічэнняў наймальнікаў. Аднак, лічачь у Федэрацыі прафсаюзаў, наступствы такой формулы могуць быць самымі нечаканымі — замест укаранення новых тэхналогій і паляпшэння ўмоў працы наймальнікі будуць імкнуцца зменшыць памер страхавых узносаў і, адпаведна, спрабаваць рознымі шляхамі скараціць Спісы вытворчасцяў, работ, прафесій, пасад і паказчыкаў, якія даюць права на датэрміновую пенсію.

У выніку, мяркуюць у ФПБ, прапанаваная рэдакцыя законапраекта пагоршыць становішча работнікаў шэрагу горадаўтваральных прадпрыемстваў, дзе значная частка работнікаў занята ў шкодных умовах. У прыватнасці, гаворка тут можа ісці аб работніках такіх прадпрыемстваў, як «Беларуськалій», «Гродна-Азот», «Нафтан», а таксама светлагорскае і магілёўскае вытворчыя аб'яднанні «Хімвалакно».

Даслоўна

вацца і льготныя працоўныя, і прафесійныя пенсіі.

— Між тым, другі аргумент супраць прыняцця закона — рызыка таго, што «шкодныя» прадпрыемствы, каб не плаціць мэтавых узносаў, будуць усімі магчымымі шляхамі абмяжоўваць саму колькасць «датэрміноўшчыкаў». Наколькі верагодным падаецца менавіта такое развіццё падзей?

— Я не думаю, што з прыняццем закона наймальнікі змогуць адшукаць нейкія «дадатковыя пралазы». Паводле ўжо цяперашняга заканадаўства, датэрміновыя пенсіі прызначаюцца толькі тады, калі «шкоднасць» работы пацвярджаецца атэстацыяй працоўных месцаў. Адпаведна, скараціць колькасць «датэрміноўшчыкаў» можна і зараз. Але для гэтага неабходна адно — стварыць здаровыя ўмовы працы.

Гэта магчымасць застанецца адзінай і ў будучым. І наймальніку, які лічыць пэўнае працоўнае месца бясшкодным, давядзецца гэта даказаць. Прычым даказаць зноў-такі ў рамках атэстацыі камісіі з удзелам прафсаюзаў.

— І апошняе. Чым тлумачыцца сама неабходнасць новаўвядзенняў?

— Па сваёй сутнасці любая пенсія — гэта замена страчанага заробку. Таму аб'ектам асноўнага клопату для пенсійнай сістэмы з'яўляюцца тыя, хто ўжо не можа забяспечыць сябе самастойна. Менавіта такі абавязак дзяржавы ў забеспячэнні сацыяльнымі выплатамі ў выпадку непрацаздольнасці вынікае з Асноўнага Закона нашай краіны — Канстытуцыі. Між тым, магчымасць павелічэння выплат такім людзям шмат у чым стрымліваецца цяперашнім парадкам фінансавання датэрміновых пенсій па ўмовах працы. Паўтарыся, што зараз датэрміновыя пенсіі выплачваюцца з агульнага «катла». Прычым памеры выдаткаў на аплату «пенсійных ільгот» адсюль узрастаюць, да прыкладу, летась яны дасягнулі 260 млрд рублёў, ці звыш 120 млн долараў у эквіваленце. І можна сказаць, што па сутнасці гэта тая сума, якую фактычна недатрымалі пенсіянеры-ньяльготнікі.

Да таго мы спадзяёмся, што ўвядзенне прафесійнага пенсійнага страхавання сапраўды «падштурхне» наймальнікаў да пошуку варыянтаў паляпшэння ўмоў працы. І, да слова, адзначу, што пазіцыя ФПБ у гэтым пытанні выклікае неўразуменне. Асноўнай задачай дзейнасці прафсаюзаў была і застаецца работа па паляпшэнню ўмоў працы работнікаў. І іх процідзеянне ўвядзенню рацыянальных нормаў, якія б у тым ліку стымулявалі работнікаў, занятых у шкодных умовах, сапраўды пакідаць такую работу і выходзіць на пенсію ў мэтах захавання свайго здароўя (а жадаючых працаваць — да пошуку іншых, больш бяспечных месцаў) падаецца проста неканструктыўным. Бо зразумела: змяненне дзеючага парадку павінна адбівацца на працягласці жыцця непасрэдна работнікаў.

Сяргей ГРЫБ.

Таццяна ПАГОНЫШАВА:

... і каментарый

«ПРАФЕСІЙНЫЯ ПЕНСІЙНЫЯ СРОДКІ БУДУЦЬ ВЫПЛАЧВАЦЦА Ў ЛЮБЫМ ВЫПАДКУ»

Статыстыка сведчыць, што кожны год у Беларусі прызначаецца каля 90 тысяч новых пенсій па ўзросту і за выслугу гадоў. Прычым прыкладна трэцяя частка з іх з'яўляецца пенсіямі датэрміновымі. Лічба значная. Прынамсі, не выпадае сумнявацца, што тэма фінансавання пенсійных «ільгот» падаецца актуальнай для многіх грамадзян нашай краіны. Таму па каментарый гэтай сітуацыі карэспандэнт «Звязды» вырашыў звярнуцца да **начальніка аддзела развіцця пенсійнай сістэмы Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Таццяны Аляксандраўны ПАГОНЫШАВАЙ.**

— Для пачатку давайце вызначым: якую формулу фінансавання датэрміновых пенсій прадугледжвае праект Закона «Аб прафесійным пенсійным страхаванні»?

— Праект закона вызначае змяненне самога прынцыпу фінансавання датэрміновых пенсій. Калі сёння іх фінансаванне робіцца за кошт агульных пенсійных сродкаў, якія фарміруюцца Фондам сацыяльнай абароны насельніцтва з бягучых адлічэнняў усіх працуючых грамадзян і ўсіх наймальнікаў краіны, то, як чакаецца, у будучым датэрміновыя пенсіі (ад моманту атрымання права на іх і да дасягнення агульнага пенсійнага ўзросту) стануць аплачвацца за кошт мэтавых узносаў толькі «шкодных» прадпрыемстваў. А пенсіі пасля дасягнення агульнаўсталяванага пенсійнага ўзросту — па-ранейшаму за кошт гэтых адлічэнняў у Фонд.

Дарэчы, самі памеры такіх мэтавых «прафесійных» узносаў для прадпрыемстваў асобных галін будуць вызначаны пазней. Разам з тым трэба падкрэсліць адразу: мяркуецца, што дадатковыя адлічэнні павінны рабіць выключна работадаўцы. Але ні ў якім разе дадатковай «нагрузкі» не будуць несці непасрэдна работнікі.

— У такім разе, як плануецца рабіць налічэнне датэрміновых пенсій? І, уласна кажучы, хто атрымае на іх права?

— Фарміраванне сродкаў прафесійнай пенсіі для кожнага работніка, які заняты ў асаблівых умовах, будзе весціся персанальна. І ўжо з улікам гэтых назапашаных сродкаў будзе вызначацца яе памер для кожнага канкрэтнага «датэрміноўшчыка».

Прычым у атрыманні грошай, назапашаных на датэрміновую пенсію, ёсць два варыянты. Першы. Чакаецца, што пры жаданні чалавек можа атрымліваць выплаты ў перыяд ад з'яўлення права на датэрміновую пенсію і да дасягнення агульнаўсталяванага пенсійнага ўзросту. Аднак скарыстацца такой магчымасцю можна будзе толькі ў выпадку, калі чалавек пакіне работу з асаблівымі ўмовамі.

І другі варыянт. Пры жаданні работнік, на якога ішло назапашванне сродкаў прафесійнага пенсійнага страхавання, зможа атрымліваць гэтыя сродкі ўжо пасля дасягнення агульнага пенсійнага ўзросту. Інакш кажучы, атрымліваць пенсію адразу з двух частак — «працоўнай» і «прафесійнай».

— Аднак нельга не заўважыць, што правіла атрымання датэрміновай пенсіі пры ўмове звальнення са «шкоднай» работы, можа ўспрымацца сапраўды неадназначна...

— Падкрэслю: сродкі, налічаныя на карысць работніка ў рамках прафесійнага пенсійнага страхавання, яму будуць выплачаны ў тым ці іншым парадку абавязкова — у датэрміновым перыядзе ці пасля дасягнення агульнаўсталяванага пенсійнага ўзросту.

Прычым мы мяркуем, што значная частка «датэрміноўшчыкаў» адрасаваць перавагу менавіта «позняму» варыянту. Возьмем прыклад ВА «Беларуськалій». Зараз сярэдняя зарплата работнікаў прадпрыемства, што заняты пад зямлёй, складае каля 1,7 млн, а сярэдняя зарплата шахцёраў — да 2,8 млн рублёў. Тады як сярэдняя датэрміновая пенсія, што выплачваецца сёння ў дадатак да заробкаў працуючым работнікам аб'яднання, прызначаецца прыкладна ў 300 тысяч. Словам, на фоне зарплаты пенсійная выплата атрымліваецца не такой адчувальнай.

І зусім іншай будзе сітуацыя, калі работнік прадпрыемства дасягне агульнаўсталяванага пенсійнага ўзросту і рана ці позна па аб'ектыўных прычынах пакіне месца працы. У такіх варунках у яго застанецца толькі адна крыніца даходаў — працоўная пенсія. І «дадатак» да яе ў выглядзе пенсіі прафесійнай акажацца істотным. Пры гэтым варта заўважыць — у час «адтэрміноўкі» атрымання прафесійнай пенсіі назапашаныя на яе сродкі будуць працаваць на фінансавым рынку. А значыць, сама сума назапашванняў можа ўзрасці, што, адпаведна, адаб'ецца і на памеры пенсіі.

— Наколькі можна зразумець, прафесійнае пенсійнае страхаванне з'яўляецца адным з варыянтаў накаплення. Але не сакрэт: накапіць за год і за пяць гадоў можна абсалютна розныя сумы. І ў выніку — мець абсалютна розныя пенсіі. На ваш погляд, ці не акажуцца ў выніку новаўвядзенняў у пройгрышы асобы, якім да выхаду на датэрміновую пенсію ўжо засталося няшмат часу?

— Мяркуецца, што ўвядзенне нормаў закона стане паступовым. І, у прыватнасці, прапануецца, што змяненні ў поўнай меры будуць датычыцца толькі тых грамадзян, якія змаглі сфарміраваць свае правы на датэрміновыя пенсіі па новай схеме цалкам. Словам, тут спатрэбіцца працяглы пераходны перыяд, падчас якога будуць выплачвацца і льготныя пенсіі.

На слыху

ПРОДАЖ ПУСТЫХ УЧАСТКАЎ НА ДРУГАСНЫМ РЫНКУ ЗЯМЛІ ЗАБАРОНЕНЫ КАНЧАТКОВА

Аб гэтым у рэдакцыі газеты «Звязды» падчас «прамой лініі» паведаміў старшыня Дзяржаўнага камітэта па маёмасці Георгій Кузняцоў.

Справа ў тым, што гэтая норма закона пачала дзейнічаць з першых дзён 2007 года, згодна з Указам Прэзідэнта ад 28 студзеня 2006 года № 58 «Аб некаторых пытаннях адабрання і прадастаўлення зямельных участкаў». Аднак рэдакцыя выданння на працягу амаль двух тыдняў атрымлівала звароты сваіх чытачоў аб тым, што магчыма хутка ўласнікам такой зямлі зноў дазволяць прадаваць пустыя зямельныя ўчасткі на другасным рынку зямлі. Георгій Іванавіч запэўніў нашых падпісчыкаў, што меркаванні на гэты конт з'яўляюцца толькі чуткамі.

Зараз пустыя зямельныя ўчасткі, або з незавершаных будаўніцтвам аб'ектамі, якія былі дадзены фізічным асобам для будаўніцтва і абслугоўвання жылога дома і дачы, прадавацца на другасным рынку зямлі ўжо не будуць. Георгій Кузняцоў адзначыў, што дадзеная забарона не датычыцца зямельных участкаў, якія былі выдадзены грамадзянам для вядзення садаводства і агародніцтва. Старшыня камітэта ўдакладніў, што сёння ў Беларусі існуе толькі 6 дачных пасёлкаў, якія размешчаны ў сталічным рэгіёне, а так званыя ў народзе дачы ці «фазенды» вакол іншых гарадоў краіны з'яўляюцца домікамі для адпачынку ў садоўніцкіх кааператывах.

Поўную справаздачу «прамой лініі» з Георгіем Кузняцовым чакайце ў бліжэйшых нумарах.

Сяргей КУРКАЧ.

СЕТКА СТРАХАВЫХ КАМПАНІЙ БУДЗЕ РАЗВІВАЦЦА...

Летась у Беларусі намецілася станоўчая тэндэнцыя па павелічэнню ўдзельнай вагі страхавых узносаў па дабраахвотнаму страхаванню ў агульнай суме сабраных страхавых узносаў. Паводле слоў намесніка начальніка Галоўнага ўпраўлення страхавога нагляду Мінфіна Беларусі Васіля Філонава, калі ў 2005 годзе гэты паказчык складаў 32,4 працэнта, то за 11 месяцаў мінулага — ужо 37,3 працэнта. Страхавыя ўзносы па добраахвотных відах страхавання за студзень—лістапад 2006 года ў параўнанні з аналагічным перыядам 2005 года павялічыліся на 31,9 працэнта. За 11 месяцаў беларускімі страхоўшчыкамі (зараз у рэспубліцы дзейнічае 22 страхавыя арганізацыі) было атрымана страхавых узносаў па дагаворах прамога страхавання і сустрахавання на суму 505,9 млрд рублёў, а выплаты страхавой кампенсацыі і страхавога забеспячэння ў цэлым па рэспубліцы склалі 267,7 млрд рублёў.

Ігар ГРЫШЫН.

В публикации УП «Минский городской центр недвижимости» (Продавец) совместно с ИМНС по Советскому району г. Минска (газета «Звязда» № 11 от 18.01.2007 г., 1-я полоса) в предложении «начальная цена снижена и составляет 4 998 775 000 рублей» фразу: **с учетом НДС — исключить.**

Візіт старшыні ПАСЕ сведчыць аб гатоўнасці Беларусі да адкрытага дыялога з еўрапейскімі краінамі

Запрашэнне старшыні Парламенцкай асамблеі Савета Еўропы ў Беларусь сведчыць аб гатоўнасці нашай краіны да адкрытага дыялога з еўрапейскімі краінамі. Аб гэтым заявіў сёння журналістам старшыня Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Уладзімір Канаплёў. Візіт старшыні ПАСЕ — падзея для любой краіны, і Беларусь не з'яўляецца выключэннем. Чуткі аб тым, што Беларусь мае намер у ходзе гэтай сустрэчы «штосьці выпрошваць» няправільныя. «Мы будзем проста дыскусіраваць, разглядаць тыя або іншыя пытанні. Ён са свайго пункту гледжання, мы — са сваёй пазіцыі», — сказаў спікер ніжняй палаты беларускага парламента. У час візіту Рэнэ ван дэр Ліндэну будзе «паказана рэальная Беларусь, нашы людзі, наша жыццё». «Часам даходзіць да абсурду, калі прыязджаеш у Еўропу і чуеш, што Беларусь у калючым дроце, а па вуліцах ходзяць танкі», — сказаў Уладзімір Канаплёў.

У ходзе гэтых перагавораў беларускія парламентарыі маюць намер расказаць госцю аб рабоце, якую яны правялі за мінулыя 10 гадоў. Пры гэтым спікер адзначыў, што праграма візіту з'яўляецца «больш рабочай, чым пазнавальнай».

Марыя ГУЦАЛА, БЕЛТА.

67 новых абшчын вернікаў

У 2006 годзе ў Беларусі зарэгістравана 67 новых абшчын вернікаў (у 2005 — 58, у 2004 — 103). Аб гэтым паведаміў упаўнаважаны па справах рэлігій і нацыянальнасцяў Савета Міністраў Беларусі Леанід Гуляка сёння на калегіі Апарату ўпаўнаважанага. Пасяджэнне прысвечана вынікам работы ў 2006 годзе дзяржаўных органаў па справах рэлігій і нацыянальнасцяў, а таксама задачам на 2007.

Леанід Гуляка адзначыў, што ў мінулым годзе канфесіянальная структура беларускага грамадства не змянілася. У краіне не было зарэгістравана новых рэлігійных напрамкаў. Як і раней, у рэспубліцы дзейнічаюць 25 рэлігійных канфесій і напрамкаў. Агульная колькасць рэлігійных арганізацый на пачатак 2007 года дасягнула 3 тыс. 103 (з іх 2 тыс. 953 абшчыны вернікаў). Гэтыя даныя сведчаць аб захаванні высокага ўзроўню рэлігійнасці насельніцтва, лічыць упаўнаважаны.

Традыцыйна больш высокі ўзровень рэлігійнасці насельніцтва захоўваецца ў заходніх абласцях рэспублікі ў параўнанні з яе ўсходнімі рэгіёнамі. На пачатак 2007 года ў Брэсцкай вобласці дзейнічалі 684 абшчыны, Віцебскай — 494, Гомельскай — 345, Гродзенскай — 451, Магілёўскай — 236, Мінскай — 620 і ў Мінску — 123 абшчыны вернікаў.

Аляксандр СУХАВЕРХІ, БЕЛТА.

Майстар-клас

ПА ТОЙ БОК ПАЛАТНА

У звычайных людзей — звычайныя жонкі. У мастака Андрэя Смаляка — Муза. Яны разам яшчэ з трэцяга курса Тэатральна-мастацкага інстытута — некалькі дзесяцігоддзяў. Вольга заўжды побач: у жыцці і ў творчасці. Яна — на многіх карцінах мужа. І таму нічога дзіўнага, што менавіта Вольга Смаляк узялася за маштабны праект — выпуск другога альбома жывапісу Андрэя Смаляка, куды трапілі больш як 200 мастацкіх работ, напісаных з 1980 па 2006 год.

Фота Анатоля КЛЕЧУКА

— Колькі доўжыўся праект? — перапытвае Вольга. — Так адразу і не скажаш. Непасрэдна складаць альбом мы пачалі мінулай вясной, а атрымалі першы, сігнальны экзэмпляр напярэдадні Калядаў. Але задумалі гэты альбом мы значна раней...

Вольга, паводле яе ўласных слоў, толькі тым і займаецца, што раскручвае «дзве найярчэйшыя зоркі» — Андрэя Смаляка і Анжэліку Агурбаш (Вольга — даўняя сяброўка і мінскі дырэктар спявачкі). «Яны мае зоркі, а я — пры іх», — смяецца Вольга.

Яна расказала, што альбом «Андрэй Смаляк. Жывапіс» зроблены не зусім звычайным. І не толькі таму, што яго выпуск падтрымліваўся дзяржаўнымі датацыямі, а выніковы кошт у беларускіх крамах выклікае прыемны шок у аматараў мастацтва. Проста прадстаўлена гэта «галерэя карцін» не адрэзкамі часу — год гэткі і гэткі, а тэмамі. Усяго іх 9: «Музыка», «Гараджане», «Экзерсісы», «Інтымны дзённік», «Вера», «Камедыянты», «Жыццё», «Прырода» і «Персоны». Кожны раздзел адкрываецца філасофскімі выказваннямі мастака на зададзеную тэму. Увогуле, Андрэй так захапіўся гэтай справай, што зараз падумвае напісаць мемуары, і нават надыктоўвае на дыктафон асобныя разважанні і ўспаміны. «Думаю, што я ўвесь, мая ўнутраная існасць — цікавейшыя за альбом, і што мне ёсць чым падзяліцца, што расказаць людзям», — з усмешкай тлумачыць мастак свой «пенсіянерскі» занятак. А хто ж спрачаецца — як-ніяк, Андрэй Смаляк — ганаровы акадэмік Еўрапейскай акадэміі мастацтваў, які ўзнагароджаны сярэбраным медалём Еўрапарламента за ўклад у еўрапейскае мастацтва, аўтар заказнога партрэта прынцэсы Бельгіі, уладальнік персанальнай аўтарскай галерэі «Эрмітаж», мастак, на рахунку якога больш за 30 персанальных выстаў... І вельмі яркая, нават эпатажная асоба. Напрыклад, з прэзентацыі адной сваёй карціны Смаляк зрабіў суцэльнае касцюміраванае шоу, у якім задзейнічаў і сяброў, сярод якіх многія беларускіх зорак, і журналістаў. Дарэчы, гэты момант знайшоў адлюстраванне ў відэафільме «Аўтапартрэт», які зрабілі прафесіяналы Белтэлерадыёкампаніі — намеснік старшыні БТРК Аляксандр Мартыненка, рэжысёр Сяргей Рыбакоў, карэспандэнт Міхась Рабуцкі... DVD-дыск з гэтым фільмам і яшчэ некалькімі сюжэтамі — інтэрв'ю, хронікамі выстаў — між іншым, прыкладаецца да кожнага асобніка альбома жывапісу, выпушчанага дзвюхтысячным тыражом. І калі выпуск альбома ўзялі на сябе Міністэрства інфармацыі РБ і Мінская фабрыка каляровага друку, то дыск — своеасаблівы падарунак прыхільнікам мастацтва ад мастака і прадзюсарскага цэнтра Анжэлікі Агурбаш.

У хуткім часе альбом, паводле слоў дырэктара ВРУП «Мінская фабрыка каляровага друку» Аляксандра Аксёненкі, будзе прадстаўлены ў ліку лепшых выданняў, выпушчаных у Беларусі за 2006 год, на Франкфурцкай міжнароднай кніжнай выставе-кірмашы ў Германіі. Больш за тое, Аляксандр Іванавіч лічыць, што па якасці паліграфіі гэта выданне цалкам можа трапіць у экспазіцыю «100 лепшых кніг свету».

Што датычыцца планаў самога мастака, то, як расказаў Андрэй Смаляк, яго ўжо на працягу чатырох месяцаў чакаюць з выставай у Таліне. Акрамя таго, запланавана экспазіцыя ў Нацыянальным мастацкім музеі. А яшчэ крыху пазней чакаецца бенефіс Смаляка ў.... цырку. Прычым у праграме возьмуць удзел многія вядомыя людзі Беларусі, якія прадставяць гледачам вобразы з карцін мастака, «ажывяць» іх. А чаму не? Карціны Смаляка — гэта заўжды шоу. А шоу ніколі не заканчваецца...

Вікторыя ЦЕЛЯШУК.

Дзве даты

19 студзеня

1867 год — па ініцыятыве інспектара Мінскай урачэбнай управы Н.К. Берга заснавана Таварыства мінскіх урачоў. Яго члены займаліся вывучэннем санітарнага стану губерні, зборам розных матэрыялаў аб захваральнасці і смяротнасці насельніцтва, высвятленнем прычыны распаўсюджвання розных хвароб, арганізацыяй санітарнага нагляду, навуковай працай. У 1879 годзе таварыства адкрыла бясплатную лячэбніцу для бедных, першую гарадскую амбулаторыю, гарадскую інфекцыйную бальніцу, дзякуючы яго намаганням у горадзе быў заснаваны штат думскіх урачоў. Таварыства выдавала газету «Минские врачебные известия».

1918 год — матрос Анатоль Рыгоравіч Жалезнякоў (больш вядомы як Жалязняк), з'яўляючыся начальнікам варты Таўрычаскага палаца, прапанаваў дэпутатам Устаноўчага сходу пакінуць палац: «Каравул устал!».

Цытата дня

«Калі хочаш быць задаволены лёсам, не глядзі на тых, у каго становішча лепшае — глядзі на тых, у каго становішча горшае, чым тваё».

Унсур аль-Маалі (1021—1098), персідскі пісьменнік.

Уважаемые акционеры ОАО «Паритетбанк»

Наблюдательный Совет ОАО «Паритетбанк» в соответствии со ст. 11 Устава Банка извещает о проведении 5 февраля 2007 года внеочередного Общего собрания акционеров банка в заочной форме методом опроса с повесткой дня:

1. Об избрании счетной комиссии.
2. Об утверждении результатов проведения подписки на акции ОАО «Паритетбанк».
3. Об утверждении Решения о выпуске акций.
4. Об утверждении изменения размера уставного фонда и изменений в Устав ОАО «Паритетбанк».

Внеочередное Общее собрание акционеров проводится по адресу: г. Минск, ул. Гамарника, 9/4, комн. 401.

Бюллетени для голосования и другие материалы к собранию могут быть получены по указанному адресу 31 января 2007 года с 9.00 до 17.00, тел. (017) 288-49-43.

Заполненные бюллетени должны быть возвращены не позднее 2 февраля 2007 года по месту их получения.

Дата подсчета голосов — 5 февраля 2007 года.

КУП «МИНСКИЙ ОБЛАСТНОЙ ЦЕНТР УЧЕТА НЕДВИЖИМОСТИ»

ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН

по продаже обращенного в доход государства здания свинарника-откормочника общей пл. 1368,7 кв.м, расположенного по адресу: Пуховичский район, д.Габриелевка. Начальная цена – 74 416 000 рублей. Задаток в размере 10% от начальной цены перечисляется на р/с 30120202000010 Октябрьское отделение ОАО «Белпромстройбанк», г. Минск, МФО 153001357, УНП 690324015, КУП «Минский областной центр учета недвижимости». Объект продается без условий. Переход права пользования земельным участком будет осуществлен по решению райисполкома на основании заявления победителя аукциона. Оплата за объект должна быть произведена в течение 2 (двух) месяцев и 25 (двадцати пяти) дней со дня подписания протокола о результатах аукциона. Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения. Аукцион состоится 19 февраля 2007 г. в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, ком. 321. Заявление на участие и необходимые документы принимаются по 16 февраля 2007 г. до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, ком. 322.

Контактный телефон (8-017) 224-61-34.
Наш сайт в Интернете: www.rlt.by

КУП «Минский областной центр учета недвижимости»

ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН по продаже (цены с НДС): кран козловой (МККС — 12,5) — 31 924 000 бел. руб.; панель ЩО70 — 2 656 000 бел. руб; вентиляция ВЦП — 800 000 бел. руб; циклон 1000 — 318 000 бел. руб; станок брусовочный (ГАБИ 042 135 001) — 4 180 000 бел. руб; станок многопильный (DMAS — 170) — 7 945 000 бел. руб. Подробное извещение опубликовано в газете «Звязда» от 23.09.2006 г. Порядок проведения аукциона оговорен в условиях проведения аукциона. Аукцион состоится 22.02.2007 г. в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, ком. 321. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по 21.02.2007 г. до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, ком. 322.

Контактный телефон: (8-017) 224-61-34. Наш сайт в Интернете: www.rlt.by

Простая мова

СІЛА ЖЫЦЦЯ

ЗАМЕСТ ЭПІГРАФА.

Знаёмы неяк у Польшчы быў. У сваякоў. Толькі прыехаў, селі за стол, — радзінку яго як віхрам знесла: па тэлевізіі (справа ўвесну была) перадалі, што ноччу — замаразкі. Вось і рушылі ўсе — грады накрываць...

Чым госця — ну вельмі здзівілі! Ён жа як думаў? Па-нашаму. А значыць — віламі пісана: халадоў тых, па-першае, можа і не быць (наогул! Сіноптыкі ж часта памыляюцца)... Па-другое, яны (маразы ў сэнсе) могуць паціснуць, але недзе не тут (краіна вялікая), альбо не моцна...

Іншымі словамі — у крыві ў нас спадзявацца на лепшае. Прычым настолькі, што многія, крый Бог, і дроў нарыхтоўваць болей не стануць: а што — зімы ж, як высвятляецца, можа і не быць? (Па аналогіі — альбо не тут. Ці вельмі лёгкая...)

Што рабіць, як надзеі на гэта не спраўдзяцца? А тады і пабачым. Як пісаў адзін з калег:

Калі певень нешта раніць,
Беларус — запартызаніць.
Калі не — гары ўсё гарам.
Чарка ё, а бульбы — зварым.

ДЗЕ ГУКНЕШ... І ДЗЕ АДГУКНЕЦЦА

З жонкай Федзю пашчасціла: мала таго, што кахаў без памяці і каханым быў, — бабуля ёй жытло пакінула. Асобнае, добрае. Адно — высакавата, на дзевятым паверсе... Так што ён спачатку — у лоджыю выйсці баяўся — галава з непрывычкі кружылася. «Не, — казаў, — гэта не маё... На шыбеніцы жыць...» «А куды ты дзенешся?» — уздыхалі яго суразмоўцы. — Падводная лодка... Ты ж ведаеш, як у Мінску з жыллём».

Ён ведаў. І таму — будаўніцтва асобнага ўласнага дома распачаў **пад** Мінскам.

Тыднямі не бачыў сям'ю, гадоў з дзесяць не быў у водпуску, набраў крэдытаў, па вушы ўлез у даўгі, але прасвет-такі бачыў — ці нават святло (у канцы тунэля) — гатовы дом. Засталося (лічыце) падвесці газ, перавезці сям'ю, прадаць кватэру «на шыбеніцы», аддаць даўгі, купіць новую мэблю, машыну і потым, нарэшце, зажыць...

Газ (як знарок) падключыў 27 снежня.

31-га — напіцца хацеў. І не мог... Пакуль па экрану не пабег радок, што перамовы ў Маскве завершаны, што дамоўленасць па газу ёсць.

ХТО РЫЗЫКУЕ...

— Э-э, мужык, трэцім будзеш? — з-пад палы дэманструючы «фауст», папыталіся двое, і Сцяпанавіч — ледзь не згадзіўся: мужыкі ж як мужыкі, не п'янтосы... Як ён.

У апошняе імгненне «тармазнуў» — «мазгі ўключыліся»: падумаў, што на траіх — ім адной бутэлькі яўна не хопіць. Па другую, ну, канешне ж, павядуць яго. І грошы ёсць, не бяда. Але іх, мякка кажучы, мнагавата (палучку атрымаў). Значыць, на гэтым яны не спыняцца. А на чым? Ды хто яго ведае: можа — паб'юць, можа абяруць, ды і сам ён па п'янцы...

— Не, — сказаў, — браткі, выбачайце, але я не магу. З бальніцы во іду: язва, ліха на яе... Рэчы? Ды жонка з сынам забралі. І грошай не пакінулі...

Мужыкі хоцькі-няхоцькі саступілі з дарогі, далі прайсці.

Але супакоіўся ён толькі тады, калі трохі адышоўся і ўбачыў (азірнуўшыся), што «рыбалка завяршаецца»: «фауст» той паказалі іншаму, ён «клюнуў»: а-а, маўляў, хто не рызыкуе, той не п'е...

Хто п'е — а тым больш вось так — рызыкуе болей.

УРОК

Вечар. Тралейбус. На гэты раз — поўны. Дзве цёткі побач. Гамоняць... І «ні пра што» ж, як быццам, але досыць гучна. Настолькі — што думаць пра нешта сваё ўжо немагчыма — слухаеш.

— Дык во... Падыходзіць ён, — распавядае адна (уся ў вязаным — шапцы, шаліку, паліто), — А ўжо малады, расфуфыраны, важны... Кажа, каб я прапусціла. А як гэта я — прапушчу? «Дакументы, — пытаюся, — ёсць?» «Няма». «Ну, тады выбачай...». А ён мне: «Як? Вы каму адмаўляеце?! Вы ведаеце, чый я сын?!.» «Не, не ведаю, — кажу. — І ведаць не хачу: дочкі мае ўжо замужам. Зяцямі — я задаволена, так што твае бацькі мне ўжо нецікавыя... Да таго ж — каб ты сам якім артыстам быў ці мэрам горада, каб цябе па тэлевізары кожны дзень паказвалі, можа б я і прапусціла. А бацькавы заслугі тут ні пры чым. У сям'і ж не без калек... Дык, мо, ты — той калека і ёсць?» Ён як зашуміць... На ўвесь вестыбюль: «Вы што сабе дазваляеце? Я да начальства зараз пайду, я пазваню!..» І пайшоў... Каму ён там званіў, што казаў, не ведаю. Ды хвілін праз дваццаць — з'яўляецца. І, ведаеш, як падмяніў яго хто — ціхі ўжо, вінаваты. Кажа: «Прабачце, калі ласка... Вы мне далі гэткі ўрок... Я зразумеў, што трэба не з бацькавым імем насіцца, а сваё здабываць. Вось убачыце — я гэта зраблю. І тады — прыду да вас яшчэ раз, і вы мяне — адразу прапусціце»...

— Ну бабуля... Ну, трындзіць, ну залівае! — закаціў вочы хлопец, што стаяў паблізу.

Людзі ж старэйшыя, што побач сядзелі, згодна пераглядаліся, ківалі і былі ўпэўненыя, што менавіта так усё і было.

НАХАБСТВА — ДРУГОЕ ШЧАСЦЕ

Па-рознаму складаюцца людскія лёсы, — любілі некалі пісаць журналісты. Вось Таня з Ленай... Вучыліся ў адной ВНУ, жылі — у адным інтэрнаце і нават пакоі. Замуж пайшлі на адным трэцім курсе. За такіх жа хлопцаў-студэнтаў. А вось далей...

Размеркаванне было. І ў першай, у хуткасці — высокааплатная работа, свой дом у райцэнтры, мэбля, машына, дзеці. У другой жа — нічога: закуткі на здымных кватэрах.

Каб «падняцца» — хоць трохі — яна фірму рашыла адкрыць. У сяброўкі (той самай) тры тысячы баксаў пазычыла (па тым часе — вялікія грошы!)...

Але і яны чамусьці прыбыткаў не неслі.

А даўгі аддаваць ужо трэба.

...Спачатку яна клялася-бажылася, што іх, канешне ж, аддасць — не сёння дык заўтра, потым — стала хавацца. А калі «адшукалі» — смела глядзела ў вочы былой сяброўкі і пытала ў яе:

— Слухай... А нашто табе — грошы? У цябе ж усё ёсць.

І тая тады чырванела — ёй было соромна. За сваё нахабства.

БЕЗ ШАПКІ

...На юбілей запрасілі. У кафэ. Доўга думала: што падарыць, што апрануць, доўга глядзела ў шафу. Выцягнула адно, прымерала — «ну, колькі можна?..», выцягнула другое — яшчэ горш, трэцяе — таксама...

Стоячы перад люстэркам, нядобрым словам успомніла любімыя айчынныя фірмы, якія «пад сезон» заўжды нешта шылі... Потым — наш гандаль, што прадукцыю іх, відаць, не давёз... Потым, разумела ж, сябе, бо трэба, трэба хоць зрэдку збочваць, хадзіць па магазінах, а то на працу, па справах, дамоў...

Пакуль, разважаючы гэтак, снавала паміж шафай — люстэркам, пазваніў знаёмец — а ўжо добры, даўні... З камплімэнтамі, з віншаваннямі, з заўсёдным, шчырым: «Калі ласка, званіце мне. Можа, будуць праблемы...».

...Была. Адна (чыста жаночая). Хвільку назад. І... знікла. Бо ўвачавідкі ўбачыла, што да шчасліва твару пасуе ўсё. Нават старая сукенка...

(Што прыказкай: «Усмешка ўпрыгожвае больш, чым новая шапка».

...І чаму мы тады «працуем» на другое?)

ЁСЦЬ ПЫТАННЕ

Ролю здабытчыка ў гэтай сямейцы выконвае муж. Ён, у асноўным, зарабляе грошы, ён жа ходзіць на рынак. Жонка толькі спіс падае — што трэба купіць.

У тую суботу (апроч іншага) у ім красавалася: «Тры селядцы. Прыгожыя».

Па іх (ведама ж: цякуць...) ён падаўся нарэшце, калі іншае ўсё купіў. Сказаў прадавачцы, колькі. Потым (жончын загад) — якіх...

Тая хмыкнула: «Вам з імі цалавацца, ці што?». Але паслухала: з бочкі, за хвост, выцягнула першага, агледзела сама, пакасала яму — маўляў, прыгожы, узважваць?

— Так, — пагадзіўся ён.

— А гэты?

— У гэтага вока крыху мутнавата... Але давайце.

— А гэты?

— Не-а...

— Чаму?

— У яго хвост пашкоджаны?

— А вы што яго — есці будзеце? Пры чым тут хвост?

— Як пры чым? — цяжка ўздыхнуў мужчына. — Непрыгожа ж... Дамоў прынясу, а жонка мне гэтым хвастом... Яшчэ і назад адправіць... Каб памяняў.

Прадавачка са шкадобай паглядзела на яго. Сказала:

— Калі адправіць, — прыходзьце.

І ціха дадала:

— Прыму

Заснавальнікі — установа «Рэдакцыя газеты «Звязда» і грамадскае аб'яднанне «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі».
Рэгістрацыйны № 12.

19
СТУДЗЕНЯ
2007 г.
ПЯТНІЦА
№ 3 (15454)

ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА

Журфак хутка пераедзе

Новы вучэбны корпус БДУ на Кальварыйскай, у якім размесціцца шэраг гуманітарных факультэтаў, будзе адкрыты ў канцы снежня 2007 года, паведаміў рэктар універсітэта прафесар Васіль СТРАЖАЎ.

Паводле яго слоў, будынак на Кальварыйскай уключаны ў лік галоўных аб'ектаў гэтага года. На сёння будаўнічыя работы ў асноўным завершаны, засталося толькі размясціць абсталяванне і прывесці корпус у належны выгляд.

Адкрыццё будынка прымеркавана да пачатку новага семестра 2008 года. Плануецца, што ў корпусе размесцяцца факультэт журналістыкі, факультэт філасофіі і сацыяльных навук. Выкладчыкі і студэнты атрымаюць не толькі прасторныя аўдыторыі, але і ўласны выдавецкі цэнтр, тэлестудыю, кафэ, бібліятэку, актавыя і канферэнц-залу, навейшую тэхніку.

Акрамя таго, рэктар адзначыў, што ў пачатку 2008 года будзе ўведзены ў эксплуатацыю корпус факультэта міжнародных адносінаў. Пашырэнне вучэбных плошчаў дасць магчымасць БДУ павялічыць набор студэнтаў для вучобы на гэтых факультэтах, сказаў Васіль Стражаў.

Надзея РАДЗІВОН, БЕЛТА.

Моладзь ідзе ў дэпутаты

Як паказалі вынікі праведзенага ў мінулую нядзелю галасавання, дэпутатамі ў мясцовыя Саветы розных узроўняў сталі 1465 членаў Беларускага рэспубліканскага саюза моладзі.

Паводле слоў першага сакратара ЦК БРСМ Леаніда Кавалёва, у склад абласных і Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў увайшлі 17 чалавек, у раённыя — 358, у гарадскія — 44, у пасялковыя і сельскія — 1046. У акруговых выбарчых камісіях працавалі 338 членаў Саюза, у якасці назіральнікаў у камісіі па выбарах у мясцовыя Саветы былі накіраваны 5989 чалавек. Ва ўчастковых выбарчых камісіях былі задзейнічаны 3504 члены БРСМ, у тэрытарыяльных — 481.

Усяго ў кампаніі ўзялі ўдзел 11 777 актывістаў БРСМ. Каля 50 000 маладых людзей паўдзельнічалі ў акцыі-марафоне «Моладзь выбірае!», праведзенай напярэдадні выбараў. Яе асноўнай мэтай, як адзначыў Леанід Кавалёў, было фарміраванне ў маладога пакалення пазітыўнага стаўлення да працэсаў, якія адбываюцца ў галіне сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны, рэалізацыі дзяржаўнай маладзёжнай палітыкі.

Іна АРЭХАВА.

У гасцях — перамаглі

Хакеісты Гродзенскай СДЮШАР-10, 1995 года нараджэння, якіх трэніруюць Дзмітрый Станавой і Анатоль Паліцынскі, у выдатным настроі вярнуліся дамоў з горада Судагда Уладзімірскай вобласці. З граматамі і медалямі, канькамі і клюшкамі ў якасці прызоў.

Нашы землякі ўпершыню ўдзельнічалі ў традыцыйным Усерасійскім турніры юных хакеістаў памяці Аляксандра Рагуліна і першы блін, як кажуць, зусім не аказаўся камяком. Гродзенцы дастойна глядзеліся ў кампаніі сваіх равеснікаў з Архангельска, Варкуты, Уладзіміра, Судагды, Варонежа і іншых расійскіх рэгіёнаў і занялі другое месца пры трох перамогах і адным пройгрышы. Яны ўдзячныя расіянам за цеплую сустрэчу і цудоўна арганізаваны турнір, а хакейнаму клубу «Нёман» — за прадастаўлены аўтобус.

Барыс ПРАКОПЧЫК.

Дапамогу аказвае... бібліятэка

На базе Лельчыцкай раённай бібліятэкі створаны кансультацыйны цэнтр па праблемах адукацыі і прафарыентацыі «Разам будзем думаць пра будучае».

Як паведаміла загадчыца бібліятэкі Раіса Ліпская, ідэя стварэння такога цэнтра належыць супрацоўнікам гэтай установы культуры. Асноўная мэта яго работы — аказанне бясплатнай кансультацыйнай дапамогі будучым абітурыентам пры выбары прафесіі. У рамках работы цэнтра для старшакласнікаў агульнаадукацыйных школ раёна арганізуюцца сустрэчы з людзьмі розных прафесій — спецыялістамі лесагаспадарчай галіны, педагагічнымі работнікамі, медыкамі. Хлопцы і дзяўчаты могуць атрымаць цікавую інфармацыю аб умовах і правілах паступлення ў тую або іншую ВНУ, аб запатрабаваных прафесіях.

Дзякуючы рабоце кансультацыйнага цэнтра многія старшакласнікі маюць магчымасць загадзя сур'ёзна і свядома падысці да выбару будучай прафесіі, апіраючыся на падрабязную інфармацыю і дакладную ацэнку сваіх здольнасцяяў.

Таццяна ШУР, БЕЛТА.

Твае правы

ПЕРШЫ ГОД УМОВЫ НЕ ЗМЯНЯЮЦЦА

Не сакрэт, што стаўленне да размеркавання бывае даволі розным. Хтосьці перакананы, што ў стане знайсці сабе цікавую і высокааплатную працу самастойна, а таму імкнецца пазбегнуць двухгадовай «адпрацоўкі» ўсімі магчымымі сродкамі і спосабамі. А хтосьці (асабліва сярод уладальнікаў дыпломаў па не самых запатрабаваных на рынку працы спецыяльнасцях) наадварот, лічыць накіраванне на работу ці не адзіным шанцам для пачатку кар'еры. Словам, нейкай адзінай думкі тут па-ранейшаму няма. І тым не менш факт застаецца фактам — сёння працаваць па размеркаванню пачынае абсалютная большасць выпускнікоў бюджэтных аддзяленняў. Прычым у такой сітуацыі маладыя спецыялісты маюць не толькі абавязкі, але і пэўныя правы. І аб іх — наша гутарка з начальнікам галоўнага ўпраўлення вытворчай і сацыяльна-эканамічнай работы Савета Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі Сяргеем Адамавічам САРОКІНЫМ.

«ІЛЬГОТЫ» СЕМ'ЯМ. І НЕ ТОЛЬКІ

Няма сумненняў, што традыцыйна самае папулярнае пытанне — ільготы і перавагі пры размеркаванні. Хто са студэнтаў ці навучэнцаў бюджэтных аддзяленняў можа карыстацца імі зараз?

— У першую чаргу льготамі карыстаюцца інваліды I і II груп, якім прадастаўляецца работа з улікам стану здароўя па пастаянным месцы жыхарства бацькоў, ці, у выпадку стварэння сям'і, — па месцы жыхарства мужа або жонкі, — тлумачыць Сяргей Сарокін. — Такое ж правіла дзейнічае і ў адносінах да іншых сем'яў — муж накіроўваецца да жонкі або жонка да мужа ў адзін населены пункт. А калі адзін з прадстаўнікоў шлюбнай пары закончыў ВНУ раней і ўжо размеркаваны, то пры накіраванні на работу другога гэты факт улічваецца ў абавязковым парадку — тут зноў-такі дзейнічае прынцып аднаго населенага пункта.

Апроч таго, вызначаны льготы (накіраванне па месцы пастаяннага жыхарства сям'і) для цяжарных жанчын і маці з дзецьмі ва ўзросце да 3 гадоў. У рэшце рэшт, нельга забывацца — перавагі падчас размеркавання маюць выдатнікі і пераможцы прэстыжных конкурсаў.

«ПАД'ЁМНЫЯ». У ВЫПАДКУ ПЕРАЕЗДУ

Асноўная і ці не галоўная гарантыя для выпускніка бюджэтнага аддзялення — безумоўна, працоўнае месца. І, заўважым, што паведаміць аб размеркаванні ў навучальнай установе павінны загадзя — не пазней чым за два месяцы да яе заканчэння.

Адначасова малады спецыяліст мае права на шэраг дадатковых «стымулаў». Так, у выпадку размеркавання пасля заканчэння навучальнай установы яшчэ да пачатку работы прадастаўляецца водпуск працягласцю ў 30 дзён з аплатай у памеры месячнай стыпендыі. А калі гаворка ідзе аб педагагічных работніках, то працягласць такога водпуску складае 45 дзён, і, адпаведна, аплата — паўтары месячныя стыпендыі. Прычым калі па тых ці іншых прычынах выпускнік стыпендыі не атрымліваў, то выплаты робяцца выходзячы са стыпендыі сацыяльнай.

— Апроч таго, калі навучальную ўстанову заканчваюць дзеці-сіроты ці дзеці без бацькоў, то ім выдзяляецца бясплатна адзенне, мяккі інвентар і дадатковая грашовая дапамога, — працягвае Сяргей Сарокін. — А калі выпускнік размяркоўваецца ў іншую мясцовасць, то яму, а таксама членам яго сям'і, кампенсуюцца выдаткі па праезду, перавозу маёмасці, выплачваюцца «сутачныя», а таксама так званыя «пад'ёмныя» — аднаразовая дапамога ў памеры аднаго месячнага акладу.

Пры гэтым нялішне адзначыць, што непрадастаўленне гарантый не з'яўляецца падставай для скасавання дагавору аб размеркаванні. А вось адстойваць у такіх варунках свае правы — поўнае права маладога спецыяліста. Да прыкладу, тут ёсць варыянт звароту па дапамогу да мясцовых органаў улады. Або другі варыянт — звароту ў суд.

І яшчэ. Цяперашняе заканадаўства не ўтрымлівае ніякіх нормаў, якія б гарантавалі маладому спецыялісту забеспячэнне жыллём ці выплату кампенсацый па яго найму. Разам з тым гэтыя пытанні могуць быць вырашаны праз новага наймальніка ці мясцовую ўладу. І зноў-такі на месцы варта пацікавіцца наконт іншага — магчымасці атрымання крэдытаў на будаўніцтва ці набыццё жылля, куплі мэблі ці бытавой тэхнікі.

КАНТРАКТЫ З ВЫКЛЮЧЭННЯМІ

У выпадку размеркавання былы выпускнік прымаецца на бестэрміновы дагавор або на кантракт. Прычым тэрмін дзеяння апошняга не можа складаць менш за 2 гады. Ці азначае гэта, што ўвесь гэты час малады спецыяліст будзе працаваць на адной і той жа пасадзе і мець аднолькавую тарыфную стаўку?

— Паводле тлумачэння Канстытуцыйнага Суда, на працягу першага года работы маладыя спецыялісты, што працуюць па размеркаванню, не могуць праходзіць атэстацыю, — падкрэслівае Сяргей Сарокін. — Інакш кажучы, на працягу першага года ўмовы кантракта могуць паляпшацца, аднак ні ў якім разе не пагаршацца. Што ж да другога года работы, тут сітуацыя адрозніваецца. Калі наймальнік вырашыць правесці атэстацыю і падчас яе камісія прыйдзе да высновы, што малады спецыяліст не адпавядае сваёй пасадзе, можа адбыцца паніжэнне. Аднак без змены профілю прафесіі і спецыяльнасці.

Пры гэтым варта заўважыць, што вызначаны шэраг умоў, калі наймальнік можа скасаваць датэрміновы кантракт па сваёй ініцыятыве. Па-першае, гэта можа адбыцца ў выніку ліквідацыі арганізацыі. Па-другое, у выпадку скарачэння штатаў. Аднак у такой сітуацыі адміністрацыя абавязана прыкласці ўсе намаганні, каб прапанаваць іншую, звязаную са спецыяльнасцю, пасаду.

(Заканчэнне на 2-й стар. «ЧЗ».)

Фота Аляксандра ХІТРОВА.

У Віцебскім раёне адкрыты новы аграгарадок «Копці», на стварэнне якога было выкарыстана 5,5 млрд рублёў. Тут створаны ўсе ўмовы для работы і адпачынку вяскоўцаў, нездарма ўсё больш моладзі застаецца працаваць у родных мясцінах.

НА ЗДЫМКУ: майстар мастацкай керамікі цэнтра народных рамёслаў Караліна ВІШНЯК са сваімі вырабамі.

Фота БЕЛТА.

У гродзенскім абласным ваенным камісарыяце адбылася ўрачыстая адпраўка прызыўнікоў 2007 года да месцаў нясення службы. Каля 70 працэнтаў прызыўнікоў будуць служыць у часцях, размешчаных на тэрыторыі вобласці.

«А ТЫ СПЫТАЙ У СВАЙГО ХЛОПЦА, ЧАМУ ЁН НЕ ПАЙШОЎ У АРМІЮ?.. »

15 студзеня пачалася адпраўка прызыўнікоў да месца нясення службы. Толькі за адзін дзень, у панядзелак, каля тысячы хлопцаў былі накіраваны ў вайсковыя часці Беларусі. Зімовая прызыўная кампанія завяршаецца — да канца студзеня ў казармы на месцы звольненых у запас былых салдатаў «тэрміновай» прыйдуць каля 10 000 новых абаронцаў краіны.

Абавязак праходзіць воінскую службу, як расказаў кіраўнік усіх прызыўных кампаній, начальнік арганізацыйна-мабілізацыйнага ўпраўлення Генеральнага штаба Узброеных Сіл — намеснік начальніка Генштаба генерал-маёр Ігар Глод, неабходна захоўваць у кожнай дзяржаве. «Некаторыя краіны, у якіх армія цалкам складаецца з кантрактнікаў, наёмных салдатаў, ужо ўсвядомілі неабходнасць прызыву на службу сваіх грамадзян», — лічыць ён. І падкрэслівае, што «беларускай арміі зараз патрэбны разумныя, надзейныя хлопцы, якія ў стане выканаць і вучэбную задачу, і асабліва баявую, і мы праводзім адбор лепшых для нясення службы. На сучасным этапе, калі рэфармаванне арміі ўжо праведзена, мы працуем над якасцю камплектавання нашага войска».

І тым не менш, ужо некалькі гадоў запар кантрактнікаў у нашай арміі становіцца ўсё больш. Паводле папярэдніх падлікаў, да 2010 года іх колькасць дасягне 50 працэнтаў ад усіх вайскоўцаў. Сёння беларуская армія на 23 працэнты сфарміравана з кантрактнікаў. Гэтыя ваеннаслужачыя маюць магчымасць прайсці школу прапаршчыкаў і атрымаць званне. Калі служыш на кантракце старанна, можна трапіць і ў Ваенную акадэмію, пасля якой даюцца афіцэрскія пагоны. Аднак гэта не значыць, што ад тэрміновай службы збіраюцца адмовіцца — выконваць канстытуцыйны абавязак нашы хлопцы будуць як і раней. «На кантракт бяруць прафесіяналаў па спецыяльнасці, у якой зацікаўлена тая ці іншая вайсковая часць. Напрыклад, вадзіцелі аўтамабіляў, амаль усе, не служаць у войску, а працуюць у ім, за выключэннем тых выпадкаў, дзе салдата вучаць кіраваць ваеннай машынай. Цікава, што і кухараў сярод вайскоўцаў, якія праходзяць тэрміновую службу, таксама ўжо не сустрэнеш, зараз у ваенных часцях ежу гатуюць былыя «цывільныя». Ёсць нават і часці, дзе служаць адны толькі кантрактнікі. Аднак існуюць і фарміраванні, дзе замест кантрактнікаў набіраюць маладых салдат. Зноў жа, усё гэта робіцца згодна з прынцыпам удасканалення сістэмы дзейнасці беларускай арміі, поўнага і якаснага яе фарміравання.

Такім чынам, служыць у арміі трэба, і ад гэтага не адмовішся. Вайсковая спецыяльнасць, дарэчы, зноў стала папулярнай і запатрабаванай. І не толькі ў грамадстве. Ігар Глод мяркуе, што вайскоўцам быць прэстыжна па любых падліках:

— Я жадаю, каб кожная дзяўчына пацікавілася ў свайго хлопца: як здарылася, што ён застаўся дома, тады як павінен быў па ўсіх аб'ектыўных абставінах пайсці служыць. На самай справе, з усёй сур'ёзнасцю звяртаюся да маладых прадстаўніц слабога полу. Спытайце ў сваёй моцнай паловы: «А чаму ты не ў арміі?». І паслухайце, што ваш выбраннік адкажа: не хачу... не магу... нешта не дазваляе... Вынікі зрабіце самастойна.

Пасля таго, як у 2005 годзе былі ўведзены папраўкі ў заканадаўства, юнакі пачалі прыцягвацца да крымінальнай адказнасці за ўхіленні ад нясення тэрміновай службы. У летні прызыў мінулага года ваенныя камісарыяты накіравалі хадайніцтвы ў пракуратуры аб прыцягненні да адказнасці больш чым 8 тысяч юнакоў. Выяўлены склад злачынства, і, адпаведна, вызначана крымінальная адказнасць толькі ў 206 выпадках. Разам з тым вялікая колькасць хадайніцтваў паступіла з-за таго, што некаторыя юнакі з недастатковай увагай ставяцца да пытання выканання ваеннага абавязку. У прыватнасці, беларускія хлопцы, якія вучацца або працуюць за межамі нашай краіны, павінны стаць на ўлік у беларускіх дыпламатычных прадстаўніцтвах у той ці іншай дзяржаве. У адваротным выпадку фіксуецца парушэнне закона. Адхіленнем ад нормы закона лічыцца і няяўка па павестцы, адмова ад удзелу ў прызыўной рабоце.

Да слова, у размове з некаторымі хлопцамі прызыўнога ўзросту журналісту «Звязды» даводзілася чуць наконт службы ў арміі рознае. Ёсць сярод меркаванняў і такія думкі, як «ад службы буду «касіць», а калі не атрымаецца — усё роўна не пайду ў войска. Калі прычэпяцца, заплачу штраф, і тады мая праблема знікне». Ігар Глод адказвае такім «разумнікам»:

— Крымінальнае пакаранне — гэта занадта вялікі кошт за тое, каб не ісці ў армію. Канешне, з цягам часу яно гасіцца, існуюць і іншыя заканадаўчыя правілы выпраўлення ўласнай «рэпутацыі», але след ад гэтага правапарушэння застанецца назаўсёды, і адбіваецца і на кар'еры, і на ўсім жыцці чалавека, нават калі юнак толькі пасядзіць на лаве падсудных і адкараскаецца штрафам. А ўвогуле, я лічу што несур'ёзна і вельмі неразумна ісці на лаву падсудных з-за таго, што не жадаеш служыць.

Перад самым надыходам Новага года, 31 снежня, кіраўнік дзяржавы падпісаў указ, у якім адтэрміноўка на гэты год была прадастаўлена чатыромстам васьмідзесяці аднаму юнаку. Маладыя людзі працуюць у сельскіх раёнах, забруджаных пасля аварыі на Чарнобыльскай АЭС, настаўнікамі, механізатарамі, спецыялістамі сельскай гаспадаркі, таму дзяржаве яны прынясуць больш карысці, калі застануцца «на грамадзянцы». Пытанне адтэрміновак увогуле зараз будзе вырашацца больш гібка, і з улікам перш за ўсё інтарэсаў прызыўніка. Акрамя службы ў арміі, малады чалавек адказны і за выкананне іншых сацыяльных задач, якія таксама карысныя для грамадства і яго асабіста. І перашкаджаць у дасягненні жыццёвых мэтаў ніхто не збіраецца. Таму, як паведаміў Ігар Глод, падрыхтаваны законапраект, згодна з якім плануецца прадаставіць адтэрміноўкі для новых катэгорый прызыўнікоў:

— Выпускнікам сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў трэба даць магчымасць працягнуць адукацыю. Былым студэнтам, якія трапілі ў аспірантуру, дактарантуру, таксама трэба адтэрміноўка для заканчэння навучання. Мы прадугледзелі магчымасць і для маладых сем'яў, якія чакаюць нараджэння дзіцяці. Зараз адтэрміноўка даецца толькі маладому бацьку, які ўжо мае нованароджанага. Калі ж жонка прызыўніка была цяжарнай, ён усё роўна трапляў ва Узброеныя Сілы, і потым датэрмінова звальняўся ў запас у сувязі з нараджэннем дзіцяці. У выніку дзяржава выдаткоўвала сродкі і для прызыву, а потым яшчэ і для звальнення чалавека ў запас. У выпадку прыняцця законапраекта прызыўніку дастаткова будзе прадставіць прызыўной камісіі даведку аб цяжарнасці жонкі, і ён атрымае адтэрміноўку, да дасягнення дзіцем трохгадовага ўзросту.

У выпадку, калі з законапраекта дакумент ператворыцца ў закон, адтэрміноўка не будзе азначаць вызваленне ад вайсковай службы. Разлічана, што пасля задавальнення сваіх планаў, скажам працягу адукацыі або нараджэння дзіцяці, прызыўны ўзрост дазволіць маладому чалавеку яшчэ і ў арміі паслужыць.

Рэзервовую службу таксама чакаюць некаторыя змяненні, якія арыентаваны на ўдасканаленне якасці падрыхтоўкі байцоў. Адбіраюць на яе, як і ў мінулыя гады, у час летняга прызыву, прычым перавага аддаецца выпускнікам вышэйшых навучальных устаноў, якія якраз у першай палове цёплага сезона атрымліваюць дыплом. Колькасць месцаў для рэзервістаў у арміі застанецца без змяненняў — тры тысячы чалавек.

— Рэзервовая служба цалкам даказала сваю карысць і мэтанакіраванасць. У 2004 годзе мы прызвалі ў рэзерв толькі 820 чалавек, і ўжо на наступны раз пашырылі набор да трох тысяч. 790 «першых» прызыўнікоў ужо скончылі службу і займаюцца асноўным родам дзейнасці. Зараз службу ў рэзерве працягваюць праходзіць 6 тысяч хлапцоў, — расказаў Ігар Глод.

Дзмітрый АЛЬФЕР.

«ЦЭНТРАЛЬНЫ» СТАНЕ САПРАЎДЫ ЦЭНТРАЛЬНЫМ

Стары будынак сталічнага аўтавакзала хутка знікне

Сёлета ў сталіцы павінны пачаць узвядзенне новага будынка «Цэнтральнага» — галоўнага аўтобуснага вакзала. Памяшканне, якое ёсць зараз, будзе знесена, замест яго з'явіцца сучасны шматузроўневы комплекс.

Месца знаходжання новага вакзала не зменіцца, аўтобусы будуць адпраўляцца прыблізна з той жа тэрыторыі. Нават пасажырскіх платформаў пакінуць столькі ж — чатырнаццаць. Аднак, напэўна, гэта адзінае, што застанецца ў памяці ад старога «Цэнтральнага». У астатнім новы будынак будзе значна больш камфортным і зручным, і не толькі для людзей, якія карыстаюцца аўтобуснымі рэйсамі. Нават часовая стаянка аўтобусаў, пасажырскія пероны прыбыцця і адпраўлення ўпершыню у гісторыі будуць знаходзіцца не ля вакзала, а непасрэдна пад «Цэнтральным». Для гэтага будынак пры дапамозе калон прыўзнімуць, і на ўзроўні зямлі ў цэнтры размесцяць пасажырскія платформы.

— Участак, на якім традыцыйна знаходзіўся сталічны аўтобусны вакзал вельмі своеасаблівай формы. Гэта стары «кавалак» горада, і мы хацелі б, каб новы будынак лагічна ўпісваўся ў архітэктуру наваколля, працягваў фарміраванне Прывакзальнай плошчы — паведаміла **галоўны архітэктар праекта Ірына КАМЫШАН**. — Разам з тым пры стварэнні будынка ўлічаны і той факт, што раён аўтавакзала з'яўляецца шматлюдным месцам. Тут заўсёды было складана вырашыць праблему паркоўкі.

Таму на новым аўтавакзале створаць стаянку для машын. Шматузроўневы паркінг на 500 месцаў будзе ўзведзены ўздоўж чыгуначных пуцей, ззаду новага будынка. Прызначаны ён будзе не толькі для пасажыраў, але для ўсіх, хто заедзе на тэрыторыю, прылягаючую да вуліцы Бабруйскай і Прывакзальнай плошчы. З кожнага ўзроўню паркінгу можна будзе трапіць на паверхі вакзальнага комплексу.

Новы «Цэнтральны» з-за асаблівасцяў свайго месцазнаходжання па знешняму выгляду будзе вузкім, даўжыня яго складзе 256 метраў. А вось шырыня, як гэта ні дзіўна, звужаецца — з аднаго краю будынка будзе 130 метраў, з другога — ужо шэсцьдзесят. І вышыня таксама запланавана не аднолькавая — розніца паміж правым і левым бакамі вакзала складзе больш за тры метры. А яшчэ ў знешнім вобліку «Цэнтральнага» не будзе ніводнага вострага вугла! Ён нібыта ляціць, плыве над зямлёю.

— У нас і так мала сонечнага святла, таму мы жадалі, каб воблік «Цэнтральнага» ствараў пачуццё прасторы. Адсутнасць вострых вуглоў таксама задума адмысловая — калі чалавек трапіць у будынак, яму будзе прыемна, што ён не натыкаецца ў вугал сцяны, і пры перамяшчэнні псіхалагічна больш зручна ісці з месца на месца плаўна, каб позірку адчыняліся ўсё новыя, разнастайныя віды», — патлумачыла Ірына Камышан. — Абцякальны від лепш выглядае ў агульным малюнку архітэктуры забудовы раёна.

Новы «Цэнтральны» будзе створаны не толькі для пасажыраў аўтобусаў. Хутчэй за ўсё, ён запланаваны як комплекс, які выконвае не толькі функцыю вакзала, але і дзелавую, гандлёвую, забаўляльную. На першым паверсе, акрамя «пустога месца» аўтобуснага перона, размесцяцца дробныя кропкі хуткага харчавання і гандаль. Другі паверх цалкам аддадуць пад гандлёвы цэнтр, памяшканні ў якім будуць здавацца прадпрымальнікам у арэнду. Дзве трэці плошчы наступнага ўзроўню запланаваны пад офісы, і ў галоўнай частцы размесціцца вялікі рэстаран. У падвальным жа памяшканні таксама запраектаваны яшчэ адзін рэстаран — на гэты раз піўны, з більярдным пакоем. Акрамя гэтага, у «Цэнтральным» будуць працаваць яшчэ і некалькі кафэ і іншых аб'ектаў грамадскага харчавання.

Паміж паверхамі можна будзе перамяшчацца па лесвіцах, эскалатарах, а таксама на ліфтах, у тым ліку і аглядных — з празрыстым шклом. Дарэчы, прадугледжаны ў дастатковай колькасці яшчэ і грузавыя ліфты, а таксама асобныя элементы кшталту пандусаў. У вакзал можна будзе зайсці з любога боку, дзвярэй хапае. У вонкавым аздабленні выкарыстоўваюцца па плану такія ж матэрыялы, як і пры стварэнні новага будынка чыгуначнага вакзала — шкло, крыху металу, натуральны камень. Праекты двух вакзалаў адрозніваюцца паміж сабой, але між тым захавалі адзіную агульную рысу — абодва ўяўляюць узор сучаснай архітэктуры:

— Пры стварэнні аблічча «Цэнтральнага» мы не арыентаваліся на модныя, папулярныя зараз тэндэнцыі і павевы. Мы імкнёмся самі ствараць моду, увайсці ў тыя адзінкі, за якімі будуць паўтараць астатнія. Таму будынак новага вакзала сам будзе дыктаваць іншым, як трэба ствараць архітэктурныя праекты, — не без гонару расказаў мне архітэктар Іван Вінаградаў, кіраўнік аўтарскага калектыву «Творчай майстэрні архітэктара І.К. Вінаградава» (гэтая арганізацыя распрацоўвала праект комплексу). — Пра гэта мала хто ведае, але адначасова мы вырашалі і складаную задачу — вакзал трэба было спраектаваць так, каб яго фундамент і сеткі тэхнічага забеспячэння будынка, якія праходзяць пад зямлёй, не перашкаджалі будаўніцтву новых ліній метро, што плануюць у будучым праводзіць праз вуліцу Бабруйскую.

І самае галоўнае, у новым «Цэнтральным» будуць створаны ўсе ўмовы для пасажыраў — вялікая камфартабельная зала чакання з утульнымі крэсламі, якая будзе пафарбавана нават двума колерамі, пакой маці і дзіцяці, камеры захоўвання рэчаў, ліфты і санвузлы для асоб з абмежаванымі магчымасцямі, усе памяшканні будуць вялікімі, светлымі і прасторнымі. Як падагульніў Іван Вінаградаў, «будзе зменена ўсё ў бок самага лепшага».

Дарэчы, у час будаўніцтва аўтобусныя маршруты, якія раней адыходзілі ад «Цэнтральнага», будуць адпраўляцца з іншых сталічных аўтавакзалаў. Частка вуліцы Бабруйскай, магчыма, пасля пачатку работ будзе перакрыта. Ёсць меркаванні, што пасля ўзвядзення новага «Цэнтральнага» вакзал пачне абслугоўваць толькі міжнародныя рэйсы.

Дзмітрый АЛЬФЕР.

Пасля першых тыдняў работы «Сталіца» апраўдала чаканні



Фота БЕЛТА

Гандлёвы цэнтр «Сталіца» пасля двух тыдняў з моманту свайго адкрыцця дэманструе поспехі. 67 працэнтаў плошчы для гандлю таварамі ўжо размеркавана пад арэнду паміж юрыдычнымі асобамі, прыватнымі прадпрымальнікамі і фірмовымі секцыямі беларускіх вытворцаў. Разам з тым арэндны кошт памяшканняў, у залежнасці ад іх памераў (ад 17 да 1300 «квадратаў») беспрэцэдэнтна нізкі для суперсучаснага комплексу, які знаходзіцца ў самым цэнтры горада.

Ад 30 да 150 еўра за квадратны метр у месяц — у Мінску, напэўна, няма ніводнага іншага прыкладу такой мінімальнай арэнднай платы за гандлёвае месца аналагічнага ўзроўню. Карэспандэнт газеты спытаў у **Міхаіла Еўтухоўскага**, **начальніка ўпраўлення спажывецкага рынку Мінгарвыканкама,** чым гэта выклікана.

— «Сталіца» пабудавана за кошт сродкаў горада, і з'яўляецца камунальнай уласнасцю Мінскага гарвыканкама. Таму мы самі можам вызначаць кошт арэнднай платы. Нізкай мы зрабілі яе для таго, каб прыцягнуць, зацікавіць людзей у супрацоўніцтве. Дарэчы, было многа скептычных меркаванняў адносна мэтазгоднасці будаўніцтва падземнага гандлёвага цэнтра. Дык вось, хачу сказаць, што з самага яго адкрыцця мы па пяць разоў на дзень атрымліваем ад прадпрымальнікаў прапановы аб арэндзе гандлёвага месца, — кажа спецыяліст.

Дарэчы, пагадненне заключаецца тэрмінам да 10 гадоў, і размяркоўваецца плошча шляхам аўкцыёну. Выключэнне робіцца для беларускіх вытворцаў — яны могуць самі выбраць месца пад гандаль сваёй прадукцыяй. Ужо зараз некаторыя з іх атрымліваюць нядрэнны прыбытак. Напрыклад, адна секцыя гандлёвага дома «На Нямізе» прыносіць у дзень каля 4 мільёнаў. У толькі што пачаўшай работу «Сталіцы» фірменная секцыя беларускага вытворца галантарэі зарабляе ў дзень 5—6 мільёнаў. Некаторыя арганізацыі нават жадаюць адкрыць у падземным цэнтры ўжо другі свой павільён. Напрыклад, каля магазіна вядомага ў свеце брэнду, які выпускае моднае адзенне з Італіі, ужо дзесяць дзён з раніцы да вечара збіраецца чарга з 50—100 чалавек, якія жадаюць толькі ўвайсці ў гэтую гандлёвую кропку. Канешне, таму кампанія вырашыла адчыніць ужо другую сваю краму ў падземным гандлёвым цэнтры.

З іншага боку, калі проста на некалькі хвілін зайсці ў «Сталіцу», то ўсё роўна кінуцца ў вочы зачыненыя дзверы гандлёвых павільёнаў, шыльды з назвамі непрацуючых пакуль магазінаў і кафэ. І нават у дзеючых кропках харчавання, якіх налічваецца невялікая пакуль колькасць, усе столікі альбо занятыя, і трэба ісці шукаць іншыя месцы ў горадзе, альбо чарга занадта вялікая. Можа, гэта толькі адзін мінус усёй «Сталіцы».

— Гандлёвы цэнтр яшчэ толькі развіваецца, акрамя працуючых павільёнаў тут прадугледжаны рэстаран, кафэ, бары, дробныя кропкі харчавання, забаўляльны комплекс з боўлінгам і більярдам, кіна-, відэазала, салон прыгажосці, цырульня. Трэба толькі крыху пачакаць, мы ж яшчэ пачынаем «раскручвацца», — абяцае Міхаіл Еўтухоўскі. — Магу таксама сказаць, што ў «Сталіцы» ў лютым з'явіцца і харчовы магазін плошчай 700 квадратных метраў. Раней гэтага прадугледжана не было.

Кошт будаўніцтва цэнтра склаў 97 мільярдаў рублёў. Частку грошай прадставіў у крэдыт «Беларусбанк». Сродкі двух крэдытных ліній на 30,5 і 31,5 мільёна долараў пад шэсць і дзесяць працэнтаў гадавых адпаведна неабходна вярнуць у банк да 2016 года. «Дарэчы, «Беларусбанк» пайшоў нам насустрач і дазволіў адцягнуць «Сталіцы» крэдытныя выплаты. Яны пачнуцца толькі з сярэдзіны сакавіка гэтага года», — узгадвае Міхаіл Еўтухоўскі.

Таму цэнтру зараз трэба працаваць, наладжваць і арганізоўваць сваю дзейнасць найлепшым чынам, і заўсёды памятаць, што за кліента трэба змагацца. Тады і прыбытак будзе.

Настрой на працу, а гэта значыць, на задавальненне патрабаванняў спажыўца ўжо зрабіў «Сталіцу» ўзорам сучаснага падыходу да арганізацыі гандлю. У якасці доказу можна прывесці толькі адзін факт — падземны цэнтр стаў першым месцам, куды заходзяць госці з іншых гарадоў Беларусі і замежжа — нават проста на экскурсію, паназіраць. Дарэчы, пасада экскурсавода таксама прадугледжана. І не толькі экскурсавода.

— Паведамляю, што гандлёвы цэнтр запрашае на работу людзей, якія маюць спецыяльнасці сантэхнікаў, электрыкаў, рамонтнікаў і іншыя, звязаныя з тэхнічным абслугоўваннем усіх сістэм забеспячэння функцыянавання будынкаў. У нас ёсць штатны расклад, згодна з якім неабходна набраць яшчэ шмат людзей, — расказаў Міхаіл Еўтухоўскі.

Дзмітрый АЛЬФЕР.

УСІХ ГІМНАЗІСТАЎ І ЛІЦЭІСТАЎ — НА ПЯЦІДЗЁНКУ!

У 2008 годзе Беларусь ад ной з першых краін у СНД збіраецца цалкам перавесці старшую ступень агульнаадукацыйнай школы на профільнае навучанне. Але наколькі сістэма адукацыі да гэтай важнай падзеі падрыхтаваная? Як ажыццявіць прафілізацыю на базе малакамплектных сельскіх школ? Ці дастаткова ў краіне педагагічных кадраў, здольных працаваць у профільных класах, асабліва ў сельскай мясцовасці, дзе настаўнікаў увогуле не заўсёды хапае? Ці знікнуць калі-небудзь са школьнага жыцця празмерныя вучэбныя нагрузкі? Чаму сістэма цэнтралізаванага тэсціравання падвяргаецца крытыцы з боку педагогаў? Як далёка пайшла інфарматызацыя вучэбнага працэсу ў школах? Вось далёка не поўны пералік пытанняў, якія ўзніміліся ў ходзе рэспубліканскай нарады, прысвечанай стану і перспектывам развіцця сістэмы агульнай сярэдняй адукацыі нашай краіны.

Паводле слоў **намесніка міністра адукацыі Казіміра ФАРЫНО**, у адрозненне ад некаторых іншых новаўвядзенняў, якія адбываліся ў рэфармуемай школе, ідэя прафілізацыі не выклікала ў грамадстве гарачых дыскусій і пратэсту. Прычым, у яе паспяховай рэалізацыі зацікаўленыя не толькі самі ўдзельнікі адукацыйнага працэсу, але і ВНУ, сярэднія спецыяльныя і прафесійна-тэхнічныя навучальныя ўстановы, а таксама работадаўцы. Улічваючы традыцыі і назапашаны ў краіне вопыт па арганізацыі дыферэнцаванага навучання, а таксама рэальныя магчымасці агульнаадукацыйных устаноў, было вырашана ўвесці ў 11—12-х класах дзевяць профіляў: фізіка-матэматычны, хіміка-біялагічны, філалагічны (беларуская мова і літаратура, руская мова і літаратура, замежная мова), гісторыка-грамадазнаўчы, прыродазнаўча-геаграфічны, інфарматыка-матэматычны, мастацка-эстэтычны, фізкультурна-спартыўны і тэхналагічны. У Міністэрстве адукацыі спадзяюцца, што дадзены пералік зможа задаволіць усе патрэбы старшакласнікаў з улікам іх інтарэсаў, схільнасцяў і прафесійных намераў. Да таго ж не выключаецца магчымасць яго дапаўнення і канкрэтызацыі. Такім чынам прафільнае навучанне на старшай ступені стане лагічным працягам дыферэнцыяцыі і індывідуалізацыі навучання, якія з'яўляюцца ключавымі ў абнаўленні зместу і структуры рэфармуемай беларускай школы. «Мы разглядаем старшую ступень школы як асаблівую адукацыйную прастору, у рамках якой будзе адбывацца прафесійнае, сацыяльнае і грамадзянскае станаўленне маладых людзей і завершыцца фарміраванне адаптаванай да сучаснага свету асобы», — падкрэсліў Казімір Фарыно.

У эксперыментальнай апрабацыі Канцэпцыі профільнага навучання задзейнічаны па краіне 20 школ (10 гарадскіх і 10 сельскіх). У 2006 годзе з 799 навучэнцаў першага выпуску 12-годкі паступілі ў вышэйшыя і сярэднія спецыяльныя навучальныя ўстановы 550 чалавек, або 70 працэнтаў ад агульнай колькасці, а студэнтам ВНУ стаў кожны другі. Самыя лепшыя вынікі пры паступленні прадэманстравалі навучэнцы класаў фізіка-матэматычнага профілю: студэнтамі сталі 82 працэнты ад агульнай колькасці.

На сёння органамі ўпраўлення адукацыі рэалізуюцца комплексныя планы па паступоваму пераводу старшай ступені на профільнае навучанне. Ужо прайшлі эксперыментальную праверку для 5—12-х класаў больш за 500 найменняў вучэбных выданняў (175 праграм, 265 падручнікаў і больш за 200 найменняў метадычнай літаратуры).

Ацэньваючы ўзровень вучэбнай нагрузкі і яе ўплыў на працаздольнасць і здароўе беларускіх школьнікаў, Казімір Фарыно заўважыў, што вучэбныя нагрузкі вызначае не толькі аб'ём вучэбнага часу. Гэты фактар займае ў рэйтынгу толькі трэцяе-чацвёртае месца. Аднак і бацькі, і некаторыя СМІ часта тэндэнцыёзна параўноўваюць аб'ёмы вучэбнай нагрузкі беларускіх і замежных школьнікаў, у тым ліку з краін СНД, і робяць выснову аб перагрузках у беларускіх школах. Такое меркаванне, як запэўніў намеснік міністра, не мае пад сабой ніякіх падстаў: і па колькасці гадоў навучання, і па колькасці гадзін за ўвесь перыяд навучання наша школа не адрозніваецца ад еўрапейскіх мадэляў агульнай сярэдняй адукацыі.

Асобныя педагогі лічаць, што да вучэбных перагрузак вядзе складанасць праграм і падручнікаў, аднак, на думку Казіміра Фарыно, сапраўдная прычына крыецца ў недастатковым узроўні асабістай метадычнай падрыхтоўкі настаўніка і адсутнасці на месцах работы кіраўнікоў і метадыстаў з педагогамі. Адсюль — няўменне рацыянальна арганізоўваць вучэбную дзейнасць, калі асноўная нагрузка пераносіцца на хатнюю падрыхтоўку. Зразумела, што гэта прыводзіць да празмернай стомленасці дзяцей. Больш таго, пры арганізацыі адукацыйнага працэсу далёка не заўсёды захоўваецца рэжым пяцідзённага вучэбнага тыдня. Шосты школьны дзень увогуле страціў сваё першапачатковае прызначэнне і пераўтварыўся або ў «давесак» да вучобы, або проста ў выхадны дзень.

Міністр адукацыі Аляксандр РАДЗЬКОЎ падзяліўся сваім меркаваннем наконт гэтай праблемы. Ён, у прыватнасці, звярнуў увагу на тую акалічнасць, што ў беларускіх школах прадугледжаны базавы, павышаны і паглыблены ўзроўні вывучэння прадметаў. І бацькі могуць выбіраць для свайго дзіцяці той ці іншы ўзровень з улікам як іх здольнасцяў і інтарэсаў, так і прафесійнай будучыні. Магчыма, не ўсім трэба ісці вучыцца ў гімназію ці ліцэй, і не кожны можа паспяхова асвойваць дысцыпліну на паглыбленым узроўні. Але гэта не ўсе бацькі гатовы прызнаць, да такога прызнання трэба падрыхтавацца і псіхалагічна, і маральна.

Для аптымізацыі вучэбнай нагрузкі Міністэрствам адукацыі падрыхтаваны план, у якім падрабязна прапісаны ўсе крокі. Для абнаўлення зместу і тэхналогій навучання праводзіцца работа па ўдакладненню і ўкараненню адукацыйных стандартаў па кожнаму прадмету. У вучэбныя праграмы новага пакалення плануецца ўнесці інварыятыўны кампанент зместу агульнай сярэдняй адукацыі і ажыццяўляць яго паэтапнае ўкараненне на ўсіх ступенях. Дарэчы, з 1 верасня 2007 года ўсе ўстановы адукацыі (незалежна ад іх тыпу) павінны перайсці на 5-дзённы вучэбны тыдзень.

Акрамя інфармацыйных перагрузак на здароўе школьнікаў уплываюць таксама нерацыянальнае харчаванне і маларухомы лад жыцця. Казімір Фарыно засяродзіў увагу калег на недахопах арганізацыі харчавання ў навучальных установах, дзе далёка не заўсёды захоўваюцца санітарна-гігіенічныя патрабаванні ў харчовых блоках, часта парушаецца тэхналогія прыгатавання ежы, маюць месца недавесы і крадзяжы. Так, за 11 месяцаў 2006 года за адзначаныя недахопы былі прыцягнуты да адміністрацыйнай і дысцыплінарнай адказнасці больш за тры тысячы чалавек, а 50 з іх пазбавіліся сваёй пасады.

Казімір Фарыно патрабаваў ад кіраўнікоў на месцах прыняцця дадатковых мераў па павышэнню прафесійнай кампетэнтнасці кадраў, задзейнічаных у сістэме дзіцячага харчавання, а таксама звярнуў увагу на неабходнасць прывядзення матэрыяльна-тэхнічнай базы аб'ектаў харчавання ў належны тэхнічны і санітарны стан. Для таго, каб школьныя сталовыя не пагражалі здароўю дзяцей, міністэрствамі адукацыі і аховы здароўя быў распрацаваны комплексны план мерапрыемстваў па прафілактыцы кішэчных захворванняў пры арганізацыі харчавання навучэнцаў і выхаванцаў ва ўстановах адукацыі на 2007—2010 гады.

Яшчэ адзін дакумент, аб якім на нарадзе ішла гаворка, гэта праект дзяржаўнай праграмы комплекснай інфарматызацыі сістэмы адукацыі на 2007—2010 гады. У адрозненне ад папярэдняй праграмы, дзе галоўны акцэнт рабіўся на тэхнічнае насычэнне ўстаноў адукацыі, у новай праграме акцэнты змясціліся на змястоўнае напаўненне інфармацыйных тэхналогій навучання і эфектыўнае выкарыстанне закупленай раней камп'ютарнай тэхнікі ў адукацыйным працэсе. Тым больш, што ўтрымацца на дасягнутым узроўні вельмі праблематычна. Паводле слоў **дырэктара Галоўнага інфармацыйна-аналітычнага цэнтра Міністэрства адукацыі Мікалая ЛІСТАПАДА**, камп'ютарная тэхніка кожны год старэе прыкладна на 60 працэнтаў, і працэс яе замены — гэта працэс бясконцы. А вось гатоўнасць настаўнікаў задзейнічаць у адукацыйным працэсе камп'ютар — пакуль не настолькі высокая, як бы таго хацелася. Толькі каля 40 працэнтаў настаўнікаў, якія працуюць у абсталяваных тэхнікай школах, карыстаюцца ці пацвярджаюць сваю гатоўнасць выкарыстоўваць камп'ютарныя інфармацыйныя тэхналогіі ў вучэбна-выхаваўчым працэсе. Да таго ж і айчыннага праграмнага прадукту, адаптаванага да нашых вучэбных планаў і праграм, у Беларусі практычна няма, а гэта таксама сур'ёзная перашкода. Невыпадкова ў Міністэрстве адукацыі была распрацавана галіновая праграма «Электронны падручнік» з асноўным упорам на падтрымку нацыянальных вытворцаў праграмнага забеспячэння. Рэалізацыя гэтай праграмы будзе ўскладзена на спецыяльны цэнтр па распрацоўцы і ўкараненню электронных адукацыйных рэсурсаў.

Надзея НІКАЛАЕВА.

«ЕўраФэст» на фінішы

Глядзіце!

У наступны панядзелак, нарэшце, краіна ўздыхне з палёгкай — будзе пакладзены канец чуткам і плёткам, хто ж прадставіць Беларусь 10—12 мая ў Хельсінкі на міжнародным конкурсе песні «Еўрабачанне-2007». Менавіта на 22 студзеня прызначаны суперфінал нацыянальнага адборачнага конкурсу «ЕўраФэст» — жывы канцэрт, які сёлета абяцае быць як ніколі відовішчным і інтэрнацыянальным.

Акрамя трох канкурэнтаў — Дзіяны Гурцкая, Дзмітрыя Калдуна і гурта «The Project», — перад публікай выступяць замежныя госці: уладальнік другога месца на «Еўрабачанні-2006» расійскі спявак Дзіма Білан, пераможца «Еўрабачання-2002» спявачка Мары Эн, гурт «Космас» з Латвіі, шведская зорка Карола, а таксама беларускія ўдзельнікі «Еўрабачання» — прычым, як дарослага, так і дзіцячага. Дуэт «Аляксандра і Канстанцін», Анжэліка Агурбаш, Паліна Смолава, Вольга Сацюк, Ксенія Сітнік, Андрэй Кунец парадуюць як тых гледачоў, што прыбудуць у сталічны Палац спорту, так і тых, хто вырашыць паглядзець шоу па тэлевізары — прамая трансляцыя канцэрта пачнецца ў 19.20.

Сапраўдным сюрпрызам і каталізатарам для і без таго напружанай барацьбы стане прыбыццё на беларускі суперфінал спецыяльных гасцей. Як расказаў «Звяздзе» выканаўчы прадзюсар праекта «ЕўраФэст» Дзмітрый Баранаў, сваё з'яўленне пацвердзілі Філіп Кіркораў і Кім Брэйтбург, якія прылятаюць з Масквы, каб падтрымаць «сваіх» канкурсантаў (Філіп Бядросавіч напісаў песню Дзіму Калдуну, Кім Брэйтбург — аўтар песні Дзіяны Гурцкая). Ёсць таксама папярэднія дамоўленасці (але яны канчаткова не пацверджаныя) з прадзюсарамі Яўгенам Фрыдляндам і Віктарам Дробышам. Карацей, што-што, а сумна не будзе. А як усё ж будзе і чаго чакаць на сцэне, мы паспрабавалі высветліць у саміх суперфіналістаў.

ПРА МАГІЮ, БЕЛЫЯ КРЫЛЫ І ЭЛЕМЕНТЫ «КУПАЛІНКІ»

Як ні дзіўна, але чым бліжэй да «дня Ікс», тым, здаецца, больш спакойнымі і пазітыўнымі робяцца канкурсанты. Магчыма, у іх проста не хапае часу на высвятленне адносінаў, — трэба ж зрабіць уласнае выступленне бездакорным.

Дарэчы, нічога мяняць у песні і сцэнічнай пастаноўцы нумара не збіраецца толькі **Дзіяна Гурцкая**, чыя кампазіцыя «How long» уяўляла сабой цэласны нумар ужо ў фінале. Ва ўсякім выпадку, брат і афіцыйны прадстаўнік спявачкі Роберт Гурцкая лічыць, што дапрацоўваць выступленне не трэба — узровень і імя гавораць самі за сябе. У прынцыпе, гэткага меркавання прытрымлівалася і журы, бо Дзіяне ніякіх рэкамендацый па «змяненню і паляпшэнню» не давалася. Такім чынам, 22 студзеня мы ўбачым у выкананні Дзіяны і яе каманды ўсё той жа нумар — пранікнёная баладная кампазіцыя, падтанцоўка ў белым і пастаноўка з анёльскімі крыламі.

Дзіме Калдуну не трэба было паўтараць двойчы, што калі хочаш спаборнічаць з іншымі на роўных, трэба змяніць конкурсную песню — спявак і сам гэта цудоўна разумеў. У даволі сцісліся тэрміны Дзмітрый, якога пасля выхаду ў суперфінал адбору падтрымаў не толькі ўласны прадзюсар Віктар Дробыш, але і знаёмы яшчэ па «Фабрыцы зорак-6» Філіп Кіркораў, злятаў у Грэцыю, дзе запісаў новую песню — англамоўную «Work Your Magic». Аўтары кампазіцыі — Карэн Кавалеран (словы) і... Філіп Кіркораў (музыка)! Дарэчы, прысутнасць экс-удзельніка «Еўрабачання-1995» адчуваецца сёлета літаральна ва ўсім — так, Філіп «падарыў» Дзіме Калдуну не толькі песню, але і трох бэк-вакалістаў, якія падтрымаюць канкурсанта на сцэне. Акрамя таго, як расказаў нам сам Дзіма, у пастаноўцы задзейнічаны два танцоры — балет Сяргея Еніхава.

— Гэта Паліна Смолава табе ў спадчыну пакінула? — пацікавіліся мы.

— Не, чаму ж. Проста мы сябруем, таму Сяргей адразу адгукнуўся, калі спатрэбілася прадумаць пастаноўку.

Дарэчы, і песня (перакласці яе назву можна як «Рабі чараўніцтва»), і сцэнічная пастаноўка будуць абыгрываць «магічнае» прозвішча выканаўцы. Паводле ідэі Дзімы, падтрыманай сцэнографамі, чароўны антураж увасобіцца ў чатырох шыльдачках са знакамі задыяка — «Кіркорава, Дробыша, мой і... яшчэ аднаго чалавека», як неахвотна патлумачыў спявак. З шыльдачак павінна ліцца святло. Зрэшты, як яно будзе на самай справе, убачым падчас канцэрта — пакуль можна сказаць толькі, што і Калдуну, і Дробышу падабаецца тое, што атрымліваецца, а гэта, бадай, галоўнае для ўпэўненасці ў сваіх сілах.

На канкурэнтаў Дзмітрый Калдун па традыцыі... не звяртае ўвагі, а перад сабой напалеонаўскіх планаў не ставіць:

— Мая задача — не абмяркоўваць кагосьці, а проста рабіць сваю справу. Праграма-мінімум, натуральна — памагчы ў адборы, ну а праграма-максімум — трапіць у фінал «Еўрабачання» і заняць там месца ў дзесятцы. Каб наступнаму ўдзельніку ад Беларусі не давялося пачынаць усё з нуля.

Журы параіла дапрацаваць песню і «The Project», звярнуўшы асаблівую ўвагу на тое, што да інтэрнацыянальнага жарту няблага было б дадаць «элемент фальклору». Адзін з салістаў дуэта, а таксама лідар гурта «Харлі» Жэня Чалышаў хоць і лічыць, што мода на этніку паступова сыходзіць, спрачацца ўсё ж не стаў — і цяпер у песні ёсць фолкавы фрагмент незразумелага паходжання. Акрамя таго, змянілася аранжыроўка кампазіцыі — самыя пільныя без асаблівых цяжкасцяў пачуюць паміж радкоў «Купалінку», а самыя ўражлівыя... ну хто ж ведае, што яны пачуюць.

— Напэўна, мы крыху памяняем і сцэнічную пастаноўку, каб яна адпавядала музыцы, — расказаў Жэня. — Так, балалайка застанецца. На жаль, не будзе мядзведзя і цыганаў... Але ў цэлым канцэпцыя не памяняецца. Будуць забаўныя дэталі, і разам з тым мы пастараемся не скаціцца ў клаунаду, не зайграцца. Да канкурэнтаў Чалышаў ставіцца з павагай: «Усе вартыя перамогі. Калі была б магчымасць — адправіў бы на «Еўрабачанне» ўсіх! Але я, шчыра кажучы, нікога не баюся, і лічу, што мы не менш за астатніх прэтэндуем на тое, каб перамагчы». Між іншым, нават пры самым горшым раскладзе — нявыхадзе «The Project» у суперфінал — іхняя песня-пародыя «S.U.P.E.R. S.T.A.R.» не згубіцца: самае позняе, восенню выйдзе паўнавартасны альбом гурта. А яшчэ раней — літаральна ў лютым — прэзентуе свой другі альбом гурт «Харлі»

ВАША СЛОВА, ТАВАРЫШ ЖУРЫ

Нягледзячы на шматлікія чуткі, быццам бы ў суперфінале «закінуць слоўца» за сваіх улюбёнцаў змогуць гледачы, расчаруем шаноўную публіку: выбар асноўнага выканаўцы, які прадставіць Беларусь на «Еўрабачанні-2007» у Фінляндыі, залежыць ЦАЛКАМ ад журы. Яно, як і на папярэднім туры адбору, будзе засядаць у тэлестудыі і ацэньваць выступленні канкурсантаў з экрана. Лёс шчасліўчыка, нагадаем, вызначаюць 9 чалавек: старшыня прафесійнага журы, кіраўнік Нацыянальнага канцэртнага аркестра Беларусі Міхаіл Фінберг, першы намеснік міністра культуры Уладзімір Рылатка, мастацкі кіраўнік праекта «Еўрабачанне-2007» Васіль Раінчык, дырэктар дырэкцыі музычных і забаўляльных праграм Белтэлерадыёкампаніі Дзяніс Шпітальнікаў, мастацкі кіраўнік ансамбля «Сябры» Анатоль Ярмоленка, кампазітар Леанід Захлеўны і іншыя прафесіяналы.

Вікторыя ЦЕЛЯШУК.

Першы год умовы не змяняюцца

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)

Пры немагчымасці ж выкарыстання спецыяліста на рабоце ў дадзенай арганізацыі абавязкаў па яго працаўладкаванню ўскладаецца на ведамаснае міністэрства. І ў сваю чаргу апошняе абавязана знайсці месца па спецыяльнасці або кваліфікацыі ў сваёй сістэме. Або, як варыянт, адкамандзіраваць на работу ў сістэму іншага міністэрства.

Трэцяя падстава скасавання кантракта — неадпаведнасць пасадзе або выконваемай рабоце з прычыны стану здароўя. Прычым стан здароўя работніка, у адносінах да якога вырашаецца пытанне аб звальненні, павінен быць пацверджаны медыцынскім заключэннем. Чацвёрты варыянт — сістэматычнае невыкананне маладым спецыялістам сваіх службовых абавязкаў. Варыянт пяты — неаднаразовае з'яўленне на працоўным месцы ў алкагольным ці наркатычным стане. Далей. Дапускаецца магчымасць звальнення маладога спецыяліста пры ўмове нез'яўлення на рабоце на працягу 4 месяцаў запар з прычыны часовай непрацаздольнасці, калі заканадаўства не вызначае больш працяглы тэрмін захавання месца працы пры пэўным захворванні. Дзеля справядлівасці, трэба заўважыць, што звальненне па дадзенай падставе з'яўляецца толькі правам, але не абавязкам наймальніка. Нарэшце, прычынай звальнення можа стаць крадзеж маёмасці наймальніка або іншыя проціпраўныя дзеянні. Але, адзначае Сяргей Сарокін, нават у выпадку «вінаватых» дзеянняў, адміністрацыя павінна выкарыстоўваць скасаванне кантракта як крайнюю меру. Тады як найперш — меры выхаваўчыя.

Паўналетні па агульных правілах

Ці ёсць якія-небудзь асаблівыя патрабаванні да рэжыму работы маладых спецыялістаў? У прыватнасці, ці павінны яны быць занятыя поўны працоўны тыдзень і ці могуць прыцягвацца да работ у начную змену?

— Якіх-небудзь дадатковых умоў для маладых спецыялістаў тут няма, па сутнасці яны ўжо нічым не адрозніваюцца ад астатніх работнікаў прадпрыемства, — кажа Сяргей Сарокін. — Таму калі малады спецыяліст ўжо дасягнуў 18-гадовага ўзросту, ён будзе працаваць у рэжыме поўнага тыдня. І можа прыцягвацца да работы ў начны час.

Агульным з'яўляецца і правіла прадастаўлення працоўнага водпуску. Такі водпуск можа давацца толькі праз 6 месяцаў работы ў наймальніка. Праўда, у дадзеным выпадку верагодныя пэўныя выключэнні. Раней чым праз 6 месяцаў выйсці ў водпуск, да прыкладу, змогуць цяжарныя жанчыны, сумяшчальнікі, настаўнікі ці выкладчыкі, а таксама зноў-такі асобы, якія не дасягнулі паўналецця.

Сяргей ГРЫБ.

777

ВОГНЕННЫ КАБАН АБЯЦАЕ «ТАННЫЯ» ЛЕГКАВУШКІ І ЎСПЛЁСК ЗАКЛЮЧЭННЯ ШЛЮБАЎ

Паводле кітайскага календара, год Вогненнага Кабана пачынаецца 17 лютага ў 18 гадзін 15 хвілін (тыя, хто яшчэ не стаміўся ад святкаванняў, маюць час як след падрыхтавацца да ўрачыстай сустрэчы). Кабан (альбо Свінні) ва ўсходняй традыцыі сімвалізуе дабрабыт, у тым ліку і фінансавы. Наколькі прыбытковым 2007 год будзе для беларусаў, мы папрасілі расказаць прафесійнага кансультанта ў галіне бізнэс-астралогіі Уладзіміра Васюка.

— Уладзімір Уладзіміравіч, раскажыце калі ласка, чаго нам чакаць у 2007 годзе?

— Увогуле, у гэты перыяд аптымістычныя тэндэнцыі дамінуюць над песімістычнымі. Людзі схільныя верыць у лепшую будучыню, бо перад імі адкрываюцца магчымасці палепшыць умовы свайго існавання. У год Кабана лёгка вырашаюцца матэрыяльныя праблемы, калі шукаць не толькі крыніцы заробку, але і кантраляваць расходныя артыкулы бюджэту. Год спрыяльны для набыцця кватэры, зямельнага ўчастка, уступлення ў шлюб. Вельмі важна сёлета імкнуцца стварыць камфортную эмацыянальна-псіхалагічную атмасферу для родных і блізкіх, усвядоміць, што вы ўплываеце на лёсы многіх акаляючых вас людзей і зрабіць усё, каб гэты ўплыў быў як мага больш гарманічным. У гэтым годзе можна зрабіць вельмі многае ў бізнэсе і працы. Варта толькі паверыць у сябе і сваю шчаслівую зорку. Упэўненасць, мэтанакіраванасць і паслядоўнае, нясцомнае ўхільнае набліжэнне да мэты — асноўныя фактары поспеху ў год Кабана. Прыйшоў час, калі будуць запатрабаваны спецыялісты высокай кваліфікацыі і вузкага профілю, напрыклад, сістэмныя праграмісты, сістэмныя адміністратары, адвакаты, суддзі, вучоныя-практыкі і інш. Таму для дасягнення кар'ернага поспеху варта вызначыць перавагі, якія вы маеце перад іншымі, і ўсе намаганні накіраваць на развіццё тых аспектаў працоўнай дзейнасці, у якіх вы найбольш кампетэнтны. Як ніколі вялікае значэнне будзе мець рэклама і PR-тэхналогіі. Увогуле, гэты год можна смела назваць «залатым» для ўсёй азначанай галіны.

У цэлым год патрабуе ад кожнага з нас пастаяннага сувымярэння сваіх учынкаў з закладзенымі прыродай маральна-этычнымі ўстаноўкамі. Энергетыка планет будзе даваць новыя магчымасці тым людзям, якія прыслухаюцца да голасу сумлення, самаахвярна папрацуюць дзеля рэалізацыі сваіх ідэалаў, мараў, імкненняў.

2007 год — адзін з тых перыядаў, калі долар ЗША будзе губляць свае пазіцыі ў адносінах да асноўных 18 сусветных валют (еўра, японскай іены, аўстралійскага долара, швейцарскага франка і гэтак далей). Цэны на нафту і газ будуць расці на працягу ўсяго года. Сёлета пачнецца абвастрэнне геапалітычнай напружанасці, пік якой прыйдзецца на канец 2008 — пачатак 2009 года.

— А якім год Свінні будзе канкрэтна для Беларусі?

— У гэтым годзе міжнародныя пазіцыі Расіі і Еўропы будуць настолькі блізкія, якімі яны не былі апошнія гадоў 15—20. Беларусі і яе бліжэйшым суседзям давядзецца думаць аб тым, як выжываць у гэтых новых рэаліях, выпрацоўваць новую палітыку і тактыку. Рост цэн на нафту будзе ўзмацняць геапалітычны ўплыў Расіі. Так званая «газавая праблема» будзе турбаваць нас яшчэ 8 месяцаў. Расія і Беларусь будуць то дасягаць пэўных дамоўленасцяў, то потым пераглядаць іх, і канчатковая кропка па гэтым пытанні будзе пастаўлена толькі ў верасні 2007 года. Але ж да канчатковага вырашэння гэтай праблемы давядзецца пачакаць яшчэ два—тры гады.

— А на ўнутраным плане якія змены чакаюць Беларусь (у галінах эканомікі, сацыяльна-палітычнага жыцця, культуры)?

— Значныя перамены ў эканоміцы звычайна адбываюцца не за адзін год, а за тры—чатыры. Але ў 2007-м можна чакаць сур'ёзных тэхналагічных змен, якія пачнуцца сёлета, атрымаюць сваё развіццё ў наступным годзе і прынясуць станоўчыя вынікі ў бліжэйшай будучыні. У першую чаргу яны закрануць харчовую прамысловасць, дзе з'явяцца прынцыпова новыя айчынныя тэхналогіі вытворчасці. Спрыяльным будзе час і для нашай лёгкай прамысловасці: многія беларускія прадпрыемствы ўвойдуць у міжнародныя галіновыя саюзы, іх прадукцыя атрымае сусветнае прызнанне. Адзначу, што адбудзецца гэта, у асноўным, дзякуючы добра пабудаванай сістэме маркетынгу і збыту. А вось цяжкай прамысловасці сёлета спатрэбіцца тэрміновае тэхналагічнае пераабсталяванне, каб у рэаліях 2008—2009 гадоў яна здолела не толькі выжыць, а і эфектыўна працаваць.

У 2007 годзе планета Юпітэр праходзіць знак Стральца, у людзей абвастрыцца прага да вандровак, паездак, у першую чаргу замежных. Як вынік — павелічэнне попыту на турыстычныя паслугі. Калі гаварыць пра Беларусь, вялікае значэнне сёлета будзе мець унутраны турызм. На беларускім аўтамабільным рынку можна чакаць значнае паніжэнне цэн на замежныя «легкавушкі» як вынік крызісу перавытворчасці ў краінах Еўропы і Азіі, які прывядзе да значнага паніжэння цэн. Тое ж чакаецца і на сусветным рынку сотавай сувязі. Праўда, да нас «мабільная рэвалюцыя» і абвал цэн «дакоціцца» толькі напрыканцы года.

— Што зоркі прарочаць нам у галіне культуры і сацыяльнай сферы?

— У гады праходжання Юпітэра праз знак Стральца заўсёды вялікае значэнне набывае дзяржаўная ідэалогія. Сёлета з'явяцца ўнікальныя магчымасці рэалізацыі вышэйшых касмічных прынцыпаў у паўсядзённае жыццё. У масавай свядомасці сфарміруюцца новыя ідэі сацыяльнай арганізацыі, адносінаў паміж чалавекам і грамадствам, чалавекам і чалавекам.

2007 год будзе годам манументальных навуковых і культуралагічных перамен, даследаванняў, калі падводзяцца вынікі шматгадовых пошукаў, сістэматызацыя вопыту дзеля генерацыі некалькіх ідэй, якімі можна будзе кіравацца ў далейшым. Прыйшоў час аб'яднання людзей у калектывы. Хуткі прагрэс і развіццё асобы магчымы ў групе аднадумцаў, блізкіх па духу. Стралец — сімвал увасаблення вышэйшага закона ў чалавеку і ў грамадстве. Лагічна, што ў гэтым годзе развіццё атрымаюць сацыяльныя структуры, якія прама ці ўскосна звязаны з рэалізацыяй законаў духоўных і сацыяльных. У грамадстве ўзрасце роля рэлігійных арганізацый, якія могуць аказваць значны ўплыў на палітычнае і сацыяльнае жыццё. Прынамсі, наяўнасць генеральнай ідэі, усведамленне місіі канкрэтнага калектыву, фірмы, арганізацыі напрамую будзе ўплываць на іх поспехі ў бізнэсе. І чым больш абгрунтаваній будзе ідэя, тым больш адчувальнымі будуць станоўчыя вынікі працы.

Увогуле, год Вогненнага Кабана абяцае стаць асабліва спрыяльным для кіраўнікоў, народжаных пад вогненнымі знакамі задыяка — Авена, Льва і асабліва Стральца. Сёлета любое дзеянне чалавека, які хоча сацыяльна вылучыцца, стаць лідарам, павінна грунтавацца на паняццях ідэі і абавязку (у азіяцкім сэнсе гэтага слова, калі абавязак успрымаецца як дзеянне, якое ажыццяўляецца па ўнутранай патрэбе і з-за ўсведамлення сацыяльнай неабходнасці).

— Назавіце, калі ласка, найбольш важныя для нашай краіны перыяды гэтага года?

— Самымі напружанымі будуць два перыяды: апошняя дэкада сакавіка — першая дэкада красавіка і сярэдзіна жніўня — першая дэкада лістапада. Гэта час, калі магчымыя значныя сацыяльныя, эканамічныя змены.

— Што 2007 год прынясе нам у асабістым жыцці?

— Адзіночкі адчуюць вострую патрэбу знайсці сваю пару, як вынік — сёлета чакаецца ўсплёск заключэння

ЗЯМЛЯ І ЛЮДЗІ МІНШЧЫНЫ

Пытальнік

Каб устанавіць тэлефон, трэба пракладваць кабель. А гэта паслуга платная

У 1945 годзе я быў узнагароджаны медалём «За доблесную працу ў Вялікай Айчыннай вайне 1941—1945 гг.». Насіў яго на працу, нават спаў з ім, але потым па маладосці згубіў. Прашу дапамагчы адшукаць медаль, знайсці архіўныя дакументы. Мне вельмі баляць суставы ног і хадзіць да суседзяў да тэлефона я не магу. Я чуў па радыё, што хто мае працоўны медаль, таму тэлефон устанаўліваюць па-за чаргой. Я тэлефанаваў у Беразіно, але там на мой запыт — нуль увагі, маўляў, няма ніякіх даных.

Станіслаў Аляксандравіч Скуратовіч,
в. Клёнаўка Бярэзінскага раёна.

Што датычыцца пытання Станіслава Аляксандравіча адносна медаля, як мы ўжо раней неаднойчы адказвалі на аналагічныя запыты чытачоў, адшукаць яго будзе даволі праблематычна. Дакладней, гаворку трэба весці нават не пра сам медаль, і нават не пра яго дублікат — усё ж гэта ўзнагарода ўжо неіснуючай краіны, да таго ж уручалася яна больш за 60 гадоў таму. У лепшым выпадку можна будзе пацвердзіць толькі факт узнагароджання, калі захаваліся адпаведныя спісы. Думаем, што для чытача справа не столькі ў самім медалі, колькі ў пэўных ільготах, якія ён плануе скарыстаць — устанавіць тэлефон.

— Ваш заяўнік з'яўляецца ветэранам працы. Адна з ільгот для гэтай катэгорыі грамадзян — першачарговая ўстаноўка кватэрнага тэлефона, — патлумачыла нам начальнік упраўлення па працы і сацыяльнай абароне Бярэзінскага райвыканкама Вольга Пашкевіч. — З 1997 года ў чарзе на яго ўстаноўку стаяла жонка Скуратовіча, аднак яна пайшла з жыцця.

Чарга перайшла на самога заяўніка. Але тэлефон немагчыма было яму ўстанавіць па іншых прычынах. Суседзі адмовіліся запаралеліць свае лініі з ім. А каб працягнуць ад АТС у суседняй вёсцы Котава да вёскі Клёнаўка, дзе жыве Станіслаў Аляксандравіч, новую лінію, трэба пракласці больш за два кіламетры кабелю. Свабодны нумар, дарэчы, сувязісты ўжо знайшлі. Але паслуга гэта платная, каштуе 1 мільён 300 тысяч рублёў...

Як паведаміла раней Вольга Уладзіміраўна, да заяўніка асабіста выязджаў начальнік раённага вузла электрасувязі. На платную ўстаноўку тэлефона Станіслаў Аляксандравіч адразу згоды не даў, абяцаў падумаць. Канешне, для аднаго чалавека названая сума з'яўляецца даволі вялікай. Але ў вёсцы пражывае толькі каля 30 чалавек. Хто мае тэлефон, каму, магчыма, ён не вельмі патрэбны, таму на дадзены момант толькі самому заяўніку вырашаць — плаціць або не за ўстаноўку кватэрнага тэлефона. На жаль, ніякіх іншых ільгот, якія б дапамаглі знізіць кошт гэтай працэдуры, у яго няма...

Колькі павінны каштаваць дровы?

Усе мы чулі, як па радыё выступаў наш Прэзідэнт, які сказаў, што патрэбна ачысціць лясы ад буралому. Няхай людзі бяруць яго на дровы за ўмераную плату. У Віцебскай вобласці яны каштуюць 3—4 тысячы рублёў за кубаметр (як пісала ваша газета ў 2006 годзе). У Негарэльскім лясніцтве — таксама нядорага. Затое ў Путчынскім лясніцтве за дровы, якія ляжаць на зямлі ўжо гады тры-чатыры, бяруць за вольку, елку 8,5 тысячы рублёў, за бярозу — 9 тысяч рублёў за кубаметр. Жывём мы ў адной дзяржаве, а цэны такія розныя. Просім дапамагчы разабрацца.

Жыхары Путчынскага сельскага Савета, Дзяржынскі раён.

Як патлумачылі нам у Мінскай дзяржаўнай лесагаспадарчай установе (ДЛГУ), якой падпарадкоўваецца і Путчынскае лясніцтва ў тым ліку, з гэтага года кошт на лесаматэрыялы хвойных і лісцевых парод і паліўныя дровы адзіны для ўсіх спажыўцоў. Але ў кожнай вобласці ён зацвярджаецца аблвыканкамамі, зыходзячы, з канкрэтных умоў, таму параўноўваць цэны на дровы ў Мінскай і Віцебскай абласцях (тым больш за мінулы год) не зусім карэктна. Тым больш што з 9 студзеня Мінскім аблвыканкамам зацверджаны новыя рознічныя цэны для насельніцтва на паліўныя дровы (у параўнанні з папярэднім яны павялічыліся недзе на 16 працэнтаў). У прыватнасці, цяпер на тэрыторыі вобласці адзін кубаметр бярозы і вольхі каштуе 11 200 рублёў, а елкі і асіны — 10 600 рублёў. Прычым не мае значэння, гаворка ідзе пра круглы лес ці паліўныя дровы. З тралёўкай гэта цана павялічваецца да 12—15 тысяч рублёў за кубаметр у залежнасці ад пароды драўніны. З загрузкай і дастаўкай грамадзяніну прама на падворак яна павялічваецца да 27 тысяч рублёў (дровы змешаных парод) за кубаметр. Саманарыхтоўка дроў насельніцтвам забаронена, адзінае, калі чалавек мае ўласны транспарт, ён можа сам вывезці ўжо нарыхтаваныя дровы. Каштаваць гэта будзе, як мы ўжо сказалі вышэй, ад 10 600 да 11 200 рублёў за кубаметр у залежнасці ад пароды.

Міхаіл ГЛІНСКІ, старшыня Мінскага райвыканкама:

«АДБЫВАЮЦЦА РЭАЛЬНЫЯ ПЕРАМЕНЫ ДА ЛЕПШАГА»

Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

Мінскі раён даволі вялікі і па плошчы, і па колькасці насельніцтва. Варта хоць бы ўзгадаць, што тут налічваецца больш чым 140 тысяч жыхароў. Акрамя таго, у раёне працуюць 355 садаводчых таварыстваў, вызначана 177 раёнаў індывідуальнай забудовы. Падлічана, што ўсяго па дапамогу да мясцовай улады (як у райвыканкам, так і ў сельсаветы) звяртаюцца больш чым 300 тысяч чалавек. Наколькі ўдала вырашаюцца надзённыя праблемы людзей, ці ўдаецца «малой Міншчыне» канкураваць па ўзроўню сэрвісу са сталіцай, якая тут адзначаецца дынаміка развіцця? На пытанні карэспандэнта «Звязды» адказвае старшыня Мінскага райвыканкама Міхаіл ГЛІНСКІ.

«ЗАМАЦАВАЛІ СТАНОЎЧУЮ ТЭНДЭНЦЫЮ»

— Летась Мінскі раён упэўнена спрацаваў па ўсіх накірунках — былі выкананы ўсе асноўныя прагнозныя паказчыкі сацыяльна-эканамічнага развіцця. Гэта датычыцца вытворчасці спажывецкіх тавараў, аб'ёму платных паслуг насельніцтву і г.д. Паспяхова справілася з пастаўленай задачай прамысловасць. Летась мы ў чарговы раз пацвердзілі тую станоўчую тэндэнцыю, якая адзначаецца ў раёне на працягу апошніх некалькіх гадоў — штогод мы прыбаўляем, паляпшаем паказчыкі сацыяльна-эканамічнага развіцця. Нягледзячы на складаныя ўмовы надвор'я, іншыя аб'ектыўныя фактары, імкнёмся трымаць высокі ўзровень і гэта, на шчасце, удаецца.

— Па-мойму, Мінскі раён — адзін з нямногіх рэгіёнаў Беларусі, дзе летась удалося «плюсануць» у тым ліку і па валавому збору збожжа?

— Летась на палетках раёна ўдалося сабраць рэкордны ўраджай — больш чым 150 тысяч тон збожжа. Гэта на 7 тыс. тон перавышае ўзровень 2005 года. Зразумела, што паказчык мог быць значна вышэйшы, калі б не дрэннае надвор'е. Аднак і ў такіх умовах, як я лічу, людзі зрабілі ўсё магчымае. Нездарма ж на «Дажынках» у Бабруйску Мінскі раён быў прадстаўлены сярод пераможцаў амаль ва ўсіх намінацыях. Гэта цалкам заслужаная перамога.

Аграпрамысловы комплекс развіваецца досыць дынамічна. Летась гаспадаркі сабралі ў 1,5 раза больш цукровых буракоў, чым ў 2005-м. Таксама ўпершыню за апошні час быў нарыхтаваны 1,5-гадовы запас травяністых кармоў. Валавая вытворчасць малака практычна дасягнула ўзроўню 100 тысяч тон, а сярэдні надой ад каровы па раёну склаў больш чым 5,7 тысячы літраў. Такімі паказчыкамі сапраўды можна ганарыцца. Мы настроены рухацца далей, каб Мінскі раён быў флагманам сельскагаспадарчай вытворчасці не толькі Мінскай вобласці, а і ўсёй рэспублікі. Закупляецца вялікая колькасць самай найноўшай тэхнікі і разнастайнага сельскагаспадарчага абсталявання і, такім чынам, ствараюцца сучасныя ўмовы вытворчасці.

«АГРАГАРАДКІ — ГЭТА НАДЗВЫЧАЙ СУР'ЁЗНА»

— Міхаіл Афанасьевіч, разам з мадэрнізацыяй, стварэннем умоў вытворчасці, напэўна, паралельна вырашаюцца і сацыяльныя пытанні?

— Безумоўна, такая работа праводзіцца вельмі актыўна. Праграма адраджэння вёскі, якую мы паспяхова рэалізуем, — даволі ўсебаковая, комплекс мерапрыемстваў скіраваны на вырашэнне разнастайных задач. У тым ліку і ў сацыяльнай сферы, каб стварыць у вёсцы спрыяльныя ўмовы для жыцця. За два апошнія гады ў Мінскім раёне створаны 3 аграгарадкі, а ўсяго да 2010 г. іх плануецца ўвесці 28. Вы можаце задаць зразумелае пытанне: а чаму ж так доўга «разварушваецеся»? Мы асэнсавана не фарсіравалі тэмпы, паколькі цудоўна разумелі, што аграгарадкі — гэта надзвычай сур'ёзна. Тут варта сапраўды стварыць умовы, рэальна параўнальныя з гарадскімі. У нашым выпадку — нават са сталіцай. Такую работу нельга выканаць фармальна, паколькі па яе выніках жыхары мяркуюць аб эфектыўнасці ўлады. Разумееце, якая адказнасць! Таму на першых аграгарадках мы адпрацоўвалі эфектыўную сістэму стварэння і далейшай дзейнасці такіх населеных пунктаў. Зараз паціху пачынаем «раскручвацца» — напрыклад, сёлета плануецца ўвесці ўжо 6 аграгарадкоў.

— Сацыяльная інфраструктура рэальна паляпшаецца?

— А як інакш? Вельмі актыўна праводзіцца будаўніцтва — летась у Мінскім раёне было здадзена ў эксплуатацыю больш чым 272 тысячы квадратных метраў жылля. Гэта зноў-такі рэкордны для нас паказчык. Разам з будаўніцтвам новых аб'ектаў вялікую ўвагу ўдзяляем ліквідацыі даўгабудаў. Такую работу мы расцэньваем як адзін з галоўных накірункаў у плане навядзення парадку на зямлі. Ва ўсіх сельсаветах створаны альбо ўласныя камунгасы, альбо іншыя спецыялізаваныя структуры, якія забяспечаны неабходнай тэхнікай. У раёне рэалізуецца маштабная праграма дарожнага будаўніцтва. Толькі за два апошнія гады ў межах гэтага праекта было заасфальтавана больш чым 110 кіламетраў дарог.

«КАМУНАЛЬНІКІ ПРАЦУЮЦЬ БЕЗ СТРАТ»

— Міхаіл Афанасьевіч, а як развіваецца «камуналка»?

— Вялікую ўвагу надаём навядзенню належнага парадку ў жылфондзе. Прадпрыемствы ЖКГ працуюць паспяхова, падмацаваннем чаго з'яўляецца тое, што летась у нас гэтая галіна выйшла на бясстратную дзейнасць, пачала зарабляць на сябе грошы. У складзе жыллёва-камунальнай гаспадаркі створана ўласнае рамонтна-будаўнічае аб'яднанне. Гэта дазволіла вырашыць некалькі пытанняў. Па-першае, аператыўна і якасна выконваць комплекс неабходных адпаведных работ, а таксама на 30 працэнтаў зменшыць іх кошт. Да таго ж падатковыя паступленні ад такой дзейнасці застаюцца ў раёне. Гэта яскравы прыклад сур'ёзнага, дзяржаўнага падыходу да справы.

Надзённая праблема — забеспячэнне насельніцтва раёна якаснай пітной вадой. У гэтым плане яшчэ некалькі гадоў таму было шмат нявырашаных пытанняў. Зараз яны паспяхова вырашаюцца — летась было ўведзена ў дзеянне 6 артэзіянскіх свідравін. Таксама і з інжынерным абсталяваннем камунальнай інфраструктуры. Наноў пракладзена больш чым 10 кіламетраў цепластрас. Гэта рэальна дазваляе зменшыць страты цяпла. Два гады таму было заменена 2,7 кіламетра цепластрас у пасёлку Гатава. Раней страты там дасягалі 25 працэнтаў, а пасля перакладкі зменшыліся да 1,5—3. Такім чынам, паляпшаецца камфорт жыхароў і ўдаецца эканоміць стратэгічныя энергарэсурсы. Напрыканцы мінулага года ў раёне пачалося будаўніцтва 5 міні-кацельняў. Неабходна крыніцы цяпла максімальна наблізіць да спажыўца. Укараняюцца сістэмы пакватэрнага ацяплення. Работа, якую мы праводзім у плане энергазберажэння, змяншэння страт у інжынерных сетках, пераходу на мясцовыя віды паліва, дазволіць у тым ліку мінімізаваць урон у выніку павелічэння цаны на прыродны газ. Задача ўлады — зрабіць усё такім чынам, каб насельніцтва не адчула якіх-небудзь значных страт ні ў плане аплаты, ні ў плане камфорту.

«У СЯРЭДНІМ — БОЛЬШ ЧЫМ 300 ДОЛАРАЎ»

— Сэрвіс у раёне параўнальны са сталічным?

— Адкажу так: узровень у раёне вельмі прыстойны. За апошнія тры гады бюджэтныя паступленні ў нас узраслі ўтрая: калі ў 2005-м яны складалі 7 мільёнаў долараў у месяц, то зараз — больш чым 20 млн. Канешне, значная іх частка паступае ў рэспубліканскі бюджэт, але, тым не менш, у раёна з'явілася больш магчымасцяў для перспектыўных укладанняў. Паводле папярэдніх даных, летась адлічэнні на развіццё сацыяльнай сферы склалі 76—77 працэнтаў раённага бюджэту. За кошт такіх значных выдаткаў удалося шмат чаго зрабіць. Паспяхова ствараецца сучасная сістэма адукацыі, медыцынскага абслугоўвання і г.д. У Сеніцы арганізаваны ліцэй, які рыхтуе абітурыентаў для ВНУ аграпрамысловага, будаўнічага профілю, а таксама для ўніверсітэта культуры. Паспяхова працуе гімназія ў Бараўлянах. У раёне налічваецца больш чым 30 ліцэйскіх класаў, дзе з вучнямі працуюць выкладчыкі вядучых вышэйшых навучальных устаноў Беларусі. Так што магчымасці ў дзяцей для атрымання сучаснай адукацыі самыя шырокія. Таксама і па медыцыне. Праводзіцца маштабная рэканструкцыя арганізацый аховы здароўя, аснашчэнне іх найноўшай апаратурай. У шэрагу выпадкаў медыцынскія ўстановы раёна працуюць па самых сучасных тэхналогіях. Нават жыхары сталіцы імкнуцца сюды патрапіць на прыём. Якасць абслугоўвання значна палепшылася — за мінулы год нараканняў на гэты конт з боку насельніцтва раёна практычна не было.

— Наколькі прывабны Мінскі раён па ўзроўню заробкаў?

— За мінулы год сярэдні заробак у раёне склаў больш чым 300 долараў. Прычым сур'ёзнай «разбежкі» паміж рознымі галінамі няма — гэта станоўчая тэндэнцыя. Таму па заробках, як я лічу, умовы даволі прывабныя. Іх удалося стварыць, і маладыя спецыялісты пасля заканчэння навучання ўжо вяртаюцца на работу ў раён. Таксама як і тыя работнікі, што раней практычна збеглі ў сталіцу за «лепшым хлебам». Такая сітуацыя — сведчанне таго, што ў раёне адбываюцца рэальныя перамены да лепшага.

Мікалай ЛІТВІНАЎ,
Мінскі раён.

Извещение о проведении аукциона 31 января 2007 года

УП «Минский городской центр недвижимости» проводит 57-й открытый аукцион на право заключения договора аренды (сроком на 5 лет) нежилых неиспользуемых помещений коммунальной собственности г. Минска

№ лота	Тип помещения, адрес, целевое назначение	Арендуемая площадь, кв. м	Начальная цена, тыс. руб.
	КУП «ЖРЭО Заводского района г. Минска» тел. 285-56-02		
1	Подвал, ул. Голодеда, 21/1 (под склад)	45,50	629
2	Подвал, пр. Партизанский, 20 (непроизводственное — офис)	140,00	1 937
	КУП «ЖРЭО Ленинского района г. Минска» тел. 221-35-03		
3	Подвал, ул. Красноармейская, 32 (склад)	99,94	1 383
4	1 этаж, ул. К. Маркса, 8 (проходной подъезд, прием в ремонт обуви по согласованию с ЦГиЭ)	11,92	165
5	2 этаж, ул. Плеханова, 72 (магазин промгруппы)	47,52	1 972
6	Подвал, пр. Рокоссовского, 113-47 «а» (под непроизводственное — офис)	25,18	348
7	1 этаж, ул. Семенова, 33 (продовольственный магазин, производственное, непроизводственное — офис, треб. изменение функционального назначения)	98,06	4 070
	КУП «ЖРЭО Октябрьского района г. Минска» тел. 213-29-60, 224-53-76		
8	Подвал, ул. Кижеватова, 78 (любое по согласованию с МЧС и ЦГиЭ)	82,07	1 135
9	1 этаж, ул. Казинца, 49 (любое по согласованию с МЧС и ЦГиЭ)	91,00	1 259
10	Убежище, ул. Брилевская, 6 (любое по согласованию с МЧС и ЦГиЭ)	51,56	713
11	Подвал, ул. Брилевская, 13 (любое по согласованию с МЧС и ЦГиЭ)	92,28	1 277
	КУП «ЖРЭО Партизанского района г. Минска» тел. 294-01-11		
12	1 этаж, 2-й пер. Багратиона, 20 (швейное ателье)	308,75	4 271
13	Подвал, ул. Первомайская, 18 (любое по согласованию с МЧС и ЦГиЭ)	37,58	520
14	1 этаж, ул. Первомайская, 20/2 (торговля промтоварами, бытуслуги по согласованию с МЧС и ЦГиЭ)	18,63	1 546
15	Цоколь, ул. Буденного, 18 (бытуслуги по согласованию с МЧС и ЦГиЭ, кроме парикмахеркой и ремонта обуви)	66,20	916
16	Цоколь, ул. Холмогорская, 51 (торговый объект продовольственной группы)	680,37	9 413
	КУП «ЖРЭО № 1 Фрунзенского района г. Минска» тел. 204-30-46		
17	1 этаж, ул. Д. Марцинкевича, 4, корпус 2 (непроизводственное — офис)	73,80	1 021
18	1 этаж, подвал, ул. Ольшевского, 11 (подвал 190 м.кв., промтоварный магазин)	617,90	8 548
	КУП «ЖРЭО Первомайского района г. Минска» тел. 285-72-92		
19	2 этаж, ул. Руссиянова, 8 (непроизводственное — офис)	16,27	225
20	1 этаж, цоколь, ул. Я. Коласа, 52 (общепит)	213,10	17 689
	КУП «ЖРЭО Центрального района г. Минска» тел. 203-34-66, 203-79-43		
21	Подвал, ул. Заславская, 31(непроизводственное — офис)	15,00	208
22	Помещение, пр. Победителей, 75, корпус 1 (медуслуги врача гомеопата)	105,70	1 462
	УП «Гаражи, автостоянки, парковки» тел. 252-02-16		
23	Часть помещения в ОТЦ «Столица», пл. Независимости (тоговля сувенирами, бижутерией)	2,00	332
	Главное управление потребительского рынка тел. 220-51-34, 219-00-78		
24	Помещение, ул. Багратиона, 55 «б» (579 м.кв. — продовольственный магазин, 88,5 м.кв. — под склад)	667,50	27 704
25	Помещение № 25 в ТЦ «Партизанский», пр. Партизанский, подземный переход перед универмагом «Беларусь» (торговля непродовольственными товарами)	19,80	3 287
26	Помещение № 26 в ТЦ «Партизанский», пр. Партизанский, подземный переход перед универмагом «Беларусь» (торговля непродовольственными товарами)	19,80	3 287
27	Помещение № 27 в ТЦ «Партизанский», пр. Партизанский, подземный переход перед универмагом «Беларусь» (торговля непродовольственными товарами)	19,80	3 287
28	Помещение № 1 в подземном переходе № 8, пл. Независимости (под общепит)	72,40	6 010
29	Открытый киоск № 214, в ОТЦ «Столица», пл. Независимости (торговля промтоварами)	18,45	3 063
30	Открытый киоск № 215, в ОТЦ «Столица», пл. Независимости (торговля промтоварами)	18,45	3 063
31	Открытый киоск № 216, в ОТЦ «Столица», пл. Независимости (торговля промтоварами)	18,45	3 063
32	Помещение № 218, в ОТЦ «Столица», пл. Независимости (склад)	204,60	2 831
33	Помещение, в ОТЦ «Столица», пл. Независимости (санузлы для посетителей)	252,30	3 490
34	Помещение № 304, в ОТЦ «Столица», пл. Независимости (под парикмахерскую)	190,35	2 633
35	Помещение № 313, в ОТЦ «Столица», пл. Независимости (кафе на 96 посадочных мест)	634,80	8 782
36	Помещение № 324, в ОТЦ «Столица», пл. Независимости (торговля промтоварами)	282,00	3 901
37	Открытый киоск № 326, в ОТЦ «Столица», пл. Независимости (торговля промтоварами)	18,45	3 063
38	Открытый киоск № 416, в ОТЦ «Столица», пл. Независимости (торговля промтоварами)	18,45	3 063
39	Помещение № 517, в ОТЦ «Столица», пл. Независимости (торговля промтоварами)	350,70	4 852
40	Помещение № 524, в ОТЦ «Столица», пл. Независимости (боулинг с бильярдом — 3 101,1 м.кв. и баром на 45 посадочных мест — 289,35 м.кв.)	3 390,45	46 905
	КУП «ОРПК Заводского района» тел. 243-93-33		
41	Помещение, ул. Центральная, 46 (производственное)	66,40	919
42	Открытая площадка, ул. Центральная, 46	600,00	8 301
43	Открытая площадка, ул. Центральная, 46	825,00	11 414
	КУП «Партизанское» тел. 200-16-91, 200-57-70		
44	Помещение, ул. Стебенева, 2 (склад, производственное)	207,15	2 866
45	Помещение, ул. Стебенева, 2 (непроизводственное — офис, без юрадреса)	13,23	183
46	Помещение, ул. Стебенева, 2 (непроизводственное, склад)	4,44	61
47	Помещение, ул. Стебенева, 2 (склад, производствен., непроизводств. — офис)	120,87	1 672
48	Открытая площадка, ул. Стебенева, 2 (склад, производственное)	100,00	1 383
49	Открытая площадка, ул. Стебенева, 2 (склад, производственное)	100,00	1 383
50	Открытая площадка, ул. Стебенева, 2 (склад, производственное)	100,00	1 383
51	Открытая площадка, ул. Стебенева, 2 (склад, производственное)	100,00	1 383
52	Открытая площадка, ул. Стебенева, 2 (склад, производственное)	200,00	2 767
53	Открытая площадка, ул. Стебенева, 2 (склад, производственное)	200,00	2 767
54	Открытая площадка, ул. Стебенева, 2 (склад, производственное)	300,00	4 150
55	Помещение, ул. Андреевская, 28 (непроизводственное — офис, смешанные, без юрадреса)	34,10	472
56	Помещение, ул. К. Либкнехта, 43 (склад, производственное)	202,50	2 801
57	Помещение, ул. К. Либкнехта, 43 (непроизводственное — офис, без юрадреса)	15,02	208
58	Помещение, ул. К. Либкнехта, 43 (склад, производственное)	199,30	2 757
	УП «УДМСиБ Мингорисполкома» тел. 203-13-73		
59	Помещение, ул. Короля, 9, ком.136 (1 этаж, непроизводственное — офис)	21,30	295
60	Помещение, ул. Короля, 9, ком.230 (2 этаж, непроизводственное — офис)	40,24	557
	КУП «Управление коммунального хозяйства Мингорисполкома» тел. 233-74-31		
61	Помещение, Минский р-н, крематорий	53,40	739
	УП «Минскводоканал» тел. 233-74-31		
62	Помещение, ул. Инженерная, 1 (производственное)	317,00	4 386
63	Помещение, Долгиновский тракт, 56 (производственное по согласованию)	451,00	6 239
	Управление бытового обслуживания Мингорисполкома тел 200-99-90		
64	Помещение, ул. Селицкого, 105 (производств., непроизводственное — офис)	45,37	628
	КУП «БытЭкс» тел. 203-79-66		
65	Помещение, ул. Ташкентская, 7 (3 помещения, торговля швейными изделиями)	44,80	620
66	Помещение, ул. Я. Мавра, 21 «а» (2 помещения, бытовые услуги)	37,30	516
67	2 этаж, пер. Северный, 17 (помещение № 11, производственное, бытовые услуги)	97,90	1 354
68	2 этаж, пер. Северный, 17 (помещение № 9, непроизводственное — офис)	17,10	237
69	2 этаж, пер. Северный, 17 (помещение № 10, непроизводственное — офис)	20,60	285
70	2 этаж, пер. Северный, 17 (помещение № 7, непроизводственное — офис)	18,60	257
71	2 этаж, пер. Северный, 17 (помещение № 8, непроизводственное — офис)	21,10	292
	КУП «Белхимчистка» тел. 204-69-13		
72	2 этаж, пер. Ольшевского, 1 (пом. № 64, непроизводственное — офис, склад)	52,40	725
	КУП «Киновидеопрокат» тел. 227-54-71		
73	Часть фойе, ул. Ташкентская, 9 (кинотеатр «Дружба», под кафе-бар, по согласованию с МЧС и ЦГиЭ)	114,84	1 589
	УП «Спецкоммунавтотранс» тел. 249-55-62		
74	Помещение, ул. Ванеева, 40 (4 этаж, непроизводственное — офис)	28,19	390
	Комитет по здравоохранению УП «Жилздрав» тел. 247-76-92		
75	1 этаж, ул. Шабаны, 16 (непроизводственное — офис)	19,8	274
76	Помещение, ул. Якубовского, 41 (любое по согласованию с ЦГиЭ и МЧС, кроме парикмахерской, ремонта обуви, ритуальных услуг, торговли вещами б/у)	60,34	835
	УЗ «Городская клиническая больница скорой медицинской помощи» тел. 201-90-51		
77	Часть вестибюля, ул. Кижеватова, 58 (автомат горячих напитков)	1,50	249
	КУП «Минсктранс» Филиал «Минский автовокзал» тел. 219-36-59		
78	Место на перроне, пр. Партизанский, 148 (продажа печатной продукции)	9,00	1 494
79	Зал ожидания, ул. Филимонова, 63 (букмекерская деятельность)	7,50	1 245
	Управление образования Администрации Заводского района тел. 296-28-19		
80	Часть вестибюля, ул. Герасименко, 21 (аппарат горячих напитков)	2,00	332
81	Часть вестибюля, ул. Нестерова, 80 (аппарат горячих напитков)	2,00	332
	Минский государственный дворец детей и молодежи тел. 233-70-29, 233-63-31		
82	Место на левом балконе главного корпуса, Старовиленский тракт, 41 (под аппарат для изготовления мягкого мороженого)	4,00	664
	«Белорусский союз театральных деятелей» тел. 290-61-10		
83	Подвал, ул. Красная, 22 (требуется ремонт)	65,00	899
	«Белорусский Государственный театр кукол» тел. 206-66-42		
84	Помещение, ул. Энгельса, 20 (буфет по согласованию с балансодержателем)	98,70	4 096
	«Белорусский Республиканский театр юного зрителя» тел. 227-68-46		
85	Помещение, ул. Энгельса, 26 (под буфет)	29,36	2 437
	УП «Механизированная уборка города» тел. 207-20-80		
86	3 этаж, 2-й Прилукский переулок, 8 (непроизводственное — офис)	25,50	353
	УП «Зеленстрой Октябрьского района г. Минска» тел. 222-77-30		
87	Помещение, ул. Казинца, 24 (непроизводственное — офис)	77,60	1 074
	УП «Минский городской центр недвижимости» тел. 227-46-39		
88	Помещение, ул. Замковая, 28 (3-й этаж, ком. 17, непроизводственное — офис)	14,40	199

Участник аукциона до начала его проведения должен выяснить у балансодержателя возможность использования помещения под планируемые виды деятельности, в том числе с учетом требований по санитарным и противопожарным нормам. Для участия в аукционе участник перечисляет задаток в размере 10 процентов от начальной цены лота и плату за участие в аукционе в размере 4 базовых величин на р/с 3012024570010 в филиале ОАО «Белпромстройбанк» по Минской области, код 153001331, УНП 190398583 УП «Минский городской центр недвижимости», представляет нотариально заверенную копию свидетельства о регистрации юридического лица или индивидуального предпринимателя. Порядок подачи документов определен условиями проведения аукциона. Условия и сроки оплаты за объект устанавливаются протоколом о результатах аукциона. Договор аренды с победителем аукциона заключается в установленном порядке в 30-дневный срок с даты принятия решения Мингорисполкома.

Аукцион состоится **31 января 2007 года в 14.30** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Документы на участие в аукционе принимаются **по 30 января 2007 года до 17.00** по адресу: г.Минск, ул. К.Маркса, 39, каб.6. **Контактные телефоны: 227-40-22, 227-48-36. Наш сайт в Интернете www.mgcn.by.**

ПРАВА НА ДАПАМОГУ

У 1989 годзе я выйшла замуж, праз год у нас нарадзілася дачка. У час знаходжання ў шлюбе я захварэла на рассеяны склероз і ў 1992 годзе атрымала I групу інваліднасці. У 1993 годзе шлюб быў скасаваны, а праз некаторы час былы муж, які не плаціў рэгулярна аліменты на дачку, у судовым парадку быў пазбаўлены бацькоўскіх правоў. Дачка атрымлівае дзяржаўную дапамогу, а я — невялікую пенсію па інваліднасці. Хутка дачка закончыць школу і патрэбна будзе вучыцца далей, а гэта патрабуе фінансавых сродкаў. Ці магу я зараз патрабаваць ад былога мужа грашовую дапамогу або аліменты для сябе ці дачкі і якім чынам гэта правільна зрабіць?

Н.Ф., Брэсцкая вобласць.

Кодэксам Рэспублікі Беларусь аб шлюбе і сям'і ўстаноўлена, што муж і жонка абавязаны матэрыяльна падтрымліваць адно аднаго. Права непрацаздольнай жонкі, якая мае патрэбу ў матэрыяльнай дапамозе, на атрыманне такой дапамогі ад мужа, які валодае неабходнымі для гэтага сродкамі, згодна з артыкулам 30 Кодэкса захоўваецца і пасля скасавання шлюбу, калі яна стала непрацаздольнай да скасавання шлюбу або на працягу аднаго года пасля яго скасавання. Такое ж права мае і муж, калі трапіць у падобнае становішча.

Такім чынам, паколькі вы сталі непрацаздольнай да скасавання шлюбу, то незалежна ад таго, колькі часу прайшло пасля гэтага, вы можаце патрабаваць ад былога мужа матэрыяльную падтрымку пры ўмове, што вы маеце ў ёй патрэбу, а былы муж мае магчымасць яе аказваць. Пры недасягненні паміж вамі згоды па дапамогу па гэтаму пытанню патрэбна звяртацца ў суд, які вызначыць сваім рашэннем памер сродкаў на ваша ўтрыманне пры наяўнасці падстаў для іх спагнання з былога мужа, выходзячы з матэрыяльнага і сямейнага становішча абодвух бакоў.

Суду прадастаўлена права вызваліць мужа (жонку) ад абавязку па ўтрыманню непрацаздольнай жонкі (мужа) або абмежаваць гэты абавязак пэўным тэрмінам згодна з артыкулам 32 Кодэкса ў выпадках, напрыклад, амаральных, ганебных паводзінаў таго, хто патрабуе выплаты дапамогі, або непрацяглаці тэрміну іх шлюбу.

Права жонкі або мужа на атрыманне матэрыяльнай дапамогі ад другой палавіны страчваецца, калі адпалі падставы для яе назначэння (напрыклад, была знята інваліднасць, матэрыяльнае становішча выправілася за кошт іншых крыніц, або той, хто плаціў сродкі на ўтрыманне, сам трапіў у цяжкае матэрыяльнае становішча), а таксама калі разведзеная жонка (муж), якая атрымлівала сродкі на ўтрыманне, уступіла ў новы шлюб.

Артыкулам 82 Кодэкса РБ аб шлюбе і сям'і ўстаноўлена, што бацькі, якія пазбаўлены бацькоўскіх правоў, страчваюць усе правы, што заснаваны на факце сваяцтва з дзіцем, у адносінах да якога яны былі пазбаўлены бацькоўскіх правоў, у тым ліку і права на атрыманне дапамогі ад яго, права на пенсійнае забеспячэнне пасля смерці дзіцяці і права спадчыннасці па закону. Аднак, як устаноўлена часткай трэцяй гэтага артыкула, пазбаўленне бацькоўскіх правоў не вызваляе бацькоў ад абавязкаў па ўтрыманню дзяцей. Што разумеецца пад абавязкамі бацькоў па ўтрыманню дзяцей, растлумачвае артыкул 91 Кодэкса РБ аб шлюбе і сям'і.

Згодна з гэтым артыкулам, бацькі абавязаны ўтрымліваць сваіх непаўналетніх і маючых патрэбу ў дапамозе непрацаздольных паўналетніх дзяцей. Гэта значыць, што паўналетнія дзеці могуць разлічваць на атрыманне дапамогі ад бацькоў толькі ў выпадку сваёй непрацаздольнасці. Неабходнасць працягваць вучобу да такіх выпадкаў не адносіцца.

У выпадку, калі бацькі ўхіляюцца ад абавязкаў па ўтрыманню сваіх непаўналетніх дзяцей, сродкі на гэта спаганяюцца з іх у судовым парадку. Паколькі судовае рашэнне аб спагнанні аліментаў на дачку ў вас, напэўна, ёсць, толькі былы муж дрэнна яго выконваў, за што і быў пазбаўлены бацькоўскіх правоў, то такуль дачцэ не споўнілася васемнаццаць гадоў, вам патрэбна звярнуцца да судовага выканаўцы.

5 19

Простыя рэчы

МАЛАТОК

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Удным са сваіх расказаў пра простыя рэчы («Серп») прызнаўся, што не ведаю, які лёс некалі славутай скульптуры «Рабочы і Калгасніца», якая стаяла каля ВДНГ СССР у Маскве. І вось атрымаў ліст Анатоля Міхайлавіча Недзена з вёскі Анопаль на Міншчыне. Ён успомніў, што ў свой час, яшчэ пры прэзідэнце Ельцыне, вучоныя абследавалі скульптуру і прызналі яе аварыйны стан. Яе знялі на рэстаўрацыю на тры гады, яшчэ ішла спрэчка, дзе скульптуру ставіць зноў. Але цяпер, відаць, у Расіі не да гэтай скульптуры.

Ды не гэта галоўнае. Я ў скульптуры вызначыў серп. А вось аўтар ліста, Анатоль Міхайлавіч — молат. Таксама простая рэч, але ў яго яна звязана з хвалюючымі ўспамінамі. Вось што ён піша:

«У мяне дома маецца таксама простая рэч — малаток. Бацькаў малаток. Не ведаю, колькі яму гадоў, мо, семдзесят, мо, болей. Часта я бяру яго за каротkую, разбітую ручку і, гледзячы на склёпаны носік і шляпку малатка, адчуваю цяпло бацькавай далоні, думаю: колькі кос перакляпаў бацька гэтым малатком, колькі лугавых траў перакасіў тымі косамі. Колькі цвікоў забіў той малаток. А пасля вайны якія там цвікі былі — з нямецкага калючага дроту, самаробныя. Малаток разбіты з двух канцоў — у залежнасці ад таго, на якой бабцы кляпалася каса, на «нямецкай» ці «рускай». Памятаю: апоўдзень, стаіць бацька дзе-небудзь у цяньку і адбівае касу. А я стаю побач, назіраю за гэтай цікавай справай... Сёння ў мяне для гэтай справы ёсць тры малаткі: мяккі, сталёвы і загартаваны. Але бацькаў, хоць таго няма ўжо сорак шэсць гадоў, захоўваю як самую каштоўную рэліквію. Перадам яго ўнуку на памяць аб прадзеду».

І сапраўды, чаму б не пагаварыць пра малаток.

Дарэчы, у беларускай мове некалі існавалі і іншыя назвы гэтага простага інструмента — кляпач, клімач, капсцень. Металічную частку называлі малатовінай, а ручку — малатавілай.

Спецыяльна паглядзеў: а колькі малаткоў дасталося мне ў спадчыну ад бацькі?

У былой яго майстэрні на варштаце, які зусім рэдка выкарыстоўваю, налічыў з пяць, у тазіку ліку і кавалдачку, і драўляны — сталярскі. І пра цвікі з дроту. Бацькі пераехалі з вёскі ў Паставы ў 1953-м. Майго Дзмітрыя Сямёнавіча, як узялі на фронт у 1944-м, так і прыйшоў ён дадому толькі ў 1950-м, шмат тады даводзілася служыць салдатам. Так што заспеў ён ужо родную вёску калгаснай, падаўся ў райцэнтр. Бацька пайшоў па сваёй сталярскай справе. А маці сядзела ў хаце сваякоў і таксама з калючага дроту (шмат яго засталося пасля вайны) рабіла цвікі. Бацька прыладзіў нейкае зубіла, і яна малатком насякала з гэтага дроту, адкідваючы калючкі, роўныя адрэзкі металу. Потым гэтыя загатоўкі здаваліся ў цэх.

Малаток спатрэбіўся чалавеку, відаць, адразу пасля таго, як пачаў ён выкарыстоўваць прасцейшыя прылады працы ў глыбокай старажытнасці. Для патрэб мірных, але таксама і для абароны і наступлення. У Беларускай Савецкай Энцыклапедыі 1969 года выдання змешчаны фотаздымак археалагічнай знаходкі, якая датуецца 25—20 тысячагоддзямі да нашай эры. Гэта малаток з рога аленя. На працягу доўгіх стагоддзяў, асабліва ў сярэднявечны, молат, у розных яго выявах, быў грознай зброяй. Здаецца, толькі спаборніцтвы па кіданню молата і застаюцца напамінкам пра гэта.

Але ўсё ж такі молат, малаток — найперш прылада працы. Калі гэта сапраўды молат, да таго ж у кузні — то праца вельмі цяжкая, памахаць такой кувалдай на працягу дня не кожны зможа. Калі ж да працы прызвычайваешся з ранніх гадоў — абавязкова быць табе асілкам. Прывяду толькі два прыклады. Каваль Вакула з гогалеўскіх «Вечароў на хутары бліз Дзіканькі» мог несці за сваімі плячыма вялізныя мяхі. А я ў свой час сябраваў з Фёдарам Панцялеевым, маёрам Савецкай Арміі, данскім казаком. Не вельмі і выглядны, ён быў чэмпіёнам па боксу сярод спартсменаў тагачаснага блока сацыялістычных краін, які называўся Варшаўскім дагаворам. І на маё пытанне, адкуль сіла, адказаў проста: «А ты б ад пятнаццаці да васемнаццаці гадоў адмахаў бы ў кузні кувалдай — паглядзелі, які б і ты быў».

Думаю, няма таго мужчыны, які б не трымаў у руках малаток. Хоць бы для самай звычайнай справы — цвік забіць. І, відаць, столькі ж мужчын ведаюць, як гэта бывае балюча і крыўдна, калі трапляе гэтая самая простая рэч па пальцы. Простая прылада, але...

Самыя першыя працоўныя заробкі, ужо амаль афіцыйныя, у мяне і маіх сябрукоў прыпадаюць на лета пасля шостага класа. Тады старэйшыя хлопцы з нашай вуліцы заахвоцілі і нас ісці працаваць на тарную базу. Задача наша заключалася ў тым, што з тарных дошчачак мы павінны былі збіваць самыя звычайныя скрыні для розных відаў прадукцыі. Дошчачкі былі не сухімі і роўнымі, цвікі ўжо, зразумела, не самаробныя, а заводскай вытворчасці. Скрыні трэба было аблямоўваць яшчэ і жасцянкамі. Малаткі — ад прадпрыемства, ці, як тады яшчэ казалі, арцелі. Лета. Над галавою страха, ветрык прадувае памяшканне без сцен. Цюкай сабе і цюкай малатком. Але адно — калі ты нешта збіваеш пад бацькавым застрэшкам. Іншае — калі ты гэтым самым цюканнем зарабляеш капейку. А старэйшыя хлопцы паказваюць зайздроснае ўменне, зарабляюць да рубля ў дзень. А нам жа таксама хочацца дапяць да іх. Вось тады і сінелі пазногці ад няўмелых і паспешлівых удараў малатком. Вось тады і выспявала яшчэ падсвядомае: хлеб дарма не даецца. Часам мы і спяшаліся, часам бракавалі. Як цяпер помню, прыёмшчык нашай работы, украінец па паходжанню, падымаў і разглядаў кожную збітую скрыню, аглядаў яе з усіх бакоў і ўсё прамаўляў: «Ці то скрыня коса, ці то я косы...»

Вы калі-небудзь бачылі, як муруе сцяну сапраўдны майстар? Гэта паэзія. У яго руках кельня і цагліна. Чарпне раствору, мазане, пакладзе цагліну, прыстукне, правядзе швы — роўненька, як ніткай наважана. А трэба палову цагліны — бярэ цэлую, у другую руку мулярскі малаток: шчоўк — і роўна два паўцагелачкі атрымліваюцца. Вось гэта спрыт. Не навучыліся такому? Я таксама. А як ладна, абыходліва і ў той жа час рупліва карыстаецца сваім малаткам, напрыклад, шавец.

Не хочацца чамусьці прыводзіць прыклады з паэзіі. Пра той жа «сярпасты-малаткасты», які дастаецца з шырокіх штанін. Ці пра той молат, ад якога кожны з нас «стаў як волат». Мяркуючы па прыведзенаму вышэй лісту, чытач сам успомніць і іншае ўпамінанне гэтай простай рэчы і ў паэзіі, і ў прозе.

А ёсць жа яшчэ малаточкі — ударныя для цымбалаў, вельмі распаўсюджаных на маёй роднай Пастаўшчыне. Як расказвае Анатоль Собаль, кіраўнік народнага ансамбля «Паазер'е», вырабляюць іх з клёну, дубу, нават бярозы, іншых парод дрэў. Тут патрэбен вельмі тонкі падыход, выбар часу, калі сок бруіць альбо не бруіць у дрэвах. Але дрэва для аўтэнтычных цымбалаў, менавіта тых, якімі славіцца Пастаўшчына, павінна быць цвёрдым.

Але ж ёсць яшчэ і «Малаточкі» — традыцыйны танец. Неяк давялося яго пабачыць у выкананні самадзейных артыстаў. Жвавы тэмп. Выканаўцы моцна ўдаралі нагамі аб падлогу — калектыўная праца, нейкая талака.

У часы майго юнацтва пра хлопца, які быў выбітным, адметным, казалі на тагачасным маладзёжным жаргоне — малаток. Цяпер, зразумела, у моладзі іншы жаргон. І гэта справядліва.

А вось на заканчэнне, у рэальнасцях нашага часу, жадаю, каб ні ў кога з чытачоў не надарылася, што ўсё пайшло «з малатка».

Алесь КАСЦЕНЬ.

Віцебская вобласць.

ЖЫВАЯ ВАДА КРЫНІЦ

Калі гады
пастануць у рады
І прыйдзе час
шляхамі наталіцца —
Я папрашу
асвечанай вады
У незамерзлай
студзеньскай крыніцы.

Вадою гэтай
пояць карані
Нязможаныя кроны
у аблоках,
Яна бруіць
з маёй святой зямлі,
Дзе спіць мінулае
ў радзінных валатоўках.

Няхай гады
плятуць сваё сіло,
Каб толькі
у дарозе не стаміцца —
У прыгаршчах
Вадохрышча святло
І глыб стагоддзяў
у глыбі крыніцы.

У вёсках Ставы, Агароднікі Камянецкага раёна жыве такая легенда: стомленыя жнеі пакутавалі ад смагі. Стаяла нясцерпная гарачыня, знясіленыя сялянкі працягвалі рукі да неба ў сваіх малітвах. І раптам паявілася перад імі жанчына, сказала: дык вось жа цячэ крынічка. Пасля гэтага ўсе сапраўды ўбачылі крынічку, а жанчыны тым часам і след прастыў. Потым у ваколіцы знайшлі камень з нейкімі адбіткамі, якія аддалена нагадваюць сляды ног. Некаторыя мясцовыя жыхары лічаць каменны малюнак слядамі ступні Божай Маці. Настаяцель Стаўскай царквы айцец Васіль прыроду каменя камentаваць адмаўляецца, а вось пра крынічку расказвае ахвотна. Яна была тут заўсёды, яе памятаюць самыя старэйшыя вяскоўцы, бацькі якіх яшчэ «за польскім часам» бралі ў полі найчысцейшую ваду.

Але ў пасляваенныя гады пра крынічку паступова сталі забывацца. Сцежкі да яе зараслі. Любы з рэдкіх у гэтых мясцінах экскурсантаў больш цікавіўся абарончымі збудаваннямі часоў Вялікай Айчыннай вайны, якіх тутэйшая зямля захавала многа. Ад Ставаў, Агароднікаў, Вельямінавічаў да дзяржаўнай граніцы з Польшчай усяго некалькі кіламетраў. У 1941-м уздоўж мяжы вяліся вельмі жорсткія баі. А ў час святкавання 60-годдзя Перамогі сюды завітала група ветэранаў-пагранічнікаў краіны, для якіх наладзілі экскурсію па месцах былых баёў. І хто б мог падумаць, што тая сустрэча стане пачаткам новага жыцця крынічкі? Але нічога выпадковага не бывае, — лічыць айцец Васіль.

Нехта з былых франтавікоў успомніў, як маленькі кволы фантанчык з зямлі ратаваў ад смагі салдатаў. Вяскоўцы, да вялікага задавальнення госця, паказалі тую крынічку. Доўга стаяў ветэран каля ручайка, што сцякаў з прыгорка, успамінаў.

А святар Васіль Бялюк цвёрда вырашыў падняць грамаду на добраўпарадкаванне крыніцы. У гэтым імкненні бацюшку падтрымалі старшыня Волчынскага сельскага Савета Іван Каравай, дырэктар СВК «Ставы» Канстанцін Якубовіч. Знайшліся добраахвотнікі сярод жыхароў вёсак, якія дапамагалі. Работа ішла ўсё лета. І 9 кастрычніка 2005 года па бласлаўленню епіскапа Брэсцкага і Кобрынскага Іаана айцец Васіль асвяціў крыніцу ў імя святога архістраціга Міхаіла.

Зараз там узведзены ўсе неабходныя пабудовы, абсталявана купель, выкладзена дарожка. Крыніца б'е ў цікавым, незвычайным месцы. Каб трапіць да яе, трэба збочыць з дарогі і прайсці метраў дзвесце па крутым спуску ў нізіну. А ўнізе — пагорачак нібы невялікі курган, з якога і выкліньваецца струменьчык вады. Пры добраўпарадкаванні да яго паставіліся вельмі беражліва, каб не зачапіць экасістэму вадаёма. Тут не трэба чэрпаць ваду кубкамі з імправізаванага калодзежа, як гэта зроблена на многіх іншых падобных аб'ектах. Дастаткова падставіць свой посуд, і вада нальецца ў яго сама зверху. А чысціню вады, яе гаючы састаў пацвердзілі даследаванні, якія правялі вучоныя Брэсцкага дзяржаўнага ўніверсітэта па дамоўленасці з абласным камітэтам прыродных рэсурсаў. Па ваду сюды едуць з навакольных вёсак, з Камянца, Брэста. Сакратар Волчынскага сельскага Савета Святлана Кунц сказала, што пастаянна бярэ ваду для піцця і гатавання ежы.

— Нашу ваду трэба пакаштаваць, пра асалоду ад яе не раскажаш словамі, — гаворыць айцец Васіль. — Лепш за ўсё прыехаць сюды вясною, летам, калі навокал заліваюцца салаўі, напіцца халоднай празрыстай вады, — лепшага лякарства для душы вы наўрад ці знойдзеце.

Аказалася, што ўсю сёлетнюю зіму не прастойвае і купальня. Летась знаходзіліся смельчакі толькі на свята Вадохрышча. А цяпер ледзь не штодзень прыязджаюць добраахвотнікі, каб акунуцца ў крынічную ваду. Жыхарка Ставаў Галіна Пацыкайлік расказала, што людзі купаюцца і ніколі яна не чула, каб хто захварэў пасля гэтага.

Легендамі, павер'ямі напоўнена гісторыя крыніцы вёскі Охава Пінскага раёна. Там крыніца поіць сваёй вадой мясцовы люд многія дзесяцігоддзі. Яе заўсёды падтрымлівалі ў належным стане. Набыла папулярнасць крынічка каля вёскі Вяжное на мяжы Камянецкага і Пружанскага раёнаў. Непадалёк нават будзе ўзводзіцца жаночы манастыр. А маленькія вадаёмы паблізу вёсак Ясенец, Тартакі, Трацэвічы, Рудашы Баранавіцкага раёна аб'яўлены геалагічнымі помнікамі прыроды. Як расказала карэспандэнту «Звязды» галоўны спецыяліст абласнога камітэта прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Алена Пратасевіч, усяго на тэрыторыі Брэстчыны выяўлена крыху больш за сто крыніц. Размяшчаюцца яны вельмі нераўнамерна: у Баранавіцкім раёне іх знойдзена 37, у Камянецкім —16, у Пінскім —11, у Лунінецкім — 3. А вось у Ганцавіцкім, Жабінкаўскім, Маларыцкім раёнах не было заўважана ніводнай. Навукоўцы звязваюць гэта з правядзеннем шырокамаштабнай меліярацыі зямель.

Камітэт прыродных рэсурсаў узначальвае і кардынае работу па ахове ўнікальных прыродных аб'ектаў. Да гэтай работы прыцягнуты вучоныя геаграфічнага факультэта Брэсцкага дзяржаўнага ўніверсітэта. Менавіта навукоўцы праводзяць даследаванне вады і даюць заключэнне аб прыгоднасці яе да піцця. Алена Васільеўна расказала, што ў цэлым шэрагу крыніц Брэсцкай вобласці вада валодае проста выключнымі паказчыкамі па сваёй карыснасці і гаючасці.

— Але пры любым умяшанні чалавека, — дапаўняе калегу галоўны спецыяліст названага камітэта Людміла Шаўкунова, — ёсць небяспека і пагроза. Справа ў тым, што крыніцы — вельмі адчувальныя экасістэмы. Яны могуць існаваць стагоддзямі. Але любога парушэння іх сістэмы або выткоу бывае дастаткова, каб яны зніклі назаўсёды. І такія прыклады, на жаль, ёсць.

Людміла Віктараўна лічыць, што крыніцы могуць крыўдзіцца на людзей, таму і знікаюць. Нават залішняе імкненне добраўпарадкаваць, пабудаваць калодзежы або прыгожыя зрубы вакол струменя часам прыводзіць да таго, што крыніца сыходзіць у зямлю. Не кажучы ўжо пра тое, калі нашы суайчыннікі проста забруджваюць, кідаюць смецце ў жывы выток вады. Такое ў старадаўнасці лічылася вялікім грахом.

І асцярожнасць нават пры навядзенні парадку — традыцыя векавая. Некалі на ўсю ваколіцу быў, як правіла, адзін чалавек, які ведаў, дзе можна капаць калодзеж. Па размяшчэнню лістоў і галінак дрэў і іншых нейкіх аднаму яму вядомых правілах ён і вызначаў месца будучага забору вады. А месца крыніцы вызначыла прырода. І калі хоць на нейкі неадчувальны для вока сантыметр зачэпіць яе рэчышча, эфект можа быць самы нечаканы. Прапала некалькі крыніц апошнім часам у Белавежскай пушчы.

У адносінах да тых, што ёсць і выкарыстоўваюцца людзьмі, вучоныя нярэдка выказваюць перасцярогу. Так, пагаршаецца якасць вады на папулярнай крыніцы Вяжное Камянецкага раёна. Паводле меркавання навукоўцаў, сюды маглі трапіць і змешвацца воды з меліяратыўнага канала, які праходзіць непадалёк. Таму мала выявіць крынічку і яе правільна добраўпарадкаваць, трэба ўвесь час пра яе клапаціцца і кваліфікавана правяраць яе стан.

У нашай краіне гэтыя ўнікальныя водныя аб'екты ахоўваюцца дзяржавай згодна з артыкулам 74 Воднага кодэкса Рэспублікі Беларусь. З іх усё пачынаецца. У прыродзе ўладкавана так, што крыніца дае пачатак нават вялікай рацэ. З крынічкі пачынаюцца рэкі Крывуля, Старышоўка ў Камянецкім раёне, Ясельда — у Пружанскім, Шчара — у Івацэвіцкім раёнах. Большасць нашых азёр без крыніц не былі б азёрамі. Са старадаўніх часоў крыніцы паілі вадой чалавека. Іх вада ў зямных нетрах ачышчаецца і насычаецца хімічнымі элементамі. І хоць цяпер у кожным населеным пункце ёсць цывілізаваныя крыніцы пітной вады, але з 15 «жывых» крыніц у вобласці людзі бяруць ваду.

Святлана ЯСКЕВІЧ.

Свежыя ідэі для роднага горада

Магілёўскі гарвыканкам абвясціў правядзенне турыстычнага конкурсу.

«Гораду патрэбна твая ідэя!» — гэты лозунг мае на мэце захваціць не толькі прафесіяналаў у сферы турызму, але і ўсіх жыхароў Магілёва. У конкурсе можа браць удзел любы, хто пажадае. Колькасць работ не абмежаваная: галоўнае, каб у іх былі новыя, свежыя, яркія ідэі. А таксама і даступны механізм практычнай рэалізацыі гэтай ідэі.

У конкурсе ёсць тры намінацыі. Гэта, па-першае, лепшая ідэя па развіццю турызму, якая б прыцягнула ў Магілёў беларусаў і замежнікаў і падтрымала прывабны для турыстаў імідж абласнога цэнтра. У другой намінацыі ўдзельнікам конкурсу прапануецца даць сваё ўяўленне пра сімвал альбо эмблему Магілёва. Ужо колькі гадоў улады і грамадскае не могуць вызначыцца, які помнік, скульптура, будынак альбо іншая славутасць з'яўляюцца знакавымі для Магілёва. І трэцяя намінацыя — новы турыстычны маршрут, які б меў дачыненне да гісторыі горада, падзей і асоб, якія паўплывалі на ход гісторыі.

Конкурс працягнецца да 20 сакавіка і, паводле яго вынікаў, пераможцы атрымаюць добрыя прызы. Тры галоўныя прэміі — па 35 базавых велічынь і каштоўныя прызы ад спонсараў і рэкламадаўцаў.

Ілона ІВАНОВА.

Чырвоная кніга Беларусі ў электронным варыянце

Сёлета было завершана стварэнне Інтэрнэт-версіі Чырвонай кнігі Беларусі па праекту Глабальнага экалагічнага фонду «Стварэнне ўмоў для ўстойлівага функцыянавання сістэмы ахоўваемых водна-балотных угоддзяў у беларускім Палессі». Над кнігай актыўна працавалі спецыялісты Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя, работнікі інстытутаў заалогіі і батанікі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі і кампанія «МедыуМ».

Электронная версія Чырвонай кнігі Беларусі **(http://www.redbookbel.net)** павінна забяспечыць шырокі доступ да інфармацыі аб відах, якія маюць найбольш высокую рызыку знікнення. Электронны рэсурс разлічаны для біёлагаў, эколагаў, спецыялістаў па ахове навакольнага асяроддзя, землеўпарадкавальнікаў, работнікаў паляўнічых, лясных і сельскіх гаспадарак, выкладчыкаў, студэнтаў, школьнікаў і ўсіх аматараў прыроды.

Інтэрнэт-версія Чырвонай кнігі Беларусі мае два раздзелы: расліны і жывёлы. На старонках рэсурсу можна адшукаць падрабязную інфармацыю пра 477 відаў рэдкіх і знікаючых жывёл і раслін, якая прапаноўваецца разам з фотаздымкамі, малюнкамі і картамі. Для кожнага віду маецца інфармацыя аб распаўсюджванні, біялогіі, колькасці, прычынах змянення колькасці і арэала, прынятых і неабходных мерах аховы.

На сайце ёсць пералік зніклых жывёл і раслін, якія зніклі («чорны спіс»), і спісы жывёл і раслін, якія патрабуюць прафілактычнай аховы. Вызначаны рэсурс не мае аналагаў па аб'ёмах і актуальнасці інфармацыі, зручнасці карыстання і практычнай каштоўнасці на ўсёй прасторы СНД, дзе больш ніхто не распрацаваў электронныя версіі Чырвоных кніг. Беларусь стала першай краінай, у якой вырашылі выкарыстоўваць інавацыйныя сродкі Інтэрнэту для павышэння экалагічнай культуры насельніцтва.

Сяргей КУРКАЧ.

ГЕРБЫ ГАРАДОЎ БЕЛАРУСІ

22 студзеня 2007 года Міністэрства сувязі і інфарматызацыі Рэспублікі Беларусь уводзіць у паштовае абарачэнне дзве маркі з серыі «Гербы гарадоў Беларусі», падрыхтаваныя выдавецкім цэнтрам «Марка» РУП «Белпошта».

Мастак Алег Гайко. Тыраж па 75,0 тыс. На марках прыменены элементы абароны.

У дзень выхаду марак у абарачэнне ў аддзяленні паштовай сувязі № 1 г.п. Круглае (Магілёўская вобл.) і аддзяленні паштовай сувязі № 16 г. Пінска (Брэсцкая вобл.) будзе праводзіцца спецыяльнае памятнае гашэнне на канвертах «Першы дзень».

Мастак спецштэмпеляў і канвертаў «Першы дзень» А. Гайко.

Іх шанавалі продкі

ЖЫЖАЛЬ

(Працяг. Пачатак у нумарах за 13, 16, 17, 18 студзеня.)

— Не чапай, сынок, там Жыжа, — просіць мама сваё дзіцятка.

Немаўля няўцямна пазірае на агонь і не разумее, дзе там Жыжа? Там жа адно вясёлыя вугалькі свецяцца, падміргваюць трапяткім полымем, дакрануцца да іх запрашаюць. Ды будзь асцярожны: акурат прывабныя светлячкі і пагражаюць небяспекай. Гэта нядрэмны Жыжаль ахоўвае сваё жытло.

Не ведае яшчэ хлапчаня, што Жыжа, Жыж альбо Жыжаль — гэта даўні бог агню, якога шанавалі нашы далёкія продкі. Акрамя таго, Жыжаль быў богам кавальскай справы. Гэта ён выкаваў залатую каляску для Сонца, а сярэбраную — для Месяца. Гэта ён пастаянна папаўняе баявы арсенал бога грому Перуна: куе яму вогненныя стрэлы. Ці не таму з павагай і шанаваннем ставіліся да кавалёў, якімі апекаваўся Жыжаль? А кузня ягоная заўсёды з непагасным агнём. Днём — сонца свеціць, ноччу — месяц, а іскры зоркамі мігцяць з высокага неба.

З даўняга-прадаўняга часу з пакалення ў пакаленне перадаюцца легенды і памяць пра гэтага «цёплага» Бога. Жыве ён глыбока пад зямлёй. Калі ціхенька ходзіць па сваім падземным царстве, тады сагравае зямлю. А калі пачне спяшацца ды бегаць, выбухаюць сапраўдныя пажары. Ажно на паверхню зямлі вырываецца полымя. Гараць лясы і нівы, загараюцца нават тарфяныя балоты, дзе пахаваліся чэрці і нячысцікі. Такім чынам бог агню Жыжаль дапамагаў Перуну-грамавержцу змагацца са злымі памочнікамі Чарнабога. Тады не мог уратавацца нават бязвокі таўстун Багнік, якога не бралі вогненныя Перуновы стрэлы, ад агню і сухменю ён курчыўся і канаў на дне свайго багністага жытла.

І калі ўнадзіцца Жыжаль, пакуль не супакоіцца, шмат шкоды наробіць людзям пажарамі ды засухай на палях. А як нагуляецца ўволю, калі надакучыць па свеце лётаць, зноў у зямныя глыбіні апусціцца, каб знутры зямлю саграваць. На паверхні ж сёе-тое пра сябе на памяць пакіне. Таму і кажуць, што Жыжаль пасяліўся ў кожнай хаце, спіць да пары да часу ў печы, хаваецца ў грубцы, туліцца на прыпечку. Не баіцца ён і на двары раскінуць свае цеплалюбівыя шаты. Каб сагрэць людзей, ежу ім згатаваць — бо добра яму і ўсцешна разам з усімі.

Не адно стагоддзе жывуць людзі ў згодзе ды насцярозе з агнём. Дзеля ўшанавання бога Жыжаля ладзілі цікавае свята Жаніцьба Пасвета, якое адзначалася ў верасні. Пасвет — гэта самаробны падвясны свяцільнік, які станавіўся галоўным на свяце. Каб не Жыжаль, то іншы бог — бог холаду Зюзя памарозіў бы не адно малых дзетак, а і сталых ды дарослых людзей, выстудзіў бы іхняе жыллё. Але не дапускае да гэтага Жыжаль, бо з кім жа ён тады застанецца? Так дагэтуль барукаецца бог цяпла Жыжаль з богам холаду Зюзяй. Ніхто нікому не паддаецца, ніхто перамогу не святкуе. Толькі на вясну ды лета выпраўляецца Зюзя ў свае халодныя краіны, каб там сілы набрацца, а марознай зімой разам з мяцеліцамі ды завірухамі, якія набываюць воўчае аблічча, назад вярнуцца.

А вось Жыжалю ніколі няма спачыну — днём і ноччу шчыруе ахоўнік жыцця, не спіць ні зімой, ні летам. Ведае, што калі засне, то Зюзя пераможа яго, і запануюць тады на свеце холад ды смерць. Без цяпла, вядомая рэч, нішто жывое жыць не можа. А дзе цяпло — там радасць ды згода. Таму трэба шанаваць Жыжаля, паважаць не адно ягоную старасць, а і моц ды магутнасць. Тады стане ён добрым і спагадлівым, пакорным і цярплівым.

Шмат казак, песень, легенд, прыказак, замоў, выслоўяў, загадак склалі людзі пра агонь, пра Жыжу і Жыжаля. Лічылася, што агонь валодае чароўнай сілай. Ці не таму купальскай ноччу не адно палілі вогнішчы, але і скакалі праз ачышчальны агонь? Каб падчас навальніцы гром з маланкай не нарабілі шкоды, у хаце запальвалі вясельную або грамнічную свечку. «Жывы» агонь — агонь, здабыты трэннем дрэва аб дрэва — лечыць хворых, выганяе з хаты нячыстую сілу, цемру і холад. Таму вялікім грахом было пляваць у агонь, бо засярдуе Жыжаль і пакарае. Хто гэта зробіць, у таго губы папухнуць, альбо вогнік нападзе — хвароба такая. Нельга было кідаць у агонь нічога дрэннага, нячыстага, бо гэта знявага бога агню, і таму на целе з'явяцца балячкі. Няможна было заліваць агонь вадой.

Некалі нашы продкі ашчадна зберагалі агонь на язычніцкіх капішчах у запаветных гаях і дубровах — так у славян называліся дахрысціянскія святыні. Каля яго ачышчаліся ад благога і нядобрага, з ім дзяліліся сваімі пажаданнямі, надзеямі ды спадзяваннямі. Туды быў забаронены ўваход не адно чужынцам, а людзям без веры, без спагады, без душы. Гэты незгасальны агонь называлі Знічам, ён стаў своеасаблівым поклічным сімвалам беларусаў, які вёў за сабой. Вабна і прыветна свяціўся ён для змагароў за волю і шчасце народа.

Сёння ва ўсіх нашых храмах, пад абразамі на покуці многіх дамоў гарыць свечачка альбо лампадка — свяшчэнны агонь нашай веры, сведка неўміручасці жыцця і заклік берагчы і шанаваць жыццё, як найвышэйшы божы дар. Згарае свечачка, а цяпло яе ўзносіцца да неба, дзе пануе магутны Пярун — першаствараль нік агню.

Ласкавы агонь заўсёды дадаваў чалавеку радасці, добрага настрою, святочнасці. Нездарма так нязводна вабяць да сябе купальскае вогнішча, турысцкі касцёр, пастухоў цяпельца, прыветны агеньчык у начным акне. Нездарма царква яшчэ больш прасвятляецца і становіцца ўрачыстай ад трапяткіх агеньчыкаў свечак. А людская радасць, выкліканая агнём, дагэтуль жыве ў каляровых ілюмінацыях, квяцістых феерверках, маляўнічых салютах.

Анатоль БУТЭВІЧ.

ПАЗВАНІЦЬ КАХАНАЙ У ЛОНДАН... ЗА ЧУЖЫ КОШТ

Летась адзін брастаўчанін вымушаны быў заплаціць прадпрыемству электрасувязі два з паловай мільёны рублёў за пірацкія званкі.

У пастку да Інтэрнэт-хуліганаў трапіў яго сын, які занадта захапляўся гульнямі ды «дарослымі» сайтамі. А за другое паўгоддзе мінулага года ў Брэсцкі філіял РУП «Белтэлекам» звярнуліся з пісьмовымі скаргамі 12 ахвяраў тэлефоннага пірацтва. Часцей за ўсё зламыснікі за кошт брэсцкіх карыстальнікаў Інтэрнэта званілі ў Вялікабрытанію, былі таксама стасункі з Італіяй, Нідэрландамі, афрыканскімі краінамі. Але, паводле меркавання сувязістаў, лічба 12 адлюстроўвае хіба толькі адзін ці некалькі працэнтаў пацярпелых ад хітрай праграмы «дазвон». Астатнія, трапіўшы ў сеткі злачыннага элемента сусветнага павуціння, добрасумленна аплачваюць чужыя рахункі.

Пра гэта расказалі кіраўнікі і спецыялісты Брэсцкага філіяла «Белтэлекам» на чарговай прэс-канферэнцыі і заклікалі ўсіх сваіх кліентаў быць асабліва пільнымі. На любым з прадпрыемстваў «Белтэлекама» ёсць падрабязныя інструкцыі наконт таго, як захаваць бяспеку свайго камп'ютара і як устанавіць, што да цябе завітаў няпрошаны госць. І перш за ўсё трэба зарэгістраваць свой мадэм. Працэдура гэта вельмі танная: заплаціць давядзецца не больш за дзве тысячы рублёў, але ж пакет дакументаў, які атрымаеш, можа засцерагчы ад значна большых трат. Цікавым назіраннем падзяліўся галоўны інжынер філіяла Міхаіл Кавалеўскі. Найчасцей на «кручок» да зламыснікаў трапляюць наведвальнікі сайтаў, якія прапануюць знаёмствы, парады інтымнага характару, парнаграфічныя карцінкі.

Святлана ЯСКЕВІЧ.

Чэмпіёны не шкадуюць медалёў, а школьнікі — часу на наведванне музея

Днямі калекцыя музея алімпійскай славы (з'явіўся ў Мінску 6 ліпеня 2006 года) папоўнілася новымі экспанатамі.

Сваю спартыўную экіпіроўку з выявай талісмана Гульняў у Сеуле-1988, серыю марак, два алімпійскія праспекты з сімвалічнымі адбіткамі талісмана Алімпіяды ў Сеуле ў спартыўную скарбніцу перадаў Аляксандр Раманькоў, алімпійскі чэмпіён, уладальнік двух сярэбраных і бронзавых алімпійскіх медалёў, дзесяціразовы пераможца сусветнага першынства па фехтаванню. Таксама зрабіла падарунак музею і Наталля Шыколенка, двухразовая чэмпіёнка свету і сярэбраны прызёр Алімпіяды ў Барселоне-1992 па кіданню кап'я: без шкадавання яна развіталася з кап'ём, памятнымі медалямі, талісманам Гульняў-1992, хусткай «Атланта-1996», лялькай «Прымадонна», якую спартсменцы прэзентавалі на дзень нараджэння (яно супала са стартам спаборніцтваў).

Першымі, хто пабачыў новыя экспанаты, сталі вучні сталічнай гімназіі № 22 і жодзінскага прафесійнага ліцэя, а таксама прадстаўнікі турыстычнага агенцтва «Барысаўрэгіёнтур». Гэта былі не выпадковыя наведвальнікі, а спецыяльныя госці: справа ў тым, што менавіта вышэй узгаданыя асобы часцей за ўсё заглядваюць у музей. Вось і вырашылі іх узнагародзіць за такую вялікую пашану да дасягненняў нашых атлетаў: уручылі падарункі і паказалі новыя экспанаты, арганізавалі сустрэчу вучняў з алімпійскай чэмпіёнкай Сеула па мастацкай гімнастыцы Марынай Лобач. Марына Вікенцьеўна ўзгадала тое імгненне, калі стаяла на п'едэстале: «Думаеш аб сваёй краіне, родных і людзях, якія дапамагалі стаць чэмпіёнкай. Зараз мая дачка займаецца лёгкай атлетыкай, хацелася б, каб і яна дасягнула поспеху».

Дзесяцігадовыя школьнікі з цікавасцю глядзелі на чэмпіёнку, уважліва разглядалі ўзнагароды, факелы, экіпіроўку. «Калі вы актыўна будзеце займацца спортам, то паспееце выступіць на Алімпіядзе-2016, — заўважыў прэс-аташэ Нацыянальнага алімпійскага камітэта Пётр Рабухін. — Калі заваюеце медалі, падарыце музею?» —«Канешне», — пагадзіўся адзін з гімназістаў і вельмі сур'ёзна дадаў: «Я ўжо два гады займаюся рукапашным боем».

Ірына ПРЫМАК.

ПАНЯДЗЕЛАК, 22 СТУДЗЕНЯ

6.10, 16.50 Серыял «Усё змяшалася ў доме...».
7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 15.00, 19.00, 0.05 Навіны.
7.05, 7.35, 8.10, 8.35 «Добрай раніцы, Беларусь!».
7.30, 8.30, 11.50 «Дзелавое жыццё».
9.05 Серыял «Прымадонна».
10.00 «Панарама тыдня».
11.20 «Існасць».
12.10 Меладрама «Дзікунка».
13.55 «Сузор'е надзей».
14.30 «Вакол планеты».
15.15, 19.10 Навіны рэгіёна.
15.30 Мультфільм.
15.55 «Культурныя людзі».
16.25 «Кухня гумару».
17.45 Серыял «Каханне як каханне».
18.50, 0.25 «Зона Х».
19.20 Фінальны гала-канцэрт «Дарога на Еўрабачанне» Нацыянальнага праекта «ЕўраФест». Прамы эфір.
21.00 «Панарама».
21.45 Ч. Карыо ў меладраме «Атлантыда».

Алжыр, 1894 год. У сэрцы пустыні два афіцэры знаходзяць старажытны храм з загадкавымі жыхарамі, якія перакананы, што знаходзяцца ў легендарнай Атлантыдзе, якая не патанула ў віры, а пагрузілася ў пяскі.
23.40 «Час спорту».

7.00, 7.30, 8.00, 8.30, 9.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00. 20.30, 22.55 Нашы навіны.
7.05 «Наша раніца».
9.05 Контуры.
10.05 Брус Уіліс, Морган Фрыман у дэтэктыве «Шчаслівая лічба Слевіна».

Не ў шчаслівы момант пасяліўся Слевін у кватэры сябра. Са з'яўленнем у ёй мафіі ў яго пачынаюцца вялікія праблемы.
12.05 «Малахаў+».
13.00 Нашы навіны.
13.05 Серыял «Сабачая справа».
14.00 «Дэтэктывы».
14.30 «Кантрольная закупка».
15.00 «Лаліта. Без комплексаў».
16.10 Серыял «Тайны Смалвіля».
17.05 «Пахудзець да смерці».
18.15, 21.00. 23.10 Навіны спорту.
18.20 Па-за законам. «Адпетая махлярка».
19.00 «Чакай мяне».
20.00 Час.
21.05 Ток-шоу «Выбар».
21.55 Серыял «Сёстры па крыві».
23.15 «Горад загінулых самалётаў».
0.15 «Аўтаралі Лісабон—Дакар 2007».

7.00 «Ранішняя падзарадка»..
8.00, 17.30 Серыял «Салодкі плод».
9.00, 16.00 Навіны культуры.
9.10 «У гэты дзень».
9.15, 18.30 Серыял «Свой чалавек».
10.10, 19.30 Серыял «Пад Вялікай Мядзведзіцай».
11.05 «Сезон у дачы».
11.30 «Плошча мастацтваў».
12.00 «Тэлебарометр».
12.20 «Класны ўрок».
12.40 «Добрыя навіны».
13.10 «Вас выклікае Спартландыя».
13.45 «Вялікія спакуснікі кіно». Рышар Анконіна.
14.15 Камедыя «Тры жанчыны і мужчына».
16.10 Мультфільм.
16.20 Серыял «Прыгоды Скіпі». 1-я серыя.
16.45 «Анекдот. LAD».
17.00 «Ядзім дома».
20.30 «Калыханка».
20.45 Дак. фільм «Нарадзіўся я літвінам».
21.40 Футбол. Чэмпіянат Англіі. Прэм'ер-ліга. Агляд тура.
22.35 «Хакей. Формула гульні».
23.00 Баявік «Двайная ракіроўка-2».
Пасля забойства кіраўніка Трыяды яго сын, які раней не ўмешваўся ў справы, нечакана заявіў аб намерах стаць на чале арганізацыі.

6.05, 17.20 «Міншчына».
6.15 «З чаго пачынаецца раніца».
7.30 «Тыдзень».
8.45 «Вялікае сненданне».
9.20 «Народжаныя ў СССР».
10.00 «Спартыўны тыдзень».
10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30 «24 гадзіны».
10.40 «З дакладных крыніц».
11.00 «Гадзіна суда: справы сямейныя».
12.00 «Гадзіна суда».
13.00 «Ёсць кантакт».
13.50 «Пяць мінут да метро». Серыял.
14.50 «Дзіцяняты джунгляў». Мультсерыял.
15.35 Чэмпіянат свету па ралі-2007. Монтэ-Карла.
16.50 «Культурнае жыццё».
17.30 «Званая вячэра-2».
18.25 «Пяць мінут да метро». Серыял.
20.05 «СТБ-спорт».
20.20 «Добры вечар, малыш».
20.30 «Добро пожаловаться».
20.50 «Салдаты 7». Серыял.
22.00 «Рэпарцёр СТБ». Домік НЕ ў вёсцы.
22.55 «Студэнты». Серыял.
23.45 «Сталічны футбол».
0.15 Маст. фільм «Герой».

6.00 Зараджайся!
7.30 «Разам».
8.30, 11.30, 14.30, 17.30, 20.30 «Навіны Садружнасці».
8.45, 12.00, 22.30 Студыя 60—90.
9.00, 20.00 Рэспубліка—сёння.
9.30 Серыял «Бушыдо — шлях воіна».
10.30 Дак. серыял «Доказы даўніны»
12.15 Маст. фільм «Месца сустрэчы змяніць нельга».
13.45 Урокі англійскай мовы. 14.00 Дзіцячы сеанс «Экхарт».
15.00 Дак. серыял «Самыя дзіўныя святы свету».
16.00 Серыял «Чалавек мора».
17.00 Дак. серыял «Самыя прыгожыя дамы свету».
18.00 Акцэнты.
18.15 Серыял «Час капаць».
19.15 «Цік-так».
19.30 Кірава, 17.
21.00 Серыял «Экстрадыцыя».
22.00 Акцэнты+.
22.45 Маст. фільм «Месца сустрэчы змяніць нельга».

7.00—16.30 *Прафілактыка абсталявання па забеспячэнню эфіру.*
16.30 Мультпарад.
16.40 Навіны кіно.
17.00 Серыял «Джыўс і Вустэр».
18.00 Маст. фільм «Зімні вечар у Гаграх».
19.20 «Топ-8».
19.30 «Сад і агарод-плюс».
19.45 Серыял «Паліцыя Паўднёвай акругі».
20.45 «Вечарніца».
21.00 Інфармбюро «Міжнароднае».
21.05, 23.00 «Метэапрагноз».
21.10 Трылер «Дэманы».

7.00 Добрай раніцы, Расія!
9.10 «Сябры не паміраюць».
10.00 Аншлаг і кампанія.
11.00, 14.00, 17.00, 19.00 Весткі.
11.30, 14.20, 17.20, 19.45 Мясцовы час. Весткі—Масква.
11.50 Маст. фільм «Пацаны».
Начальнік летняга спартыўна-працоўнага лагера збярае «цяжкіх» падлеткаў, многія з якіх знаходзіліся на ўліку ў міліцыі. Нялёгка было дастукацца да закрытых сэрцаў гэтых абяздоленых і пакрыўджаных дзяцей, але ён змог стаць для іх сябрам і настаўнікам.
13.20 Гарадок.
13.45, 18.40 Весткі. Дзяжурная часць.
14.40 Драма «Другое жыццё».
16.20 Гарадок.
17.40 Серыял «Асуджаная стаць зоркай».
20.05 «Добрай ночы, малышы!».
20.15 Серыял «Тайны следства-2».
21.15 Серыял «Закон Мерфі».
22.15 Серыял «Погляды».
23.15 «Мой сярэбраны шар. Вольга Пракоф'ева».
0.05 Весткі+.
0.20 «Сумленны дэтэктыў».
0.50 «Сінемманія».

8.00, 8.30, 9.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00, 22.00 Сёння.
8.10, 8.35 Сёння раніцай.
9.30 «Надзвычайнае здарэнне. Агляд за тыдзень».
10.25 «Кулінарны паядынак».
11.20 «Кватэрнае пытанне».
12.10 «Следства вялі...».
13.25 Серыял «Сышчыкі-4».
15.30, 18.30 «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
16.25 Серыял «Жыццё — поле для палявання».
19.45 Серыял «Сталін. Live».
20.50 Серыял «Вуліцы разбітых ліхтароў-6».
22.40 Серыял «Кожны ўздыхе на Галгофу».

5.00 «Настрой».
7.30, 20.15 «Расплата за грахі». Серыял.
8.25 Маст. фільм «Вяртання няма».
10.30, 16.30, 23.20 Пятроўка, 38.
10.45, 13.45, 16.45. Падзеі.
11.00 «Пастскрыптум».
12.05 Момант ісціны.
12.50 Дзелавая Масква.
13.30 Пятроўка, 38.
14.00, 4.15 Мультпарад.
14.30 «Сеанс гіпнозу для Адольфа Гітлера».
15.15 «Рэпарцёр».
15.30 Новая «Часінка».
17.15 «У цэнтры ўвагі». «Выпадкова стаць зоркай».
17.45 «Страсці па-італьянску-2». Серыял.
18.50 «Вальпургіева ноч».
21.10 «Участак». Серыял.
22.20 «У цэнтры ўвагі». «Колеры кахання».
22.55 Падзеі. 25-я гадзіна.
23.40 «Адна справа на дваіх». Серыял
0.35 Маст. фільм «Мярцвяк ідзе».
2.30 «Кардзье — вартавыя парадку» Серыял.

4.00, 10.30, 14.00, 1.15, 2.00 Тэніс. Australian Open.
15.00 Хакей на траве. «Прыз чэмпіёнаў».
16.15 Біятлон. Кубак свету ў Славеніі.
17.15 Фігурнае катанне.
18.45, 0.00 Футбол. Еўрагалы.
19.30 Вось гэта дзіва!!!
20.00 Снукер. Мастэрс. Лондан. Фінал.
22.00 Байцоўскі клуб.
0.45 Аўтаспорт. Журнал чэмпіянату свету ў класе турынг.

ФІЛЬМ ДНЯ

«ТБЦ» 0.35 «МЯРЦВЯК ІДЗЕ» (ЗША, 1995 г.)

Узнагароды: Прэмія «Оскар-2006».

Фільм зняты паводле кнігі манахіні сястры Хелен Прыжан, якую многія асуджалі за дапамогу таму, каго ўсе лічылі пачварай.

Прыгавораны да смерці за забойства зняволены абірае сваёй духоўнай настаўніцай манахіню. Спачатку яна хоча дапамагчы яму пазбегнуць вышэйшай меры пакарання, але, не дабіўшыся гэтага, спрабуе аблегчыць апошнія гадзіны яго жыцця, разбудзіць у ім чалавечнасць і пераканаць пакаяцца.

Рэжысёр — Цім Робінс. **У ролях:** С'юзэн Сэрэндон, Шон Пен, Роберт Проскі, Рэйманд Джэй Бэры.

АЎТОРАК, 23 СТУДЗЕНЯ

6.10, 16.50 Серыял «Усё змяшалася ў доме...».
7.00. 8.00, 9.00, 12.00, 15.00, 19.00, 0.10 Навіны.
7.05, 9.05 Прэс-агляд.
7.10, 7.35, 8.10, 8.35 «Добрай раніцы, Беларусь!».
7.30, 8.30. 11.50 «Дзелавое жыццё».
9.10 Лірычная камедыя «Цешча».
10.25 «КампаС».
10.55, 17.45 Серыял «Каханне як каханне».
12.10 «Час спорту».
12.30 Кінаэпапея «Сібірыяда». 1-я серыя.
13.45 Дак. серыял «Неўміручыя ноты». «Вольфганг Амадэй Моцарт».
14.10 Кінановела «Колер кахання».
14.30 «Раўнавага: асяроддзе пражывання».
15.15, 19.20 Навіны рэгіёна.
15.30 Мультфільм.
15.45, 0.50 Серыял «Джыўс і Вустэр».
18.50, 0.45 «Зона Х».
19.35 «Зямельнае пытанне».
20.00 Серыял «Прымадонна».
21.00 «Панарама».
